№ 22 (332) 13 чэрвеня 2003

www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Крэматорый для Грыгорыя Аляксандравіча

Раман Уладзімера Някляева.

старонкі 14–15

Сувэрэнітэт прададуць за 20 мільярдаў

Нават не даляраў, а рублёў

старонка 5

Што слухаў, што пачуў

Новая рубрыка: у сьвеце музыкі зь Лявонам Вольскім.

старонка 13

Мядзьведзь-забойца

зьявіўся ў Сеньненскім раёне.

старонка 7

Дома і назусім

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Народны пісьменьнік Беларусі не абвяшчаў пра сваё вяртаньне. Але вестка, што Быкаў у Менску, разьляцелася шырока і ўмомант, як толькі дзядзьку Васіля пачалі сустракаць на вуліцах сталіцы, на алеях Бараўлянаў, дзе яго кансультуе адзін з найлепшых прафэсараў. Быкаў — дома і, здаецца, назусім; значыць, усё яшчэ вернецца на колы свае. Куды б Быкаў ні завітваў, падыходзяць чытачы, падносяць кнігі на подпіс. У такі момант і зьняў яго фатограф у Рэдакцыі «НН».

САЧЫ ЗА САБОЙ

Яшчэ адзін крок да 37-га

Камітэт дзяржкантролю атрымаў права праслухоўваць тэлефоны і памяшканьні, чытаць звычайную і электронную пошту. У кожным з нас сядзіць вораг народу, сабатажнік і ангельскі шпіён.

Прыняты палатай прадстаўнікоў у першым чытаньні законапраект «Аб унясеньні зьменаў у Закон Рэспублікі Беларусі аб апэратыўна-вышуковай дзейнасьці» дае паўнамоцтвы весьці апэратыўна-вышуковую дзейнасьць аж васьмём структурам: органам унутраных справаў, дзяржбясьпекі, памежных войскаў, службе бясьпекі прэзыдэнта, мытным органам, органам замежнай выведкі і камітэту дзяржкантролю.

Калі раней ведамства Тозіка мела права цікавіцца толькі бухгальтэрыяй, дык цяпер упаўнаважана зьбіраць любую інфармацыю пра прадпрыемствы і арганізацыі. «Гэта можна скіраваць супраць любых нязгодных з палітыкай рэжыму — прадпрымальнікаў, дырэктараў», — мяркуе адвакат Алег Воўчак.

Зьмены тычацца й павелічэньня тэрмінаў вядзеньня апэратыўна-вышуковай дзейнасьці. З санкцыі генпракурора зьвесткі аб злачынных групоўках, арганізацыях, а таксама аб карупцыі могуць цяпер правярацца два гады. Раней гэты тэрмін не перавышаў паўтара году — і тое ў выключных выпадках.

Падставамі для сачэньня, як запісана ў законе 1999 г., застаюцца крымінальная справа або зьвесткі аб прыкметах злачынства, зьдзейсьненага ці заплянаванага, аб асобах, якія падрыхтавалі, зьдзейсьнілі альбо зьдзяйсьняюць злачынства; зьвесткі аб падзеях альбо дзеяньнях, што ствараюць пагрозу нацыянальнай бясьпецы краіны. Законам прадугледжваецца праслухоўваньне памяшканьняў, кантроль паштовых і тэлеграфных паведамленьняў, праслухоўваньне тэлефонаў, зьняцьце інфармацыі зь любых тэхнічных каналаў сувязі (электроннай пошты, мабільнікаў і г.д.). Гэтыя матэрыялы могуць пасьля выкарыстоўвацца ў судзе як доказ, а таксама служыць падставай для ўзбуджэньня крымінальнай справы. Юрыст Праваабарончага цэнтру «Вясна» Валянцін Стэфановіч кажа, што, улічваючы сёньняшнюю практыку, можна зрабіць выснову, што ў краіне ўжо вядзецца апэратыўна-вышуковая дзейнасьць без узбуджэньня крымінальных справаў, ажыцьцяўляецца негалосны нагляд за грамадзянамі.

Павелічэньне тэрміну вышуку да пяці гадоў прадугледжваецца толькі для адной групы злачынстваў — «супраць міру, дзяржавы і бясьпекі чалавецтва». У новым КПК упершыню вылучаная такая экзатычная група злачынстваў.

Больш хадавым, у сьвятле апошніх падзеяў з СМІ, можа апынуцца пункт «злачынствы супраць дяржавы і парадку ажыцьцяўленьня ўлады і кіраваньня».

У Беларусі парлямэнт ня мае магчымасьці правяраць працу органаў апэратыўна-вышуковай дзейнасьці, тады як у суседніх дзяржавах існуюць спэцыяльныя парлямэнцкія камісіі кантролю за спэцслужбамі.

Вераніка Дзядок

«БДГ» выйшла за мяжою

У прыватных распаўсюднікаў і ў агенцтве «Марат» зьявіўся новы нумар «прыпыненай» «Белорусской деловой газеты». Насычаны інфармацыяй і аналізам выпуск убачыў сьвет пад шапкаю «Предпринимательской газеты» на Смаленскім паліграфкамбінаце. Нумар дабіраўся ў Менск з прыгодамі: уначы мікрааўтобус з накладам затрымалі ДАІшнікі на ўезьдзе ў Менск ва Ўруччы на падставе «апэратыўнай інфармацыі, што ў машыне могуць знаходзіцца наркотыкі». Аднак урэшце, каля 3-й ночы, прапусьцілі.

Першы суд па скарзе «БДГ» на папярэджаньне Міністэрства інфармацыі перанесены на 17 чэрвеня. Паседжаньне пачнецца ў 11.00 па адрасе: вул.Валадарскага, 8, кабінэт 223.

Конкурс для падпісчыкаў

Рэдакцыя «Нашай Нівы» праводзіць розыгрыш каштоўных прызоў для тых, хто падпішацца на нашу газэту на 2-е паўгодзьдзе. Галоўны прыз — падарожжа на Балтыйскае мора. Дасылайце на адрас Рэдакцыі копіі сваіх падпісных абанэмэнтаў (на ўсё паўгодзьдзе). Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск.

Апошні дзень падпіскі — **23 чэрвеня**. Розыгрыш прызоў — **1 ліпеня**. Падпісны індэкс **63125**. Дык падпісвайся!

Трымайце сьцяг вышэй


IREX-PROMEDIA

7 чэрвеня 1995 г. на стадыёне «Дынама» зборная Беларусі выйграла ў аднаго з грандаў сусьветнага футболу, зборнай Галяндыі, — 1:0. Роўна праз восем гадоў, 7 чэрвеня 2003 г. нашы сустракаліся на тым жа «Дынама» з тымі ж галяндцамі — і прайгралі 0:2. Адзінае адрозьненьне ў гэтых дзьвюх гульнях, якое дагэтуль стаіць у мяне ўваччу, — сотні бел-чырвона-белых сьцягоў, ужо забароненых Лукашэнкам, на трыбунах у 95-м і мора чырвона-зялёных сёлета.

Тады, у год ганебнага рэфэрэндуму, дэпрэсія нацыянальнага руху была вельмі падобнай да сёньняшняй. Калі зьбілі дэпутатаў ад апазыцыі, з пратэстам на плошчу выйшлі колькі дзясяткаў актывістаў; на Дзяды-95 ля будынку КДБ, дзе выступалі яшчэ Пазьняк і Быкаў (!), сабралася чалавек трыста; а на выбарах у Вярхоўны Савет XIII скліканьня ня быў абраны ніводзін фронтавец. Адчуваньне поўнае паразы й безнадзёгі трымцела ў паветры. І я добра памятаю, чаму ў тую восень 95-га прыйшоў на Варвашэні, 8, ва Ўправу БНФ: гэта было адзінае месца ў Менску, дзе на ўваходзе застаўся лунаць бел-чырвона-белы сьцяг.

Ніхто й уявіць сабе ня мог, што праз некалькі месяцаў увесну 96-га выбухне хваля шматтысячных маніфэстацыяў. Але сьцяг падымалі на кожным пікеце — каб даць сыгнал адкрытага супрацьстаяньня. Сьцьвердзіць знак, можа, далёкае, але перамогі.

Сёлета, калі мы фактычна страчваем астатні сымбаль незалежнасьці — нацыянальную валюту, большасьць апазыцыйных структураў ужо адмаўляецца ад вулічных акцыяў як мэтадаў супраціву. Партыі й рэгіёны мігруюць у бок «сыстэмнае палітыкі». Нават хартысты з сваім мітынговым іміджам, засноўваючы новы рух, абвясьцілі, што змаганьне пойдзе за месцы ў палатцы. Партыйныя й сіне-зорныя штандары, а часам і чырвона-зялёныя дэпутацкія значкі паўсюль замяняюць сабой бел-чырвона-белы сьцяг. Праўда, як паказваюць сацыялёгія і футбол, вынік горшы, чым у 1995-м.

Сымбалічны ўзровень супраціву — знакавыя акцыі, мінімальныя пікеты, вывешваньне сьцягоў на ўгодкі, Курапацкая абарона й нават адстойваньне назвы станцыі мэтро — рэч надзвычай важная й паказальная. Гэта не імітацыя і не «піяр». Гэта эфэкт прысутнасьці Беларусі. Гэта сыгнал, што пасьля дзевяці гадоў рэжыму нехта яшчэ гатовы ўстаць на ўвесь рост. Бо калі мы зьнікаем з вуліцы — будзьце пэўныя, па нашыя душы хутка пачнуць прыходзіць ужо дахаты.

Ведаеце, чаму пратэстны настрой беларусаў застаецца на ўзроўні бурклівага шэпту і папяровых адсоткаў? Ды проста, пакуль дзеячы апазыцыі сядзяць ціха і, не падымаючы галавы, рыхтуюцца да чарговых «выбараў», народ сабе думае: «О-о, нават адмарозкі ў кусты пахаваліся. Значыць, зусім гамон», — і прыгінаецца яшчэ ніжэй.

Бел-чырвона-белы сьцяг, што цудоўным чынам узьнікаў як заклік да наступу ў вырашальныя моманты беларускай гісторыі, — гэта белая палатніна з крывёю ўкрыжаванага Ісуса, гэта перамога, у якую трэба верыць.

Хочаце перамагчы? Трымайце сьцяг вышэй!

Павал Севярынец

Фальстарт генэрала


АНАТОЛЬ КЛЯЦЧУК

Памятаеце клясычнае апавяданьне Максіма Гарэцкага «Генэрал»? На фронт з праверкай прыехаў старэнькі генэрал, пагаварыў з жаўнерамі, пабываў у шпіталі, пакаштаваў салдацкай кашы. Але нечага яму ў жыцьці бракавала, нешта рупіла. І ўзьдзябурыўся генэрал на бруствэр акопу, і пачаў хадзіць туды-сюды пад прыцэлам варожых снайпэраў. Зразумела, сьледам за дзедам у лямпасах мусіў лезьці пад кулі і камандзір інспэктаванага палка. Які ўрэшце і загінуў бязглуздай сьмерцю. А ўсё праз тое, што ў генэральскай крыві востра адчуваўся недахоп невядомага тады адрэналіну. Апавяданьне Гарэцкага прыгадалася мне ў мінулую пятніцу, калі паслухаў у «Панараме» выступ беларускага генэрала, дэпутата і пісьменьніка Мікалая Чаргінца. Сп.Чаргінец на ўсю Беларусь абвесьціў, што ён шчодры чалавек, — паабяцаў ахвяраваць прэмію «саюзнай дзяржавы» на патрэбы зьбяднелых пісьменьнікаў. Люд наш даверлівы, таму, мабыць, сёй-той пабег на пошту даваць на адрас дабрачынцы ў пагонах падзячную тэлеграму. Але не сьпяшайцеся. Прэмію сп.Чаргінец толькі задумаў атрымаць. І прыклаў пэўныя намаганьні, каб пра яго й Івана Навуменку, як пра будучых ляўрэатаў, нібыта вылучаных Саюзам пісьменьнікаў, зьявілася інфармацыя ў СМІ. Але атрымаўся фальстарт. Вылучыць на любую прэмію, Нобэлеўскую ці імя Аркадзя Куляшова, паводле статуту, мае права выключна Рада Саюзу пісьменьнікаў. А яна на сваё паседжаньне зьбярэцца толькі 17 чэрвеня, дзе і адбудзецца вылучэньне (ці невылучэньне) на згаданую прэмію. Рада вырашыць, ці варты аўтар крымінальных раманаў М.Чаргінец гэткай «высокай узнагароды», якую ў свой час атрымалі І.Шамякін і А.Дудараў. Але і іх Саюз пісьменьнікаў на «саюзную» прэмію не вылучаў. Як не вылучаў пакуль і М.Чаргінца. Выказваю спачуваньне народнаму пісьменьніку Івану Навуменку, які ў гэтай сытуацыі аказаўся проста падстаўленым, як той камандзір палка ў апавяданьні М. Гарэцкага. Дзякуй Богу, без трагічнага выніку. Што да клопату пра пісьменьнікаў, то найпершы абавязак сп.Чаргінца, як старшыні Літфонду і прадстаўніка ўлады, — адрамантаваць (фактычна — уратаваць) іхні занядбаны Дом творчасьці «Іслач». Памятаецца, за гэта і браўся новаабраны кіраўнік Літфонду, просячы на разгарненьне свайго гаспадарчага таленту год. Дамоўлены тэрмін хутка міне, а калісьці ўтульная «Іслач» працягвае разбурацца, і на яе ўжо паклала вока кіраўніцтва справаў прэзыдэнта. А з прэміяй сапраўды непрыгожа атрымалася. Піяр піярам, але гонар і годнасьць, дальбог, ня лішнія і пры наяўнасьці мундзіру.

Міхась Скобла, намесьнік старшыні Саюзу беларускіх пісьменьнікаў

Ад Рэдакцыі. Мы чакаем ад СП не вылучэньня беларускіх пісьменьнікаў на прэмію нейкай саюзнай дзяржавы, а заявы з пратэстам супраць антыканстытуцыйнасьці гэткага вылучэньня, гэткай прэміі і гэткай «дзяржавы». Права на такі пратэст нам дае тое, што грошы на гэтую прэмію будуць брацца з нашай, падаткаплатніцкай кішэні, тады як ні пра якую «саюзную дзяржаву» ў нас ніхто не пытаўся. Пыталіся на рэфэрэндуме пра эканамічнае супрацоўніцтва з Расеяй, на што мы, беларускі народ, згоду далі. Што да марнаваньня нашых грошай на новыя бюракратычныя «саюзныя» структуры і нейкія прэміі гэтых структур (чытай — лішнія грошы), дык тут мы рашуча супраць.

Курапаты — «это кладбище»?!

IREX-PROMEDIA

Прыехалі, што называецца. Галоўны архітэктар сталічнага мэгаполісу Аляксандар Чадовіч паставіў матэрыяльную нерухомую гісторыка-культурную каштоўнасьць першай катэгорыі «Месца згубы ахвяр палітычных рэпрэсій 30—40-х гадоў мінулага стагодзьдзя», разьмешчаную побач зь менскім мікрараёнам Зялёны Луг-7, у шэраг звычайных могілак. Такую сваю пазыцыю засьведчыў высокага рангу гарадзкі чыноўнік у інтэрвію «Комсомольской правде в Белоруссии» 8 траўня 2003 г.

Кароткае, два абзацы тэксту, выказваньне пра Курапаты сп.Чадовіча мае колькі супярэчнасьцяў. Спачатку ён кажа, што як «нормальный человек» разумее, «что это за место». Слушна ім адзначана праблема падзелу помніка гісторыі кальцавой дарогай на дзьве часткі.

Але, прапануючы ўтварыць на месцы масавых пахаваньняў адзіны мэмарыяльны комплекс, галоўны архітэктар Менску выявіў поўнае неразуменьне характару гэтага трагічнага месца. Ці думаў ён калі-небудзь, што курапацкі лес ёсьць адным суцэльным пахаваньнем?! Менавіта пахаваньнем, але ж ня могілкамі, якія маюць ці хаця б мелі рэгулярную пляніроўку, дзе магілы нейкім чынам пазначаны або іх можна дакладна акрэсьліць… Пытаньняў безьліч. Ня высьветліўшы ўсе іх да канца, адказ даць немагчыма.

Ахоўная зона Курапатаў у сотню мэтраў, што прапанаваў А.Чадовіч, патрэбна не для абароны трагічнага нэкропалю, а для забесьпячэньня рэалізацыі генэральнага пляну Менску. Паводле меркаваньняў праекціроўшчыкаў, тэрыторыя побач з пахаваньнямі, вакол якой сёньня разгараюцца дыскусіі, мае надзвычайную горада-будаўнічую каштоўнасьць. Тут генплянам вызначана ўзьвесьці жылы мікрараён з шматпавярховых будынкаў, падобны да суседняга Зялёнага Лугу ці якой-небудзь Малінаўкі. Для дзясяткаў, калі ня сотні тысяч будучых насельнікаў патрэбная будзе, панавуковаму кажучы, рэкрэацыя. Гэту ролю выдатна выканае курапацкі лес, куды й сёньня наведваюцца аматары шашлыкоў ці сабакаводы з сваімі ўлюбёнцамі. І тады ніякіх валанцёраў ня хопіць, каб прыбіраць бітае шкло, плястыкавы посуд, цэлафан — шмат з таго, што пакідае чалавек пасьля своеасаблівага яднаньня з прыродай.

Такую пэрспэктыву Курапатам плянуе «нормальный человек» Аляксандар Чадовіч?

Хто ня верыць, няхай пройдзе па прыгарадных лясах уздоўж кальцавой дарогі ды побач зь мікрараёнамі, што прытуліліся да прыменскіх лясных зонаў. З упарадкаваньнем гэтых земляў не спраўляюцца спэцыяльна прызначаныя на тое службы. Менскі аблвыканкам такую праблему наважыўся вырашыць надзвычай проста: яго рашэньнем №307 ад 28 красавіка 2003 г. вызначана падрыхтаваць у найбліжэйшы час «Палажэньне аб парадку вылічэньня, уплаты і выдаткоўваньня збору зь землеўласьнікаў, землекарыстальнікаў і ўласьнікаў зямельных участкаў на ачыстку тэрыторый ад сьмецьця і ўтрыманьне іх у належным стане». Гэта ў дадатак да істотна зьмененых у бок падвышэньня ставак зямельнага падатку.

Як той казаў, з агню ды ў полымя. Нехта самазваламі будзе прывозіць сьмецьце, цешыцца шашлычкамі на ўлоньні матухны-прыроды, а плаціць будуць усе — перш за ўсё законапаслухмяныя грамадзяне, як гэта заўсёды й бывае ў нашай дзяржаве.

Пра знакаміты ўжо пасёлак Сонечны, што наважылася будаваць пры Курапатах фірма «Вігэўрабуд», гаворка асобная. Няма сэнсу, відаць, кранаць маральны бок гэтай справы: там, дзе грошы, маралі рабіць няма чаго. Дый мараль для многіх нашых суграмадзян ня ёсьць катэгорыя матэрыяльная, ад яе наяўнасьці ці адсутнасьці ім ня цёпла й не халодна.

Гаворка пра адкрыта-цынічнае парушэньне заканадаўства, бо ня выканана патрабаваньне аб вызначэньні ахоўных зон гісторыка-культурнай каштоўнасьці перад падрыхтоўкай «праектаў раённай пляніроўкі ці рэканструкцыі гарадоў ды іншых населеных пунктаў». І што ж, нехта панёс пакараньне за ігнараваньне закону? І ня блізка: ні маральнай, ні прававой адказнасьці не наступіла. Абаронцаў Курапатаў бяз дай прычыны можна і пад АМОНаўскія дубінкі пусьціць ды па аўтазаках парасьпіхваць. А тут нават участковы міліцыянэр не абмовіўся і словам. Нездарма даўно было сказана: рука руку мые, або крумкач крумкачу вока ня выдзеўбе.

Луцэя Баторына

ВОДГУК

Адкрыты ліст у Менгар-выканкам

Дарагія таварышы! Асабіста дарагі мэр Паўлаў! Сардэчны Вам дзякуй ад усіх пэнсіянэраў і камуністаў, што вярнулі станцыі мэтро «Плошча Незалежнасьці» яе спрадвечную назву «Плошча Леніна»! Гэтая «незалежнасьць» у мэтро мне таксама рэзала вуха дзесяць гадоў, і «Ракаўская» таксама — зараньня рэзала. Але я лічу, што спыняцца на гэтым ня варта. У нашай сталіцы яшчэ ёсьць шмат аб'ектаў, названых непрадумана.

Вось, напрыклад, «Купалаўская». Гэтую станцыю мэтро госьці сталіцы блытаюць з Купалаўскім тэатрам. Было б лягічней пераназваць яе ў «Піянерскую» — у гонар адраджэньня легендарнай дзіцячай арганізацыі. Апроч таго, побач знаходзіцца кінатэатар «Піянер» з унікальным зімовым садам, упрыгожаным драўлянымі скульптурамі малпаў і кракадзіла, якія, на маю думку, маюць гісторыка-культурную каштоўнасьць.

Ёсьць яшчэ гандлёвы цэнтар «Купалаўскі», што пад Кастрычніцкай плошчай. Яго можна пераназваць у «Акцябарскі», каб унікнуць блытаніны. Да таго ж, паэт Купала туды ніколі не заходзіць — я пытаўся ў прадаўшчыц. А вуліцу Маскоўскую лягічна было б падоўжыць да аднайменнага аўтавакзалу і могілак.

Гасьцініцу «Беларусь» (бо рэспубліка наша і так называецца гэтым словам) пераймянуйце ў «Пушкінскую». Бо недалёка знаходзіцца помнік вялікаму рускаму паэту, падораны братнім маскоўскім мэрам. Стаіць гатэль на шляху з цэнтру да Пушкінскага праспэкту і можа выконваць ролю своеасаблівага ўказальніка для гасьцей сталіцы. Дый прыемна ім будзе пабачыць роднае імя на адным з самых высокіх будынкаў гораду.

Станцыю мэтро «Няміга», паколькі ніякіх добрых асацыяцыяў яна не выклікае, пераназавём у «Калектарную». Фактычна гэта будзе тое самае, бо рачулка, што дала ёй назву, працякае ў падземным калектары. А вуліцу Нямігу можна адпаведна перайменаваць у Калектарны праспэкт, падоўжыўшы яго за кошт вул.Багдановіча.

У свой час мяне, як вэтэрана спэцслужбаў, балюча кранула і зьнікненьне з карты гораду імёнаў Урыцкага, Апанскага. Вуліцы Гарадзкі Вал (ніякага валу там не назіраецца) трэба вярнуць гістарычную назву — Урыцкага. Да таго ж, у назьве з валам цэлых адзінаццаць літараў і адзін прабел — багата траціцца фарбы, не па-гаспадарску гэта. Тое самае і з Раманаўскай Слабадой.

Пры канцы — два назіраньні эстэтычнага характару. Па-першае, адна з станцыяў мэтро, хоць і завецца «Першамайская», але выкананая ў падазроных чырвона-белых колерах. Дый выхад там «на правы бок». Падругое, цяпер, калі пад вашым мудрым кіраўніцтвам горад, нарэшце, добраўпарадкаваны, яму не стае імя Сталіна. Было б справядліва надаць імя Сталіна адной з цэнтральных плошчаў сталіцы, напрыклад, плошчы Свабоды.

Заўсёды ваш,

Граждан Іванавіч з Эрытрэі

БАЖ пакінуў Падгайнага

«Незалежныя СМІ — на мяжы вынішчэньня», — гэтак прывітала дэлегатаў III зьезду Беларускай асацыяцыі журналістаў прэзыдэнтка Жанна Літвіна. Яе справаздача пра дзейнасьць БАЖу за тры гады, што мінулі ад II зьезду, нагадвала зводку з франтоў: Маркевіч, Мажэйка, Івашкевіч, «БДГ», зусім сьвежыя «наезды» на «Вечерний Столин», «Навінкі». Аднак у прамове прэзыдэнткі практычнае занепакоенасьці было болей, чым палітычнае рыторыкі: дзе працаваць журналістам зачыненых выданьняў?


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК
Жанна Літвіна

Адказу на гэтае пытаньне ня ведалі й дэлегаты, што першыя гадзіны зьезду несупынна жмурыліся ад фотамаланак. Іншым вонкавым раздражняльнікам былі мабільныя тэлефоны. Іх разнастайныя — ад фугаў Баха да палянэзу Агінскага — мэлёдыі чуліся ў розных канцах залі. Упару было, як у тэатры, папрасіць адключыць мабілкі.

У дэпутата Ўладзімера Парфяновіча, які таксама прыйшоў на зьезд, сотавік ня грае ніякае пэўнае мэлёдыі, толькі пералівіста пішчыць. Сеў алімпійскі чэмпіён у першым шэрагу з краю, ціхутка гутарыў з Уладзімерам Даўжэнкам, рэдактарам газэты «Спорт-курьер». Пасьля, папрасіўшы слова, выйшаў на сцэну. Малаватая бажаўская трыбунка... Прамаўляць давялося крыху сагнуўшыся. Парфяновіч па-расейску «павіншаваў са зьездам» усіх прысутных, пажадаў і надалей «бязбольна лячыць уладу пяром», падзівіўся іранічна, чаму БАЖ дагэтуль не раскалолі.

І нібыта настроіў зьезд на пэўную ноту. Асноўныя спрэчкі ў залі тачыліся вакол пытаньняў, тым ці іншым чынам датычных палітыкі. Чуліся нават нараканьні, што на зьезьдзе няма «прадстаўнікоў улады і апазыцыі», «палітычных партыяў». Прагучала і цалкам цьвярозая думка — варта было запрасіць суседзкія СМІ, акрэдытаваныя ў Беларусі. Яны ж «накрываюць» паўкраіны: сюжэт, паказаны па польскім ТБ, пабачылі б гарадзенцы, украінскую праграму — частка берасьцейцаў. Пра расейскую тэлевізію і казаць няма чаго.

Міхась Булавацкі з Магілёва параіў разьмяжоўваць «сапраўдную палітычную журналістыку» і «калі ў газэце малююць клубы з вусамі». Менавіта за апошняе, на яго думку, і адбывае цяпер пакараньне большасьць журналістаў. А міжнародная супольнасьць бачыць, што іх судзяць за «дзіцячыя сваволькі». Справу «Вечернего Столина» ён параіў не ўключаць у справаздачу, бо абвінавачаньні ў бок улады, зьмешчаныя ў газэце, — беспадстаўныя. Усё праўда, але ёсьць і яшчэ адзін аспэкт: несувымернасьць віны і пакараньня. Дый мэтазгоднасьці пакараньня наагул. Абрам Лінкальн вунь штораніцы шукаў у газэтах карыкатуры на сябе. І вельмі радаваўся, калі знаходзіў.

Сяргей Законьнікаў распавёў пра цяжкую сытуацыю зь літаратурай у СМІ, пра холдынг, які падмяў дзяржаўныя часопісы, пра Таісу Бондар, якая асабіста вырашае, які твор друкаваць, а які не. А незалежныя часопісы рэгістраваць цяжка: на ягоную думку, «Дзеяслоў» праскочыў, астатнія не праскочаць». Але прамову Законьнікаў скончыў аптымістычна, заклікам «рыхтавацца да лепшага». У выступах Жанны Літвіной, тэлевізійшчыка Віталя Сямашкі таксама гучалі прапановы падумаць, «якімі будуць СМІ пасьля Лукашэнкі». Адзінае, што тут можна сказаць з пэўнасьцю, — будуць яны прыватнымі, як у суседняй Літве. Фэномэн дзяржтэлерадыё зьнікне, і выжываць будзе дужэйшы.

Мікола Маркевіч у сваім выступе абрынуўся на «Аляксандра Фэ», за якім лёгка пазнаваўся адсутны ў залі Фядута. Маркевіч зьвінаваціў яго ў штрэйкбрэхерстве за артыкул у часопісе «Абажур» пад рубрыкай «Асабістае меркаваньне». Двойчы зацытаваў верш Караткевіча, прысьвечаны Быкаву, перапрысьвяціўшы яго ўсім сумленным журналістам. «Аляксандра Фэ» згадваў і Халезін, які пачаставаў дэлегатаў вытрымкамі з свайго скандальнага дакладу, зьмешчанага на сайце «Хартыі»: «Гранты — перастаньце пра іх пісаць, вы забралі хлеб у Фядуты...» Ад напалу эмоцыяў сапсавалася стойка, і наступныя прамоўцы мусілі прамаўляць зь мікрафонам у руках. Рэдактар газэты «Товарищ» Сяргей Вазьняк заклікаў да таварыскасьці: «І Мікола М., і Аляксандар Ф. — мае калегі, кожны мае свой погляд. Бяда, што Аляксандар Л. іншае думкі не прымае».

Пра гэтую праблему гаварылася багата. Справаздача Ж.Літвіной месцамі ператваралася ў аповед пра захады Аляксандра Л. і падуладных яму структураў супраць незалежнае журналістыкі. Зь іншага боку, уладзе падзякавалі за тое, што зьменшыла ў дзесяць разоў арэнду за офіс БАЖ.

Выйшаўшы ў перапынку падыхаць на ганак гатэлю «Беларусь», у якім адбываўся зьезд, зьдзіўленыя дэлегаты пабачылі, што дождж паліваe як зь вядра. Калі пачыналі «засядаць», сьвяціла сонца. Асабліва перажывалі тыя, хто папрыяжджаў здалёк у лёгкіх пінжачках, а то й кашульках: на дварэ добра захаладала.

Рэдактар «Вольнага Глыбокага» Ўладзімер Скрабатун распавёў, як шукаў па ўсёй Глыбоччыне пчаляроў — знайшоў толькі аднаго старога з двума домікамі. «Няма пчолаў — няма дзяржавы», — уздыхае скрушна. Рэдактарка «Новай газеты Смаргоні» Аліна Суравец крыху нэрвавалася: сын-выпускнік здае экзамэн па матэматыцы. Далей хоча ісьці вучыцца на архітэктара. А «Новая газета» дагэтуль знаходзіцца ў падвешаным стане: выхад аднавіўся, але мясцовае начальства яе «не прызнае», адмаўляецца даваць інфармацыю, пошта адмовіла. Некаторыя чыноўнікі, як бачаць на вуліцы прыватных распаўсюднікаў, што разносяць газэту падпісчыкам ці прадаюць, адразу ж тэлефануюць у міліцыю, каб прыяжджала й забірала.

«Навінкі» прыйшлі на зьезд усім калектывам — чалавек дзесяць. Актыўна прадавалі па сто рублёў «забаронены» нумар, які не дайшоў да шапікаў. На першай старонцы —Лукашэнка ў футбольнай форме паказвае «чырвоную картку» рэдактарам «Навінак», «БДГ» і чамусь «Народнай волі». Хочацца прымхліва пляваць цераз плячо. Побач з стосам газэтаў на стале стаяла скрыначка для ахвяраваньняў «на штраф». Апроч «Навінак» за грошы, у дзесяць разоў большыя, прадаваўся «Лідскі летапісец». Усе астатнія газэты можна было браць задарма.

Пасьля перапынку на зьезьдзе зьявіўся кіраўнік упраўленьня Мінюсту Міхаіл Сухінін. Віталі яго воплескамі.

Зь цяжкасьцю ўтаймаваўшы ахвоту дэлегатаў выказвацца, прэзыдэнтка пераключыла іх актыўнасьць у заканадаўчае рэчышча. Зьезд прыняў два дакумэнты. У Заяве патрабуецца скасаваць рашэньні Міністэрства інфармацыі аб прыпыненьні выхаду «БДГ», «БДГ. Для служебного пользования», «Навінак» і «Эха»; спыніць крымінальны перасьлед журналістаў; накіраваць на міжнародную экспэртызу праект Закону аб СМІ. Спрэчкі выклікаў пункт, згодна зь якім Міхаіл Падгайны ня мае маральнага права займаць пасаду міністра інфармацыі. Пасьля доўгае дыскусіі зьвярнуліся да рэдактара «Народнай волі» Іосіфа Сярэдзіча. Той разважыў, што «іншы на яго месцы мо яшчэ і горшы быў бы», і пункт вырашылі выкрасьліць. Праект звароту ў Канстытуцыйны Суд, прыняты зьездам, патрабуе адмяніць славутыя артыкулы КК 367, 368 і 369 аб зьнявазе кіраўніка дзяржавы і прадстаўнікоў улады.

Ідучы дахаты, я спрабаваў прымроіць V зьезд БАЖ. Ці ён будзе адбывацца ў краіне з прыватнымі тэлеканаламі й адкрытымі чыноўнікамі? Дзе палітыкай займаюцца палітыкі, законамі — парлямэнт, а ў турмах сядзяць зладзеі. Журналісты ж зьбіраюцца разам, каб гаварыць пра этыку і прафэсіяналізм.

Андрэй Скурко

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Агульны наклад сталічнай апазыцыйнай прэсы зьнізіўся з 175 тысяч у 2001 годзе да 55 тысяч у 2003-м — больш чым утрая. Тым часам агульны тыраж агульнанацыянальнай урадавай прэсы зьменшыўся толькі на 20% — з 1.100.000 асобнікаў два гады таму да 900.000 асобнікаў сёньня.

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК
Іранічны Парфяновіч і сумны Даўжэнка.

Упішуць «Залатым пяром»

Штогадовая ўзнагарода Сусьветнае асацыяцыі газэтаў «Залатое пяро свабоды» сёлета прысуджаная Беларускай асацыяцыі журналістаў. На 56-м Сусьветным кангрэсе газэтаў у Дубліне з рук Глёрыі Браўн Андэрсан з Форуму рэдактараў, які дзейнічае пры «World Association of Newspapers», яе атрымала прэзыдэнтка БАЖу Жанна Літвіна за «геройскі супраціў уціску СМІ з боку прэзыдэнта Лукашэнкі». «Гэтая прэмія — знак, што мы не самотныя ў абароне нашых правоў», — сказала яна. На форуме з паўгадзінным дакладам пра стан СМІ ў Беларусі выступіў таксама дырэктар Беларускага калегіюму Алесь Анціпенка. «Залатое пяро свабоды» ўручаецца штогод, пачынаючы з 1961 г.

Свабода слова

Паводле зьвестак, якія мае «НН», рыхтуецца выхад адразу некалькіх новых пэрыёдыкаў, што не зьбіраюцца падаваць на рэгістрацыю і распаўсюджвацца традыцыйнымі спосабамі. Да такога кроку падштурхоўвае практычная немагчымасьць зарэгістраваць легальнае палітычнае выданьне і пагроза нематываванага закрыцьця. Гэтак, ужо сёлета можа аднавіцца выхад газэты «Свабода».

Бяз права на памылку

8 чэрвеня ў Менску ўтварылася Асамблея дэпутатаў мясцовых саветаў.

ПРЭС-СЛУЖБА АГП

Падчас дэпутацкага сходу. На пярэднім пляне працуе рэдакцыйная камісія (зьлева направа): Мікола Цівунчык (Белаазерск), Вольга Галубовіч (Сьвіслач) і Леанід Гаравы (Гарадок).

Стварэньне міжрэгіянальнай групы дэмакратычных дэпутатаў плянавалася яшчэ вясной. Спачатку «сваіх» дэпутатаў зьбіралі партыі, пасьля ішлі кансультацыі, узгадненьне пазыцый. Нарэшце, у Менску сабраліся больш за 50 дэпутатаў мясцовых саветаў з усёй краіны. Адбылося гэта ўжо пасьля таго, як пра стварэньне сваёй міжрэгіянальнай дэпутацкай групы абвесьціла «Рэспубліка». «Рэспубліканцы» распаўсюдзілі зварот да дэпутатаў мясцовых саветаў з заклікам далучацца да іх, і, паводле словаў Сяргея Скрабца, больш за 70 чалавек такую згоду далі. На канец чэрвеня была запланаваная «спэцыяльная канфэрэнцыя» названай групы. Пасьля стварэньня Асамблеі, цяжка сказаць, ці яна адбудзецца. Апазыцыйныя партыі не дазволілі «апазыцыянэрам» з палаты прадстаўнікоў перахапіць у іх ініцыятыву. С.Скрабец, каб «не заблытаць электарат», прапанаваў аб'яднаць высілкі. Прапазыцыя «рэспубліканцаў» на сходзе не абмяркоўвалася — яе не было ў парадку дня. Мо гэтае пытаньне паўстане пазьней.

Сход дэпутатаў мясцовых саветаў адбыўся намаганьнямі чатырох партый: АГП, БНФ, БСДГ і ПКБ. Ад кожнай зь іх быў вызначаны прадстаўнік у прэзыдыюм, пасьля зацьверджаны сходам. Імі сталі, адпаведна, Марат Афанасьеў, Алесь Міхалевіч, Леанід Гаравы і Васіль Бычок. Дэпутаты ад БСДП «Народная грамада» ў сходзе ня бралі ўдзелу, як і лідэр партыі Мікола Статкевіч. Ён атрымаў афіцыйнае запрашэньне, але адмовіўся прыйсьці.

Лідэры іншых партый выступілі на сходзе з пажаданьнямі дэпутатам і прапанавалі сваё бачаньне дзейнасьці аб'яднаньня. Алена Скрыган (ПКБ) прапанавала гаварыць толькі пра тое, што яднае: законнасьць, правы грамадзянаў, праблемы рэгіёнаў. Аляксей Кароль, які выступаў ад імя БСДГ, заўважыў, што «аб'яднаньне дэпутатаў — першы крок да аб'яднаньня дэмакратычных сілаў». Вінцук Вячорка ацаніў працу дэмакратычных дэпутатаў як «стварэньне архіпэлягу», на якім мусіць паўстаць «кантынэнт». Ён падкрэсьліў, што «бяз згоды дэмакратычных партый сход гэты быў бы немагчымы». Анатоль Лябедзька (АГП) распавёў пра інтэнсіўныя кансультацыі, якія цяпер ідуць паміж партыямі. Найперш наконт адзінага сьпісу на выбары.

Дэпутаты не былі надта актыўнымі, і ў агульнай дыскусіі прынялі ўдзел усяго некалькі чалавек. Гаварылі яны пра праблемы, зь якімі сутыкнуліся ў сваёй невялікай яшчэ практыцы. Алесь Зарамбюк з Мастоў прапанаваў стварыць кансультацыйны цэнтар для юрыдычнай дапамогі дэпутатам. Юрась Губарэвіч зь Белаазерску падтрымаў гэтую ідэю, бо «мы ня маем права на памылку». Белаазерскія дэмакратычныя дэпутаты, якія маюць у савеце большасьць, могуць праводзіць патрэбныя рашэньні, але хацелі б быць упэўненымі, што ня йдуць супраць закону. Заканатворчага досьведу яшчэ шмат каму не хапае. Невыпадкова на сходзе далі слова некалькім экспэртам. Юрыст і былы дэпутат Міхаіл Пліска заклікаў дэпутатаў не ленавацца: «Рукі складаць ня трэба... Галоўнае — данесьці да выбарцаў інфармацыю пра сваю дзейнасьць, пра тое, што вы хацелі зрабіць і хто вам перашкодзіў». А кіраўнік фонду Лява Сапегі Аляксандар Жучкоў нагадаў пра дзейнасьць запачаткаванай вясной 1990-га дэмакратычнай дэпутацкай групы, якая налічвала больш за 60 чалавек.

Сход прыняў назву аб'яднаньня — «Асамблея дэпутатаў мясцовых саветаў» — і некалькі заяваў (аб правядзеньні давыбараў у мясцовыя саветы, аб сацыяльна-эканамічнай сытуацыі ў краіне ды інш.), зацьвердзіў рэглямэнт Асамблеі. Была абраная Каардынацыйная рада з чатырох чалавек.

Дэпутацкі сход стаўся добрай нагодай для ўстанаўленьня кантактаў паміж народнымі абраньнікамі. Ён сапраўды нагадваў дэмакратычны канвэнт — толькі адзінкі былі ў строгіх касьцюмах і гальштуках. Дэпутаты выявіліся аднадумцамі, галасавалі аднагалосна. Непаразуменьне ўзьнікла, калі адзін з удзельнікаў «выявіў» у залі здымачную групу БТ. Пасьля нядоўгіх ваганьняў яе выпрашылі не выганяць. Перамог здаровы сэнс і жаданьне адысьці ад агрэсіі да людзей улады, пра што на сходзе гаварыў дэпутат з Амсьціславу Аляксандар Галакціёнаў. Паводле ягоных словаў, агрэсіўная тактыка перашкаджае знаходзіць паразуменьне з праўладнай большасьцю савету, зь якой, аднак, трэба працаваць і ў якой трэба знаходзіць аднадумцаў.

Алег Тачоны

Новы мех для старога ката́

Такая ўжо асаблівасьць чалавечага розуму: спаткаўшы побач дзьве рэчы, ён абавязкова, нават калі суседзтва выпадковае, імкнецца адшукаць аб'яднаўчы матыў.

Паўстаньне палітычнага блёку з гучнай назваю «Свабодная Беларусь» — добрая нагода для абагульненьняў. Вядомыя асобы стварылі структуру для вылучэньня кандыдатаў на выбарах, гэтым разам — у палату прадстаўнікоў. У кожнай акрузе — па кандыдату (вядома ж, дэмакратычнаму). Крыху раней чулася пра гэткі ж намер блёку палітычных партый, і ўжо было відаць, што поўнага адзінства сярод іх — і, адпаведна, аднаго набору дэмакратаў — ня будзе. Новая ініцыятыва можа дадаць яшчэ па аднаму дэмакратычнаму шукальніку мандату ў акругі.

Сутнасьці ня трэба памнажаць безь неабходнасьці. У рэаліях беларускай палітыкі прынцып Окама выглядае жорстка: ці існуе і калі існуе, то якая неабходнасьць памнажэньня палітычных арганізацыяў апазыцыйнай накіраванасьці?

Прычынай некантраляванага памнажэньня падаецца адсутнасьць у шэрагах апазыцыі мэханізму палітычнай канкурэнцыі па-за межамі выбарчай кампаніі. Арганізаванае й кантраляванае ўладамі ды жорстка крытыкаванае апазыцыянэрамі мерапрыемства ёсьць на сёньня ці не адзіным полем, дзе дэмакраты/апазыцыянэры змагаюцца. Пераважна паміж сабою.

Як лучыцца стаўка выключна на перадвыбарчую агітацыю й занядбаньне ўсіх іншых формаў палітычнай працы — зь несупыннымі скаргамі на маніпуляцыі, фальсыфікацыі, выкарыстаньне адміністрацыйнага ціску? Сумяшчэньне несумяшчальнага жывіць непазбыўны недавер да палітыкаў, якія, бы тыя кветкі-эфэмэрыды, ажываюць на некалькі тыдняў і зноўку ўпадаюць у сон на доўгі й нецікавы міжвыбарчы сэзон.

У палітычным лексыконе не па рангу пачэснае месца займела слова «раскрутка», якая, на добры розум, ёсьць фарсажам на фінальным адрэзку змаганьня за ўладу. Прэтэндэнты на кіраваньне краінай быццам забыліся пра існаваньне іншых спосабаў здабываньня вядомасьці й аўтарытэту сярод выбаршчыкаў. Дэмакратычнаму (або, калі хочаце, апазыцыйнаму) руху нашмат больш ад чарговае асацыяцыі па пошуку кандыдатаў і назіральнікаў патрэбны *ўнутраны* мэханізм сэлекцыі людзей з палітычнымі амбіцыямі, які б выпрабоўваў іхнюю здольнасьць ствараць і адстойваць адметныя палітычныя канцэпцыі, прасоўваць іх «у масы», рэагаваць на зьмены палітычнай сытуацыі, працаваць над выхаваньнем у людзей пачуцьця неабходнасьці сьвядомага выбару. Іншымі словамі, кандыдат у народныя абраньнікі павінен быць прадстаўнікам ідэі. Пошук годных прадстаўнікоў — справа хутчэй закулісная і ня можа рабіцца галоўным складнікам палітычнай кампаніі.

Стварэньне чарговага перадвыбарчага блёку, за якім няма ніякае пазытыўнае праграмы, акрамя дэклярацыі пра жаданьне зьмяніць палітычны курс, разглядаецца ў выключна непрывабным кантэксьце папярэдніх альянсаў і задзіночаньняў. Але прычына ня толькі ў правале гэтых спробаў адным скокам апынуцца на вяршынях улады.

Выбаршчыку зноўку прапануюць сцэнар бяздумнага галасаваньня «за сваіх», якія толькі таму свае, што назваліся апазыцыянэрамі. Апазыцыйнасьць існаму рэжыму выяўляецца ледзьве не адзіным лучвом паміж выбаршчыкам і палітыкам. Імглісты альтэрнатыўны шлях для Беларусі вызначаецца адно як супрацьлеглы ўзятаму курсу. Але такое пазыцыянаваньне больш чым недастатковае і ніколі не задаволіць дырэктара прадпрыемства, які намагаецца акрэсьліць стратэгію на тры—пяць гадоў. Нязгода з уладаю, крыўда на ўладу, расчараваньне ў дзейнай уладзе — хіба гэта можна лічыць *палітычнай праграмай*?

Шырокія аб'яднаньні з прыгожымі назвамі падкрэсьліваюць ня столькі рашучасьць у змаганьні зь існым рэжымам, колькі адсутнасьць у дэмакратаў стаўкі на людзей, якія думаюць. Спадзяваньне ідзе больш на тое, што нязгодны з наяўным рэжымам хоцькі-няхоцькі будзе галасаваць за таго, хто адрапартуецца апазыцыянэрам.

Ды толькі вынікі выбараў вызначаюцца не на працягу кароткіх тыдняў афіцыйнае кампаніі. Прыгожая шыльда й вядомыя імёны могуць прыцягнуць увагу выбаршчыка ў гарачцы кампаніі і скіраваць пратэстныя настроі ў пэўнае, але ўжо далёка не адзінае рэчышча, аднак яны ня ў стане пераканаць тых, хто ставіцца да выбару адказна, і не дадаюць аргумэнтаў тым, хто жадае ўплываць на меркаваньні іншых. Тут нашмат больш прыдаліся б зьвесткі незалежнага маніторынгу ўзроўню жыцьця, які колісь «пагражаў» стварыць У.Ганчарык.

Адсутнасьць палітычных канцэпцый, бесьперапыннай агітацыйнай працы, выключная стаўка на пратэст — прыкмета прымітывізму палітычнага жыцьця, прымітывізму, зь якім ня будзе змагацца ані «Свабодная Беларусь», ані рух «За годнае жыцьцё», ані іншыя асацыяцыі шукальнікаў мандатаў, зачараваныя найноўшым фэтышам палітычнае нумаралёгіі — лічбаю 110.

Між тым, назіраецца непрыемная эвалюцыя ўяўленьняў пра палітычную апазыцыю. Дэфармацыя зайшла настолькі далёка, што ўяўленьне пра палітычную альтэрнатыву рэжыму як рух за правы меншасьці робіцца агульным месцам ужо не размоваў на вуліцах, а даволі вышуканай публіцыстыкі. Адгортваючы старонкі «Arche» ў пошуках пачатку артыкулу пра нараджэньне БНР, я выпадкова пераскочыў некалькі лішніх бачынаў, і назва разьдзелу ўразіла мяне як перуном: «Гей-змаганьне і досьвед беларускага нацыянальнага руху». Яшчэ трохі посьпехаў у гей-змаганьні — і настаўнік з вучнем памяняюцца месцамі.

Аляксандар Карольчык

Што нам нясе валютны саюз

Вынікі візыту міністра фінансаў Расеі Аляксея Кудрына і старшыні Цэнтрабанку Расеі Сяргея Ігнацьева ў Беларусь выклікалі эўфарыю ў Маскве і адчуваньне бездапаможнасьці ды расчараваньня ў Менску. Ва ўрадавых калідорах Беларусі гавораць пра нечуваны псыхалягічны ціск з Крамля. Газэта ж бізнэс-колаў Расеі «Ведомости» з задавальненьнем адзначае: «За адмову ад сувэрэннай крэдытна-грашовай палітыкі Расея заплаціць Менску сьціплую плату: будзе адчыненая крэдытная лінія на 20 млрд руб.» І дадае без спачуваньня: «Гэтак скончылася безнадзейная барацьба Беларусі за раўнапраўе пры аб'яднаньні з Расеяй». Здачу фінансавага сувэрэнітэту расейскі капітал успрыняў як першую ластаўку будучага разбору беларускай эканомікі. Вядома, па расейскіх правілах.

КАЛЯЖ АНДРЭЯ ЧЫКА

Расея прысьпешвае. Яна хоча вырваць зь Беларусі незваротныя саступкі да чарговага лёсаноснага рэфэрэндуму, які рыхтуе беларускі прэзыдэнт. Яе мэта — каб на тэрыторыі Беларусі з 1 студзеня 2005 г. замест нацыянальнай валюты быў уведзены расейскі рубель. Выпрацоўку грашова-крэдытнай палітыкі, «як і раней», мае ажыцьцяўляць Міжбанкаўская валютная рада, якая рэальна ня мае ніякага ўплыву на грашова-крэдытную палітыку.

Міністар Кудрын прызнаў, што «пытаньняў яшчэ шмат». На ягоную думку, іх трэба вырашаць ужо пасьля ўвядзеньня адзінай валюты. Гэта значыць, пасьля бойкі.

Для Расеі напярэдадні далучэньня да СГА (глябальныя перамовы плянуюцца ўжо ўвосень) важна мець гарантаваны ўплыў на эканоміку Беларусі, праз тэрыторыю якой ідзе большасьць гандлёвых струмянёў. А што прынясе валютны саюз Беларусі?

Расейскі рубель трохі больш стабільны. За чатыры месяцы 2003 г. інфляцыя ў Беларусі склала 10,3%, у Расеі — 6,2%. Асаблівых тэхнічных праблемаў пераходу на расейскі рубель таксама ня будзе: ужо па выніках 2002-га 62% разьлікаў паміж краінамі праводзілася ў расейскіх рублях.

Аднак пры ўвядзеньні супольнай валюты будзе страчаны мэханізм рэгуляваньня экспарту ў Расею праз дэвальвацыю нацыянальнай валюты. Пры падатковым уціску ў Беларусі, які на 8—10% вышэйшы за расейскі, мэханізм дэвальвацыі мае істотнае значэньне. Супольная валюта запатрабуе рэструктурызацыі рэальнага сэктару, скарачэньня занятасьці, што прывядзе да росту сацыяльнай напружанасьці.

У выніку стала адмоўнага гандлёвага сальда з Расеяй пасьля аб'яднаньня грашовых сыстэмаў вырасьце дэфіцыт грошай. Узьніклы вакуум будзе аслабляць беларускія банкі. (На 1 студзеня 2003 г. уласны капітал іх складаў усяго 643 млн даляраў. Калі прыняць усе банкі краіны за адзін, ён бы заняў у шэрагу расейскіх 7-е месца — паміж «Глобэксам» і «МДМ-банкам».)

Недахоп грошай можа справакаваць стагнацыю вытворчасьці, нявыплаты заробкаў, пэнсіяў. Зь іншага боку, вырастуць тэмпы прыватызацыі, у тым ліку банкаўскай сыстэмы, дзе квота на долю замежнага капіталу нядаўна была падвышаная з 25% да 50%. Энэрганосьбіты стануць меней даступнымі, прадпрыемствы будуць змушаныя іх эканоміць, што будзе садзейнічаць рэструктурызацыі прамысловасьці.

Па-трэцяе, узьнікне напружаньне зь фінансаваньнем дэфіцыту дзяржбюджэту, што ў першую чаргу адчуе сацыяльная сфэра. У абмен за ўтрыманьне яшчэ аднаго датаванага рэгіёну Расея будзе патрабаваць новых саступак палітычнага сувэрэнітэту.

Ахвяруючы рублём узамен за падтрымку на заплянаваным рэфэрэндуме, ураду прыйдзецца ахвяраваць і дасягнутай эканамічнай стабільнасьцю ва ўмовах неэфэктыўнай эканомікі. Калі эмісійны цэнтар перамесьціцца ў Расею, Нацбанк страціць магчымасьць уплываць на прапанаваньне грошай, банкаўскія стаўкі і інвэстыцыйную палітыку. Беларусь тады чакае пэрыяд нестабільнасьці і сацыяльных узрушэньняў.

УВ

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

БМЗ узбуйняецца

Рэчыцкі мэтызны завод увойдзе ў склад Беларускага мэталюргічнага заводу. Ён ня можа аддаць «Белзьнешэканамбанку» крэдыт у 7 млн даляраў, які атрымаў пад 20% гадавых. І гэта нягледзячы на тое, што завод працуе ў тры зьмены, вязе 80% прадукцыі на экспарт ды плаціць рабочым каля 140 даляраў заробку.

Бюджэтныя падтрымальнікі

91 млрд рублёў падаткаў сплацілі з пачатку году прыватныя прадпрымальнікі. Пра гэта паведаміла Міністэрства па падатках ды зборах. У краіне амаль 193 тыс. «прыватнікаў». 3,3 тыс. зь іх зарэгістраваліся сёлета.

Бутэлькі на дахоўку

Барысаўскае ўнітарнае прадпрыемства «Жытло» наладзіла перапрацоўку плястыкавых адкідаў. За гадзіну можна ўтылізаваць 200 кг ПЭТ-бутэлек ды іншага плястмасавага сьмецьця. Рынкавая цана палімэрнай сыравіны, якую атрымаюць пасьля перапрацоўкі, дасягае тысячы даляраў за тону. Падзарабіўшы грошай, «Жытло» зьбіраецца набыць абсталяваньне для вырабу са сьмецьця плястмасавай дахоўкі.

«Атлянт-М» цікавіцца МТЗ ды МАЗам

У інтэрвію амэрыканскаму часопісу «Forbes» гендырэктар расейскага холдынгу «Атлянт-М» Алег Хусаенаў заявіў, што жадае зрабіцца галоўным імпартэрам МТЗ ды МАЗу на расейскі рынак. «Атлянт-М» зьбіраецца прадаваць у Расею да 20 тыс. беларускіх трактароў у год ды інвэставаць у МТЗ, а таксама МАЗ, калі іх прыватызуюць.

Прыбіральня за мільён

У Гомелі пачалі ставіць біяпрыбіральні. Гарвыканкам набыў 25 кабінак для масавых мерапрыемстваў, яшчэ чатыры паставілі на набярэжнай Сажа. Пакуль яны бясплатныя, але хутка, як і ў Менску, пачнуць прадаваць адмысловыя жэтоны. Улады таксама абавязалі ўладальнікаў аўтастаянак ды бэнзакалёнак да 1 ліпеня набыць біяклязэты. Справа нятанная: плястыкавая кабінка каштуе мільён рублёў, мэталёвая — амаль два мільёны.

«Радзівіл» з бурбалкамі

«Радзівіл» — так будзе названае новае элітнае шампанскае Менскага заводу шампанскіх вінаў. Закаштуе ён 20—25 тыс. рублёў. Дарагі напой будуць вытрымліваць 6 месяцаў замест звычайных трох ды разьліваць у новыя пляшкі з блакітнага шкла ёмістасьцю 0,75 л. Першая партыя «Радзівілу» з 30 тыс. бутэлек зьявіцца ў крамах у кастрычніку.

«Фальксваген» падрульвае

Іван Дземідовіч, першы намесьнік міністра прамысловасьці, завітаў у нямецкі горад Вольфсбург на завод «Фальксваген». Кіраўніцтва канцэрну запэўніла яго, што наладзіць зборку беларускіх фальксвагенаў на былым заводзе ў Абчаку ўжо сёлета, калі ўрад дазволіць без дадатковага мыта экспартаваць іх у Расею. Наступны раўнд перамоваў пройдзе ў канцы чэрвеня ў Менску.

«Пінск» на стапэлях

Цеплаход «Пінск» — першы беларускі карабель клясы «рака—мора» — пакуль ня выправіўся ў выпрабавальнае плаваньне. Пабудова цеплаходу каштавала 410 млн рублёў, але Пінскі суднабудаўніча-рамонтны завод атрымаў толькі 28 млн. «Пінск», разьлічаны на тое, каб даходзіць без дазапраўкі да Херсону ды трымаць двухмэтровую хвалю, пакуль застаецца на стапэлях.

Інвэстклімат

Міністэрства эканомікі рыхтуецца стварыць нацыянальнае агенцтва па прыцягненьні інвэстыцыяў. У краіне ўжо існуюць Беларускае агенцтва спрыяньня замежным інвэстыцыям ды рабочая група па фармаваньні інвэстыцыйнага іміджу краіны Кансультацыйнай рады пры Саўміне. За паўгоду ў краіну прыйшло толькі 270 млн інвэстыцыйных даляраў з 1,5 млрд, заплянаваных на сёлета. Пасады для чыноўнікаў множацца хутчэй, чым інвэстыцыі.

АК

Каласы пад сярпом

Улады звальняюць дырэктараў беларускамоўных школаў аднаго за другім.

Канец навучальнага году прынёс скрушныя навіны ня толькі ў Беларускі ліцэй. Пры канцы траўня, перад выпускнымі, адправілі на пэнсію дырэктарку Беларускай славянскай гімназіі (былой школы №36) Гомелю Тацяну Цыганок. З дырэктарам менскай школы №2 (у Серабранцы), віцэ-прэзыдэнтам Таварыства беларускай школы Аляксандрам Сядзякам, абышліся больш культурна. Ён будзе звольнены пасьля іспытаў — з 30 чэрвеня, калі ў яго скончыцца тэрмін кантракту. Фармальна «органы адукацыі» маюць такое права — не працягваць кантракту і не тлумачыць прычын такога ўчынку. Аднак варта задумацца, што А.Сядзяка кіраваў школай з 1994 г. і дагэтуль да яго прэтэнзіяў не было. Можа, прычына ў тым, што ён, як і Ўладзімер Колас, спрабаваў без адміністрацыйнага дазволу ўдзельнічаць увесну ў мясцовых выбарах. Натуральна, што А.Сядзяку, як і ягонага калегу зь ліцэю, не зарэгістравалі нават кандыдатам.

Сытуацыя ў ліцэі застаецца трывожнай. Гвалтам пастаўленую дырэктарку адклікалі на «падвышэньне кваліфікацыі», аднак не назаўжды. Гэта стала вядома на нарадзе, якую 6 чэрвеня з удзелам У.Коласа, Лявона Баршчэўскага ды Ірыны Сідарэнкі правёў намесьнік міністра адукацыі Казімер Фарына. На думку міністэрства, У.Колас ня можа быць кіраўніком ліцэю. Меркаваньне ж пэдкалектыву розьніцца на 180 градусаў.

Улады «ціснуць» на ўстанову і рознымі праверкамі. 5 чэрвеня тут была праверка з санэпідэмстанцыі, 10 чэрвеня пачалася фінансавая праверка, сьледам за ёй Мінадукацыі распачало комплексную праверку дзейнасьці ліцэю.

У свой чарод бацькі ліцэістаў падалі заяўкі на пікетаваньне: пікеты маюць адбывацца штодня з 19 да 26 чэрвеня. На агульным сходзе 6 чэрвеня былі прынятыя звароты да кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Ўрала Латыпава і ўласна да Аляксандра Лукашэнкі.

Кіраўніцтва ліцэю гатовае да выхаду навучальнай установы з-пад дзяржаўнай «страхі». «Мы пачыналі як нядзельная школка, арганізаваная з ініцыятывы суполкі ТБМ Савецкага раёну Менску, і толькі пазьней перайшлі ў структуру Мінадукацыі. Мы можам зноў вярнуцца ў статус недзяржаўнай установы», — зазначыў У.Колас на агульным сходзе 6 чэрвеня. Гэтае меркаваньне было выказанае кіраўніком ліцэю і 9 чэрвеня ў адкрытым лісьце да Аляксандра Лукашэнкі.

Для бацькоў ліцэістаў гэты крок пэдкалектыву — такая самая неспадзяванка, як і для кіраўніцтва Мінадукацыі. Ясная рэч, што за навучаньне дзяцей у недзяржаўнай установе давядзецца плаціць. Многія задумваюцца пра тое, ці дазволяць ім сродкі вучыць дзіця ў недзяржаўным ліцэі. «Вядома, толькі бацькоўскіх грошай на дзейнасьць ліцэю ня хопіць, таму мы шукаем фундатараў», — зазначае нагоды У.Колас. Паводле ягоных словаў, адпаведныя перамовы цяпер вядуцца.

Аркадзь Шанскі


ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Дырэктар менскай школы №2 Аляксандар Сядзяка ўжо шукае новае месца працы.

Калі тут будзе добра, нелегальныя мігранты застануцца вам

77% палякаў прагаласавалі за ўступленьне сваёй краіны ў Эўразьвяз. Як польскія экспэрты глядзяць сёньня на пройдзеныя этапы інтэграцыі з аб'яднанай Эўропай? Карэспандэнты «НН» гутараць з Альжбетай Скатніцкай-Ільляшэвіч, заснавальніцай Польскай рады Эўрапейскага руху і фундацыі «Польшча ў Эўропе», і Якубам Канецкім, экспэртам Эўрапейскага сакратарыяту, спэцыялістам па справах эканамічнай інтэграцыі Польшчы з Эўразьвязам.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Якуб Канецкі і Альжбета Скатніцкая-Ільляшэвіч у рэдакцыі «НН»

«НН»: Хто ініцыяваў інтэграцыю Польшчы з Эўразьвязам?

А.С.-І.: Сілаю, што з самага пачатку выступала за вяртаньне Польшчы да заходняй цывілізацыі, была некамуністычная апазыцыя. Гэтая ідэя нарадзілася ў апазыцыйных асяродках у 80-я, выношвалася ў Грамадзянскім камітэце, далей — у Радзе і ўрэшце — у Уніі Вольнасьці. Ідэя інтэграцыі набыла рэальныя абрысы пасьля падпісаньня Дамовы аб партнэрстве Польшчы з Эўразьвязам. У ёй, дзякуючы колішняму прадстаўніку краіны ў Брусэлі Яну Калакоўскаму, было запісана, што партнэрства Польшчы з Эўразьвязам мае на мэце ўступленьне краіны ў ЭЗ.

«НН»: Як Польшча ішла да ўступленьня?

А.С.-І.: У красавіку 1994 г. Польшча падала заяву ў ЭЗ. У сьнежні 1997 г. была створаная т.зв. «Люксэмбурская група» з шасьці краінаў-кандыдатак — Польшчы, Вугоршчыны, Эстоніі, Славеніі, Мальты, Кіпру. Яны атрымалі пры канцы сакавіка 1998 г. запрашэньне рыхтавацца да сяброўства. І пачаліся перамовы па канкрэтных пытаньнях, што патрабавалі ўзгадненьня. Яны цягнуліся з 1999 г. аж да 18 сьнежня 2002 г.

Памятаю, Шырак сказаў: «Так-так, Польшча будзе ў ЭЗ у 2000 г.». Гэта было нерэальным, але такі ціск дазволіў перасунуць дату ўступленьня бліжэй, і сышліся ўрэшце на 1 траўня 2004 г. Тагачасны міністар эўрапейскіх справаў лічыў вызначэньне даты надзвычай моцным мабілізацыйным чыньнікам.

«НН»: Дзе пройдуць урэшце межы Эўразьвязу? Як трэба разумець заклікі некаторых эўрапейскіх палітыкаў «спыніцца»?

Я.К.: «Старыя» сябры Зьвязу баяцца, што з павелічэньнем ЭЗ зьмяншаецца іх роля ў арганізацыі.

А.С.-І: А я мяркую, што гэта вынікае з адсутнасьці ўяўленьня. Ці можна ўявіць сабе канчатковае завяршэньне эўрапейскага будаўніцтва? Па-мойму, немагчыма і ня варта.

«НН»: Чаму?

Я.К.: ЭЗ як ідэальная дэмакратыя — у прынцыпе немагчымая рэч. Але мы імкнёмся да яе, выпраўляючы і ўдасканальваючы дзяржаўную сыстэму. Няма ніякага ідэальнага Эўразьвязу. Калі нехта вырашыць, што Эўропа збудаваная, зацьвердзіць дасягнутае — загубіць канцэпцыю.

А.С.-І.: Уявім сабе, што Зьвяз застаўся хаўрусам шасьці краінаў, што былі ў ім ад пачатку. Якой бы тады была роля ЭЗ у сьвеце? Мэта ЭЗ — пашырэньне прасторы бясьпекі на нашым кантынэнце, бясьпекі палітычнай, эканамічнай, экалягічнай і г.д. Каб людзі спакойна плянавалі сваё жыцьцё і мелі пэўнасьць.

«НН»: Ці можа Беларусь увайсьці ў аб'яднаную Эўропу?

А.С.-І.: Існуюць Капэнгагенскія крытэры — палітычныя, эканамічныя. Любая краіна, што выканае іх і пагодзіцца трымацца эўрапейскіх прававых нормаў, можа прэтэндаваць на ўступленьне ў ЭЗ.

Я.К.: Аднак ЭЗ — арганізацыя сярэдніх і малых краінаў, што ня могуць забясьпечыць сябе сыравінай. Таму Расея, нават калі выканае ўсе Капэнгагенскія крытэры, ня можа быць прынятай у ЭЗ. Бо забясьпечвае сябе сыравінай і не зьяўляецца ні малой, ні сярэдняй краінай.

А.С.-І.: Існуюць чатыры прынцыповыя крытэры «эўрапейскасьці», якім трэба адпавядаць, каб далучыцца да будаўніцтва Супольнай Эўропы: геаграфічнае разьмяшчэньне краіны, трывалая дэмакратыя, наяўнасьць вольнага рынку і пачуцьцё прыналежнасьці да гэтага цывілізацыйнага абшару. Вялікая праблема, якую я назіраю ў вашай краіне, — няясна, ці беларусы адчуваюць сябе больш зьвязанымі з заходняй, ці з усходняй цывілізацыяй. Гэта пытаньне саматоеснасьці і ідэнтычнасьці, якое вы павінны вырашыць. Ня ваш прэзыдэнт будзе яго вырашаць, а вы самі — кожны грамадзянін.

Вы пакуль ня можаце стварыць адукацыйную сыстэму, што спрыяла б умацаваньню саматоеснасьці, вырашыць моўную праблему. І толькі калі гэта будзе зроблена, грамадзтва ўбачыць, дзе і на якім этапе разьвіцьця яно знаходзіцца. Пакуль вы ня ведаеце, якое месца займае «Беларусь» у Беларусі, да таго часу мы ня зможам адказаць на пытаньне, якое месца займае Беларусь у Эўропе.

«НН»: Ці будуць польскія прадстаўнікі ў Брусэлі падтрымліваць спробы Беларусі далучыцца да ЭЗ?

А.С.-І.: Бясспрэчна. Польшча зацікаўленая ў найлепшых стасунках зь Беларусяй, бо ў гэтым зацікаўленыя польскія грамадзяне. Усходнія вобласьці Польшчы занепакоеныя зьмяненьнямі ў рэжыме мяжы, бо маюць інтарэсы ў Беларусі й Украіне. Да таго ж, у Беларусі, Украіне і Літве жыве шмат людзей, што маюць сваякоў у Польшчы.

Я.К.: Больш таго — Польшча зацікаўленая ў паляпшэньні становішча беларусаў. Бо гэта ўтрымае іх ад нелегальных трансгранічных справаў. Па-другое, калі тут будзе добра, усе нелегальныя мігранты застануцца вам — ня пойдуць далей, у Польшчу. Таму мы не дазволім французам вызначаць усходнюю палітыку ЭЗ.

Гутарылі ЯЗ і АК

Эўропа атрэсла рукі

Бяз плёну чакалі шэсьць месяцаў на атрыманьне палітычнага прытулку барысаўскія актывісты Свабоднага прафсаюзу Сяргей Пезкін ды Ігар Закрэўскі. Першы з канца мінулага году жыў у прыгарадзе Брусэлю, а другі — у Нюрнбэргу. Яны скардзіліся на перасьлед з боку беларускіх уладаў. У пацьвярджэньне падалі на разгляд іміграцыйных камісій фатаздымкі, аўдыёзапісы і публікацыі ў незалежнай прэсе. Аднак у атрыманьні статусу бежанца І.Закрэўскаму адмоўлена, а С.Пезкіну прапанавана выехаць у Францыю і папрасіць прытулку там, бо ў Бэльгію ён прыехаў па францускай візе. У беларускіх эмігранцкіх колах гэтыя факты расцанілі як дэманстратыўны жэст уладаў краін Эўразьвязу і ЗША. Тут ясна даюць зразумець: дысыдэнты, жыцьцю і здароўю якіх не пагражае непасрэдная небясьпека, павінны адстойваць свае палітычныя погляды дома.

Паводле БелаПАН

Украінцы едуць у Ірак

Вярхоўная Рада Украіны падтрымала прапанову накіраваць украінскі вайсковы кантынгент у Ірак. За гэта прагаласавалі 273 дэпутаты.

У поўным складзе прагаласавала «за» фракцыя большасьці (кучмаўцы), «за» галасавала таксама трэцяя частка дэпутатаў ад правацэнтрысцкага руху «Наша Украіна», у тым ліку лідэр нацыянал-дэмакратаў Віктар Юшчанка, сын Вячаслава Чарнавіла Тарас, ды некалькі дэпутатаў ад Блёку Юліі Цімашэнкі, сярод якіх Сьцяпан Хмара і лідэр УНА-УНСО Андрэй Шкіль. Не падтрымаў пастановы ніводзін дэпутат ад камуністаў і сацыялістаў.

Сакратар Рады нацыянальнай бясьпекі і абароны Украіны Яўген Марчук заявіў, што ЗША абяцаюць кампэнсаваць дзьве траціны з 69,4 млн грывень (каля 13 млн даляраў), якія спатрэбяцца на адпраўку кантынгенту.

Сакратар таксама сказаў, што «нават часовая прысутнасьць украінскіх вайскоўцаў у Іраку дазволіць нівэляваць праблему прыцягненьня украінскіх кампаній да адбудовы Іраку». Толькі адна ўкраінская кампанія, якая перавозіла салдатаў у Кувэйт, зарабіла прыбытку больш як 5 млн даляраў. А галоўныя функцыі ўкраінцаў у Іраку, паводле Марчуковых слоў, — гэта «ахова органаў дзяржаўнай улады». За ўдзел у міратворчай дзейнасьці Украіна ўвогуле атрымала ад ААН 171 млн даляраў.

Рашуча супраць выступіла Юлія Цімашэнка. «Гэта не на карысьць нацыянальных інтарэсаў Украіны. Украінцы ніколі марадзёрамі не былі, і дзяліць тое, што належыць іншым нацыям, — ня наша справа. Калі нашы хлопцы былі там, дзе нішчыўся сувэрэнітэт, яны ніколі не ўставалі на бок акупантаў, — зьвярнулася яна да нацыянал-дэмакратаў. — І пра мараль. Размаўляць з палітыкам пра мараль — тое самае, што размаўляць зь людажэрамі пра вэгетарыянства. Калі ня ведаеце, якое прымаць рашэньне, зьвяртайцеся да Бібліі: не рабі іншым таго, што не хацеў бы, каб рабілі табе. Ці вы хочаце, каб ва Украіне было тое, што ў Іраку?»

Але да яе палымянае прамовы не прыслухаліся, і 1800 украінскіх салдатаў выправяцца ў Ірак у складзе польскага кантынгенту. Украінскі камандзір атрымае пасаду намесьніка камэнданта «польскага сэктару» Іраку.

AP

Яўген Марчук, кіраўнік Рады нацыянальнай бясьпекі і абароны Украіны, адстойваў неабходнасьць адпраўкі войскаў у Ірак

Зацяжное падзеньне Юргена Мёлемана

Былы намесьнік старшыні нямецкіх лібэралаў Юрген Мёлеман загінуў у чацьвер, калі скакаў з парашутам. У той жа час бундэстаг пазбавіў яго дэпутацкай недатыкальнасьці, а паліцыя абшукала кватэру і офісы — быццам бы з прычыны няплаты падаткаў.

Скачкі з парашутам былі ягоным захапленьнем. Ён выкарыстоўваў іх і каб эфэктна зьяўляцца на мітынгах «проста зь неба». У той дзень 57-гадовы Мёлеман на вышыні 1,6 тыс. мэтраў скінуў асноўны парашут і нават не паспрабаваў скарыстацца аварыйным.

Мёлеману закідалі фінансавыя махінацыі ў часе друкаваньня перадвыбарных улётак, што былі прызнаныя антысэміцкімі.

Увесну 2002 г. Мёлеман сказаў, што разумее палестынскіх тэрарыстаў-самагубцаў, бо яны бароняць сваю краіну ад акупантаў. Яшчэ ён падкрэсьліў, што гэта габрэі, такія, як Шарон, «сваёй нянавісьцю» правакуюць антысэміцкія настроі. Пасьля зьявіліся і ўлёткі. Грымнуў скандал. Па выбарах, на якіх лібэралы ледзьве набралі 7% галасоў, Мёлемана выкінулі з партыі. Дый крыніцы сродкаў, выдаткаваных на ўлёткі, былі цьмянымі.

Нямецкія палітыкі былі шакаваныя гібэльлю Мёлемана. Бундэстаг ушанаваў яго памяць, прыспусьціўшы сьцягі на будынках парлямэнту. «Гэта ягоная асабістая трагедыя, — сказаў адзін з былых аднапартыйцаў палітыка Герхард Баўм. — Ён стаў ахвярай сваіх амбіцый. Ён ужо ня бачыў перад сабой палітычнай будучыні і баяўся сьледзтва».

REUTERS

Самазабойствы сярод палітыкаў зазвычай застаюцца загадкай. Цела хрысьціянскага дэмакрата Увэ Баршэля, атручанага снатворным, знайшлі ў ваньне жэнэўскага гатэлю ў 1987 г., пасьля таго як выкрылі, што ён арганізаваў паклёпніцкую кампанію супраць свайго канкурэнта.

Гучнай была і сьмерць дваіх сяброў Партыі зялёных, якіх у прыватным жыцьці яднала палкае каханьне, — Пэтры Келі і генэрала ў адстаўцы Герта Бастыяна. У 90-х яны апынуліся ў палітычнай ізаляцыі з боку аднапартыйцаў. Іх целы знайшлі ў іх доме ў Боне ўвосень 1992 г. Бастыян застрэліў Келі, а потым сябе. Да сёньня невядома, ці хацела Келі паміраць.

Глыбока ўразіла немцаў самазабойства жонкі былога канцлера ФРГ Гельмута Коля ўлетку 2001 г. Усе палічылі, што яна ня вынесла атмасфэры, якая склалася вакол яе мужа пасьля афэры з «чорнымі касамі» ХДС.

Франц Субель

Прысяга на мячы

У мінулыя выходныя ў лясох Магілёўшчыны адбылася прысяга навабранцаў незарэгістраванай патрыятычнай арганізацыі «Белы легіён». Мерапрыемства працягвалася ўсю ноч. Легіёнаўцы зьдзейсьнілі марш-кідок, правялі спарынгі, іншыя фізычныя выпрабаваньні. А пасьля быў канцэрт старажытнай беларускай музыкі й прысяга. Кляліся легіёнаўцы на мячы, як у рыцарскія часы.

Кот ашалеў

На падворку Ш. зь вёскі Дамбнава, што на Івацэвіччыне, гулялі дзеці. На іх нечакана напаў чужы кот. Некаторых ён пакусаў, некаторых падрапаў. Каб спыніць кашэчае вар'яцтва, дарослым давялося жывёліну забіць. Лябараторныя дасьледаваньні, зробленыя вэтэрынарамі, паказалі, што кот хварэў на шаленства. На дом і падворак накладзены каранцін, дзяцей прышчапілі. Паводле словаў галоўнага лекара раёну Анатоля Валадковіча, каб кот ашалеў, такое выявілі ўпершыню. Сустракаліся раней шалёныя сабакі, ваўкі і лісы, а вось катоў не было.

Алесь Лаўранюк, Івацэвічы

Мядзьведзь забіў цётку

Бядой скончыўся сьціплы бізнэс прадпрымальніка зь Лісотава (Сеньненскі раён) Алеся Барысёнка. Ён арандаваў у калгасе частку зьверафэрмы, дзе, апроч норак і лісіц, разводзіў і паляўнічыя сабакі. Каб гадаваць даражэйшы тавар, бізнэсовец трэніраваў цюцек па навуцы, нацкоўваючы іх на дзікоў і мядзьвядзёў, якіх трымаў тутсама, на фэрме. Трагедыя здарылася падчас кармленьня. 37-гадовая наймічка неразважна падышла заблізка да мядзьведзя і атрымала раптоўны ўдар лапай па галаве. Яна войкнула, млеючы, а драпежнік закідаўся па загарадзі, аббэрсваючы яе цела ланцугом. Ад траўмаў жанчынка памерла.

Паводле БелаПАН

Пекла на базары

Сапраўдным пеклам становіцца ўлетку новы крыты базар у Воршы. Летась, калі стаяла нязвыклая гарачыня, прадпрымальнікі патрабавалі зрабіць у памяшканьнях вэнтыляцыю. Адміністрацыя рынку паабяцала вырашыць гэтую праблему. Але пакуль усё засталося па-ранейшаму. Першай ахвярай травеньскай гарачыні стала 45-гадовая гандлярка рыбнага павільёну, дзе паветра яшчэ больш сьпякотнае ад працы маразільнікаў. Ужо неаднойчы даводзілася выклікаць для самлелых гандлярак «хуткую дапамогу».

Віктар Лютынскі, Ворша

Гулялі ў п'яніцаў

У круглянскую больніцу прывезьлі 9-гадовае хлапчаня зь цяжкім алькагольным атручэньнем. Бацькі патлумачылі, што яно гуляла з суседзкімі дзецьмі, якія «падчапілі» недзе пляшку гарэлкі. Жыцьцё хлопчыка выратавалі. Дзеці гуляюць у гульні, якія назіраюць у будзённым жыцьці, дзе распаўсюдзілася звычайнае п'янства.

Шлях у рэанімацыю

Праляжаўшы месяц у больніцы, вярнулася дадому калгасьніца калгасу «Шлях Леніна». У канцы красавіка ўручную расьсейвала па палях угнаеньні — такі атрымала загад ад начальства. У яе праявілася алергія на фосфарна-арганічныя злучэньні, разьвіўся ацёк лёгкіх. Уратавалі цётку толькі дактары Круглянскай райбольніцы і Магілёўскай рэанімацыі.

Зінаіда Мілюшчанка, Круглае

Рыжкавічам — 360

360 гадоў спаўняецца вёсцы Рыжкавічы, дзе жыў А.Лукашэнка. Першая згадка пра яе значыцца пад 1643 г. Тады 20 двароў з Рыжкавіцкага прадмесьця належалі шклоўскім дамініканам, астатнія належалі пану. У 1695 г. было 107 двароў, вёска была шляхецкай уласнасьцю. Перад мінулай вайной у Рыжкавічах было 202 двары і 695 жыхароў.

Паводле газэты «Ўдарны фронт», Шклоў



Варона-«мэталістка» з Гатаўшчыны (Глыбоччына) зьвіла гняздо з алюміневага дроту.

Разматанае гняздо

У вёсцы Гатаўшчына зьявілася надакучлівая варона. То гэта скрадзе, то тое. Няма ніякай рады! Вяскоўцы вырашылі, што трэба лезьці на дрэва і зрабіць «рэвізію» гнязда.

Золата, срэбра, гадзіньнікаў і іншых каштоўных рэчаў у ім не было. Але тое, што ўбачыў гаспадар хаты, ля якой расьце тое дрэва з вароніным гняздом, выклікала ў яго шок. Гняздо зладзейкі было сплеценае без адзінай галінкі — а выключна з мэталу і сынтэтычных матэрыялаў! Гэта — алюміневы дрот, абрэзкі тэлефонных і электрычных дратоў з плястмасавай ізаляцыяй, абрыўкі шпагату. І толькі дно, каб ня мулала, усьцелена пухам, мохам, лапікамі тканіны. Гняздо — проста супэр!

«Нармальная зьява, — кажа Віктар Шчэбет, доктар, уладальнік прыватнай аптэкі ў Глыбокім. — Проста варона разумная. «Ведае», што матэрыял трывалы, разьлічаны на доўгі тэрмін «эксплюатацыі». На жаль, розум вароны ня быў ацэнены належным чынам яе аднавяскоўцамі. Гняздо «дэмантавалі» і, як рарытэт, адвезьлі ў Глыбокае.

Уладзімер Скрабатун, фота аўтара

ЮРА аднаўляе ешыбот

200 гадоў таму ў Валожыне была заснаваная школа рабінаў — на іўрыце *ешыва*, альбо *ешыбот*. На працягу XIX ст. сюды прыяжджалі вучыцца студэнты зь дзясяткаў краін, нават з Сырыі — настолькі высокай была якасьць навучаньня. Славутая ва ўсім сьвеце валожынская ешыва, празваная «маці ўсіх ешываў», можа аднавіць сваю дзейнасьць у ранейшым будынку, перададзеным Юдэйскаму рэлігійнаму аб'яднаньню Беларусі (ЮРА) некалькі гадоў таму. Адрамантаваць старажытны двухпавярховы будынак у цэнтры Валожына ЮРА мяркуе да 2006 г., часу афіцыйнага сьвяткавання юбілею ешывы. Рамонт цягнецца надта марудна. Пакуль што нанава накрыты дах, зроблены адвод зямельнага ўчастку, дасьледаваныя грунты й падмурак.

Мясцовыя юдэйскія суполкі спадзяюцца на фінансавую дапамогу ўраду — на знак кампэнсацыі за разбураныя ў краіне сынагогі. Марныя спадзяваньні, асабліва пасьля прыняцьця «Закону аб свабодзе сумленьня», які замацаваў даміноўнае становішча праваслаўя. Няясна яшчэ, дзе знайсьці вучняў для той ешывы: у Валожыне нібыта засталося ўсяго восем яўрэяў. «Вучыцца тут будуць замежныя студэнты — да 100 чалавек адначасова», — кажа Аляксандар Розэнбэрг, выканаўчы дырэктар ЮРА.

Так выглядала ў пачатку XX ст. школа рабінаў у Валожыне.

У Менску на вул.Даўмана ўжо ёсьць адзін ешыбот з тузінам вучняў, дзе рэй вядзе ізраільскі рабін Сендэр Урыцкі. Аднак кіраўнікам ЮРА заманулася аднавіць былую славу беларускага габрэйства менавіта ў гістарычных мясьцінах ды будынках. Паводле словаў рабіна Ўрыцкага, «калі камусьці ў гэтым сьвеце яшчэ важна штосьці габрэйскае, трэба зноў разгарнуць Талмуд у Валожыне».

Пляны ЮРА амбітныя: акрамя валожынскага ешыботу лідэры аб'яднаньня хочуць прывесьці ў прыстойны выгляд сынагогу сярэдзіны XVII ст. у Слоніме — велізарны напаўразбураны будынак. Чаго на сьвеце не бывае… Здолеў жа адрадзіць іўрыт Эліэзэр Пэрэльман, сьціплы настаўнік з Лужкоў, вядомы ў Ізраілі як Бэн-Егуда.

ВР



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Адраджэньне мячэту

Менскія мусульмане зьбіраюцца адрадзіць мячэт, зьнішчаны камуністычнай уладай у 1962 г. На мінулым тыдні яны сабраліся на колішніх татарскіх могілках, каб адшукаць тое, што засталося ад сьвятыні.

УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У нататцы Вадзіма Болбаса (Сьветлагорск) «Выстава Міколы Купавы» (№20, 30 траўня) цьверджаньне, што «на радзіме Купавы, у Воршы, выставіць гэтую карціну («Інтэграцыя» — **В.Л.**) улады не дазволілі», не адпавядае рэчаіснасьці. Летась у гарадзкой выстаўнай залі Воршы зь вялікім посьпехам прайшла пэрсанальная выстава М.Купавы. Ніякай папярэдняй цэнзуры, а тым больш забароны экспанаваньня асобных твораў не было.

Віктар Лютынскі, Ворша

13 чэрвеня пятніца

● БТ
6.00, 7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.00, 18.15 «Золата Югры». Сэрыял.
8.50 Выпускны экзамэн па матэматыцы за курс базавай школы ў агульнаадукацыйных установах.
9.10, 17.10 «Псі-фактар». Сэрыял (ЗША—Канада).
10.05 Сад мары.
10.35 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
11.00 Падарожжа дылетанта. «Нароўля. Духоўная спадчына палешукоў».
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.15 Добры дзень, Беларусь!
13.05 «Дзяржаўная мяжа». Сэрыял. Фільм 2-і «Мірнае лета 21-га году...» («Беларусьфільм»). 2-я сэрыя.
14.35 «Сцэнары мастацтва». Дак. сэрыял. 3-я сэрыя.
15.15 «Далікатны ўзрост». Сэрыял. 1-я сэрыя.
15.45 «Бабулін козьлік». Мультфільм.
16.05 Прыгодніцкі фільм «Апошняе лета дзяцінства» («Беларусьфільм»). 2-я сэрыя.
19.10 Драма «На Мурамскай дарожцы...».
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Хакей. Кубак Стэнлі. Фінал. Запіс.
23.55 Маст. фільм «Асноўны інстынкт» (ЗША).

● СТВ
6.20 «Шалёны сьвет». Дак. фільм.
6.50 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05, 18.20 «Менск і менчукі».
8.10, 22.50 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: баявік «Паліцэйская гісторыя 3: Супэрпаліцэйскі».
10.00 «Турпаход».
10.10, 23.15 Праект «Адлюстраваньне»: «Сабакі». Дак. фільм.
11.00, 20.30 «Аўтапанарама».
11.15 «Тэатральныя гісторыі».
11.30 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
12.05 «Вовачка». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Тайны знак». Тэлесэрыял.
14.45 Кіно: камэдыя «Лёгкі пацалунак».
16.20 Кіно: трылер «Зьмеялоў». СССР, 1985.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Рэактыўны бокс».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: мэлядрама «Скрыжаваньні». ЗША, 2002.
23.00 «Навіны СНД».
0.00 Кіно: баявік «Горац: Канец гульні». ЗША, 2000.

● Першы музычны канал
7.00 «Пад'ёмнік».
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «V.I.P.онія».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
23.30 МэгаМікс.

● АНТ
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 0.30 Нашы навіны.
8.05 Баявік «Удар Лётаса: Загадка Сьфінкса».
9.05 Камэдыя «Службовы раман».
15.45 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
16.10 Мэлядрама «Мой ласкавы і пяшчотны зьвер».
18.10 «Сканэр».
18.20 Камэдыйны баявік «Сьмяротная сутычка». ЗША, 1993 г.
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
22.10 Выпускны вечар «Фабрыкі зорак-2». Канцэрт у «Алімпійскім».
0.45 Дэтэктыў «Рэчавы доказ». ЗША.

● РТР
7.55 Прэм'ера. «Вялікае цыркавое прадстаўленьне ў Маскоўскім цырку на Цьвятным бульвары».
8.55 Прэм'ера. Камэдыя «Тартарэн з Тараскону». 2003 г.
17.30, 19.25 Бэнэфіс групы «Экс-ББ».
19.00 Весткі.
20.15 Мастацкі фільм «Брат». 1997 г.
22.15 Мастацкі фільм «Брат-2». 2000 г.

● Культура
15.35 «Аповед пра «Эмпайр стэйт білдынг». Дак. фільм.
16.25 «Віні-Пух». «Віні-Пух ідзе ў госьці», «Віні-Пух і Дзень турбот». Мультфільмы.
17.05 «Пашпарт». Маст. фільм.
18.45 Праграма «Клясыка летнім вечарам».
20.25 «Лінія жыцьця».
21.20 «Расьціньяк». Тэлесэрыял.
23.10 «Пад гітару». Група «Чайф».

● НТВ
9.25 Камэдыя «Стары знаёмы».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня».
14.05 Свая гульня.
15.20 Дэтэктыў «Сышчыкі», 1-я і 2-я сэрыі.
18.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўым.
18.35 «Зусім сакрэтна. Дысыдэнты».
19.35 Залатая калекцыя. Баявік «Гульня ў сьмерць» (ЗША).
21.30 Супэрбокс. Эрык Маралес супраць Ід Гі Чы.
22.45 Камэдыя «Калі ўсе свае».

● Эўраспорт
9.30 Горны вэлясыпэд.
10.30 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Італія—Калюмбія. Паўтор.
12.30 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Кітай—Польшча. Паўтор.
13.30 Лёгкая атлетыка. Острава. Паўтор.
15.00 Тэніс. АТР. Першынство Лёнданскага каралеўскага клюбу. Чвэрцьфінал. Жывая трансьляцыя.
18.00 Футбол. Эўра-2004. Адборачныя матчы. Паўтор.
19.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Жывая трансьляцыя. Японія—Турцыя.
21.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Жывая трансьляцыя. Аргентына—Англія.
22.45 «Формула». Мотаспартовы часопіс.
23.15, 1.45 Ралі Акропаліс. Агляд.
0.15 Ралі Рэйд. Марока.
0.45 Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле Ману.
2.15 «Сэрыі». Аўтаспартыўны часопіс.

14 чэрвеня субота

● БТ
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.30 Экран індыйскага кіно. «Здрада». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.35 «Сьпявай, душа!». Сьвята Ўзьнясеньня Гасподняга ў Гарадзенскім раёне.
12.15 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжа дылетанта. «...І падняўся з папялішча Мазыр».
13.00 Сола для дэбютанта. Павал Адамчыкаў (рэжысэр).
13.10 Плянэта АРТ.
13.35 «Ёсьць толькі міг...». Алег Караваеў.
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 «Піраты XXI стагодзьдзя». Відэафільм АТН.
15.35 Сусьветная калекцыя кароткамэтражных фільмаў. «Высяленьне».
15.55 Гандбол. Чэмпіянат сьвету. Плэй-оф. Мужчыны. Беларусь—Харватыя. Жывая трансьляцыя.
17.35 «Тэатар. Выбранае». VIII Міжнародны фэстываль «Славянскія тэатральныя сустрэчы» (г.Гомель). 1-я частка.
18.00 КВК. 1/4 фіналу Эўралігі.
19.35 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
20.00 Прыгодніцкі фільм «Летняя ноч у Дэйзі Таўн» (Італія).
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Баявік «Шасьціструнны самурай». (ЗША).
23.15 Начны музычны этэр.

● СТВ
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00, 16.05 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.25, 19.55 «СТВ-спорт».
8.35 «Рэактыўны бокс».
8.50 «Сьвецкая хроніка».
9.00 «Плянэта людзей».
9.20 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.45 «Кіно — дзецям»: музычная камэдыя «Прыгоды Бураціна», 1-я сэрыя. БССР, 1975.
11.00 «Разам».
11.30 «Рамонт».
11.45, 20.15 Кіно: тэлесэрыял «Варыянт «Амэга». СССР, 1975.
13.05 Кіно: дэтэктыў «Гаспадар тайгі». СССР, 1968.
14.55 «Дружная сямейка». Сэрыял.
16.30 «Усё для цябе».
17.05 «Кіно»: камэдыя «Разява».
19.30 «24 гадзіны».
21.40 Кіно: баявік «Цягнік сьмерці». ЗША, 2001.
23.15 «Навіны СНД».
23.30 Кіно: маст. фільм «Бяжы, Лола, бяжы!».

● Першы музычны канал
8.00, 12.30 Рухач.
12.00 «Сіла цягі».
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ
8.00 Навіны.
8.10 «Ералаш».
8.20 Грай, гамонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 Крэмль-9. «Полк спэцыяльнага прызначэньня».
11.10 Тайны забытых перамог. «Зброя перамогі. Іл-2».
11.40 Сьмехапанарама.
12.20 «Падарожжы натураліста».
12.50 «Каб памяталі...».
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.10 «Расейская рулетка».
15.00 Выратавальнікі. Тэрміновы выклік.
15.30 Канцэрт Надзеі Кадышавай і групы «Залаты пярсьцёнак».
16.45 Жывая прырода. «Прагулкі з дыназаўрамі», «На ўсе рукі майстар».
17.45 Фільм «Расейскі бунт». Расея, 2000 г.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
22.00 Прэм'ера. Баявік «Вяртаньне ўнівэрсальнага салдата». ЗША, 1999 г.
23.35 Першая нацыянальная музычная прэмія.

● РТР
8.45 «Ранішняя пошта».
9.20 «Сто да аднаго». Тэлегульня.
10.15 «Сам сабе рэжысэр».
11.15 «У пошуках прыгод».
12.10 «Клюб сэнатараў».
13.00 Весткі.
13.20 Да дня мэдыцынскага работніка. Маст. фільм «Шчасьлівая, Жэнька!». 1984 г.
15.00 Прэмія «Оскар». Мэлядрама «Крамэр супраць Крамэра» (ЗША). 1979 г.
17.00 «Мая сям'я».
18.00 «Аншляг».
19.00 Весткі.
19.25 «Люстра».
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.15 Прэм'ера. «Кубак гумару-2003». «Вясёлы канцэрт».
21.40 Маст. фільм «Зайздрасьць багоў». 2000 г.

● ● Культура
11.15 ГЭГ.
11.30 «Графаман».
12.00 Дзіцячы сэанс. «Пасьля дождджычку ў чацьвер...». Маст. фільм.
13.30 «Старадаўні Эгіпэт». Фільм 2-і. «Зямля адроджаная».
13.55 Дзень памяці А.Астроўскага. Прэм'ера тэлевэрсіі спэктаклю Малога тэатру «Ваўкі і авечкі».
17.05 Магія кіно.
17.30 «У вашым доме».
18.10 «Сфэры».
18.55 «Прывітаньне, артыст». Маст. фільм.
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Расьціньяк». Тэлесэрыял.
22.50 Трыюмф джазу.
23.45 «Экспэрымэнт». Мультфільм для дарослых.

● НТВ
9.05 «Кулінарны паядынак».
10.00 «Кватэрнае пытаньне».
10.50 Спорт. «Лято 6 з 49».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня».
11.15 «Паляўнічы колеру танжэр». Прафэсія — рэпарцёр.
11.40 «Служба выратаваньня».
12.10 Камэдыя «Бляндынка за рогам».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.00 Мэлядрама «Ёсьць пра што пагутарыць» (ЗША).
18.00 «Зусім сакрэтна. Міністэрства аховы здароўя папярэджвае».
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Пеця і Вол».
20.00 «Асабісты ўнёсак».
21.00 Прэм'ера. Баявік «Не абмяркоўваецца».
23.00 «Усё адразу!».

● Эўраспорт
9.30 Ралі Рэйд. Марока. Паўтор.
10.00, 13.15, 16.15, 19.00, 21.15, 22.30, 0.00, 1.30 Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле Ману.
11.15 Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле Ману. Легенды.
12.15 Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле Ману. Паўтор.
13.45, 1.45 Матагонкі. Каталёнія. Агляд.
18.00 Тэніс. АТР. Першынство Лёнданскага каралеўскага клюбу. Паўфінал. Жывая трансьляцыя.
19.30 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Жывая трансьляцыя. Польшча—Мэксыка.
21.30 Баявыя адзінаборствы.
23.30 Экстрэмальныя віды спорту.
0.30 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Жывая трансьляцыя. Італія—Кітай.

15 чэрвеня нядзеля

● БТ
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал.
9.00 Слова Мітрапаліта Філарэта на сьвята Тройцы.
9.10 Альхімія слова.
9.15 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.45 Экран індыйскага кіно. «Здрада». 2-я сэрыя.
11.20 Сад мары.
11.45 Музэюм. «Гістарычны партрэт Вялікага Княства Літоўскага».
12.15 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лято».
13.40 Сьвятыні Беларусі. «Сьвята-Мікалаеўскі храм у Магілёве».
14.10 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 Лёс чалавека.
15.40 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
16.35 Маст. фільм «Мэлядрама з замахам» (Украіна).
17.45 «Тэатар. Выбранае». VIII Міжнародны фэстываль «Славянскія тэатральныя сустрэчы» (г.Гомель). 2-я частка.
18.10 Кліп-абойма.
18.55 Крымінальная камэдыя «Як жывецца, Карасі?» (Расея).
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.10 Трылер «Небясьпечная гульня» (ЗША).

● СТВ
7.30, 16.25 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.25 «СТВ-спорт».
8.40 «Філярманічны тыдзень».
8.45 «Менск і менчукі».
8.50 «Партрэт у інтэр'еры».
9.05 «Добры дзень, доктар!».
9.20, 19.30 «Аўтапанарама».
9.45 «Кіно — дзецям»: камэдыя «Прыгоды Бураціна», 2-я сэрыя. БССР, 1975.
11.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
11.25 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.45, 20.50 Кіно: тэлесэрыял «Варыянт «Амэга». СССР, 1975.
13.05 Кіно: крымінальная камэдыя «Гангстэры і падгузкі».
15.20 «Дружная сямейка». Сэрыял.
17.00 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
17.30 «Мэтафізыка Пецярбургу». Тэлефільм.
18.30 «168 гадзін».
19.15 «Запрашаем паскардзіцца».
19.50 «Пакуль гарыць сьвечка...».
20.10 «Асабісты інтэрас».
22.10 «Турпаход».
22.20 «Навіны СНД».
22.35 Кіно: драма «Ўол-Стрыт». ЗША, 1987.

● Першы музычны канал
8.00, 13.45 Рухач.
12.00 «Чарнасьліў».
13.00 «Пра Fashion».
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 «Ералаш».
8.30 Армейскі магазын.
8.55 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Юкі адкрывае Дыснэйленд».
10.15 «Падарожныя нататкі».
10.35 Пакуль усе дома.
11.15 Прэм'ера. «Зыта і Гіта. Сіямскія блізьняты». Дак. фільм.
11.45 Дог-шоў.
12.25 «Клюб падарожнікаў».
13.05 Разумніцы й разумнікі.
13.35 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.10 «Валадар смаку».
15.00 Ток-шоў «Выбар».
15.40 Маст. фільм «Масква сьлязам ня верыць». 1-я і 2-я сэрыя.
18.15 КВК-2003. Найвышэйшая ліга.
20.30 Контуры.
21.10 Нікалас Кейдж і Джон Малкавіч у баевіку «Паветраная турма».
23.15 Часы.
0.15 Гала-канцэрт «Балтыйская зорка».

● РТР
9.15 «Гарадок».
9.45 Прыгодніцкі фільм «Вялікія гонкі» (ЗША). 1965 г.
12.10 «Парлямэнцкі час».
13.00 Весткі.
13.20 «Вакол сьвету».
14.15 «Дыялёгі пра жывёл».
15.15 «Сьвет на мяжы».
15.45 «Пакой сьмеху».
16.40 Прэм'ера. Піліп Кіркораў: «Найлепшыя песьні».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 «Спэцыяльны карэспандэнт».
21.00 Чэмпіянат сьвету па аўтагонках у клясе «Формула-1». Гран-пры Канады. Трансьляцыя з Манрэалю.

● Культура
11.10 «Рыцары сьмеху». «Са сцэны — на экран».
11.35 Нядоўгія гісторыі.
11.50 Дзіцячы сэанс. «Маўглі», «Містэр Пронька». Мультфільмы.
13.25 «Старадаўні Эгіпэт». Фільм 3-і. «Зямля вечная».
13.55 «Час музыкі». Тэлечасопіс.
14.20 Баварскі Дзяржаўны балет.
15.15 Дзень памяці Рыгора Горына. Дом актора. «Горын. Сябры. Пра сяброў».
15.55 Р.Горын. «Кін IV». Тэлевэрсія спэтаклю Тэатру імя У.Маякоўскага.
18.50 Ізноў пласьцінка пяе.
19.15 «Болей чым каханьне».
19.55 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял.
20.20 «Культ кіно». «Рукапіс, знойдзены ў Сарагосе». Маст. фільм (Польшча, 1965).
23.25 «Джазафрэнія».

● НТВ
9.10 Сэрыял у нядзелі. «Каханьне ўдаўца», 11-я сэрыя (ЗША).
10.05 «Вы будзеце сьмяяцца!».
10.15 «Расьліннае жыцьцё».
10.50 Граем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня».
11.15 «Уплыў».
12.05 Да Дня мэдыцынскага работніка. Маст. фільм «Няскончаная аповесьць».
14.05 Свая гульня.
15.20 Экстрэмальны кантакт. «Рыба-парусьнік».
15.45 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.55 Камэдыя «Вялікая няня» (ЗША).
18.50 Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Тры дні да этэру».
20.00 «Надоечы» зь Леанідам Парфёнавым.
21.30 Фільм тыдня. Прэм'ера. Крымінальны фільм «Дарога».
23.25 Сэрыял «Клан Сапрана» (ЗША).

● Эўраспорт
19.30 Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле Ману. Жывая трансьляцыя.
11.00 Матагонкі. Каталёнія. Агляд.
16.15 Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле Ману.
17.30 Тэніс. АТР. Першынство Лёнданскага каралеўскага клюбу. Фінал. Жывая трансьляцыя.
19.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Жывая трансьляцыя. Англія—Турцыя.
21.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Жывая трансьляцыя. Аргентына—Партугалія.
22.45 Аўтагонкі сэрыі КАРТ. Мантэрэй.
23.30 Аўтагонкі сэрыі Наскар.
0.30 Супэрбайк. Спэцагляд.
0.45 Супэрспорт. Спэцагляд.
1.00 Супэрбайк. Вялікабрытанія. Спэцагляд.

Народзіны Макартні

18 чэрвеня ў клюбе «Алькатрас» адбудзецца сольны выступ «Крамы». Гурт будзе граць старыя гіты і другі раз прэзэнтаваць альбом «Хавайся ў бульбу» з нагоды яго перавыданьня. Яшчэ выступіць «Плян» з Андрэем Плясанавым на чале: зайграе праграму «Блюз у канцы тунэлю» на вершы беларускіх паэтаў. Вечарына будзе прысьвечаная дню народзінаў Пола Макартні, таму ягоныя песьні таксама прагучаць. На жаль, не ў арыгінальным выкананьні. Пачатак у 19.00. Цана квітка — 7000 руб.

Сяргей Будкін

УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

Канцэрт даўняе музыкі

15 чэрвеня а 16-й у Менскім касьцёле Сьв.Роха (пр.Скарыны, 44а) адбудзецца прэзэнтацыя новага супольнага праекту Арыны Вячоркі і Музычнага таварыства «Ліра» «Старадаўняя музыка Беларусі». У канцэрце возьмуць удзел ансамблі «Lituus» (былы «Кантрадансе», Баранавічы), «Brevis» (Менск), салістка опэры Тамара Рэмез (сапрана) і Віктар Кісьцень, арганіст касьцёлу Сьв.Роха. Прагучаць у розных выкананьнях фрагмэнты «Полацкага сшытку», «Віленскай табулятуры», творы Вайцеха Длугарая, старадаўнія канты і Псальмы Сімяона Полацкага. Уваход вольны.

ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

16 чэрвеня панядзелак

● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10 «У царстве бакланаў і чапляў». Дак. фільм.
8.50 Выпускны экзамэн па беларускай і расейскай мовах за курс сярэдняй школы ў агульнаадукацыйных установах.
9.10, 17.05 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.10 Плянэта АРТ.
10.35 Кліп-абойма.
11.15, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15 Панарама: падзеі тыдня.
13.05 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
13.20 «Дзяржаўная мяжа». Сэрыял. Фільм 3-і «Усходні рубеж» («Беларусьфільм»). 1-я сэрыя.
14.35 «Сцэнары мастацтва». Дак. сэрыял.
15.20 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
15.45 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
16.10 Мультыклюб.
16.50 5 цудаў.
18.15 «Жывы тавар. Стоп: трафік!». Відэафільм АТН.
18.35 З дакладных крыніц.
18.50 Камэдыя «Эйр Амэрыка».
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Начная размова.

● СТВ

6.00 «Менск і менчукі».
6.10 «Турпаход».
6.20, 23.00 «Тэхналёгія».
6.30 «168 гадзін».
7.20 «Асабісты інтэрас».
16.00, 19.30, 22.40 «24 гадзіны».
16.15 Кіно: кінараман «Вечны покліч», 10-я сэрыя.
17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.05 «Партрэт у інтэр'еры».
18.20 «Арт-экспрэс». Культурнае жыццё сталіцы.
18.35 «Клетка». Тэлесэрыял.
19.55 «СТВ-спорт».
20.15 «Гульнявы рэфлекс».
20.30 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Неймаверныя прыгоды дона Вінчэнці ў Аўстраліі». Італія, 1977.
23.10 «Навіны СНД».
23.25 «Сталічны футбол з Іванам Савосьцікавым». Спартыўная праграма.
23.50 Кіно: фільм жахаў «Дагон крыважэрны».

● Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
9.00, 22.00 «120/80».
9.10, 16.00 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 18.45, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
18.00 «Пра Fashion».
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.45 Нашы навіны.
8.05 Гала-канцэрт «Балтыйская зорка».
9.05 Контуры.
9.45 Баявік «Паветраная турма». ЗША.

Тэхнічная прафіляктыка па Менску і Менскай вобласьці з 9.45 да 16.55.

15.55 Жывая прырода. «Прагулка з дыназаўрамі», «На ўсе рукі майстар».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Лубянка. «Замах на Ціта».
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.00 Ток-шоў «Выбар».
21.45 Шматсэрыйны фільм «Пяты вугал».
23.00 Прэм'ера. Дак. фільм «Асабістае жыцьцё Валянціны Церашковай». 1-я сэрыя.
23.40 Камэдыя «Пан Памылка». ЗША.

● РТР

7.45 Камэдыя «З Новым годам!».
9.30 «Экспэртыза».
9.35, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00, 22.00 Весткі.
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
19.55 Тэлесэрыял «Галоўныя ролі».
20.55 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Забойства на Нягліннай». 1-я сэрыя.
22.20 Вячэрні сэанс. Прэм'ера. Баявік «Камандзір узводу» (ЗША). 1988 г.

● Культура

17.30 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 Улада факту.
18.25 «Містыка лёсу». «Уяўленьне Паўла I».
18.55 Э.Грыг. «Лірычныя п'есы».
19.40 «Эндзі Пэндзі». Мультсэрыял.
19.55 «Страснае і спачувальнае сузіраньне». Тэлеспэктакль.
21.25 «Тым часам».
22.05 Ток-шоў «Школа зласловя».
23.00 Навіны культуры.
23.25 «Начны палёт».

● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Надоечы».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 «Жаночы погляд».
17.10 «Увага. Вышук!».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.15 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў».
19.45 Сэрыял «Дальнабойнікі. Лебядзянь», 8-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет». Галоўныя падзеі дня.
21.30 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе».

● Эўраспорт

9.30 Ралі Рэйд. Марока. Паўтор.
10.00 Матагонкі. Каталёнія. Агляд. Паўтор.
11.30 Ралі Акропаліс. Агляд. Паўтор.
12.30 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Англія—Турцыя. Паўтор.
13.30 Футбол. Агляд.
14.00 Тэніс. Турнір АТР. Першы дзень. Хэртагенбош. Жывая трансьляцыя.
15.30 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Польшча—Мэксыка. Паўтор.
16.30 Футбол. Аргентынскія легенды Кубку сьвету. Паўтор.
18.30 Эўрагалы. Футбольны часопіс.
19.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Буркіна Фасо—Мэксыка. Жывая трансьляцыя.
21.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Калюмбія—Польшча. Жывая трансьляцыя.
22.45 Бокс. ТВА.
0.15 Самы моцны чалавек. Перадача з Гішпаніі. Паўтор.
1.15 Матагонкі. Каталёнія. Агляд.

17 чэрвеня аўторак

● БТ

6.00, 7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.00, 18.15 «Золата Югры». Сэрыял. Заключная сэрыя.
8.50 Выпускны экзамэн па матэматыцы за курс базавай школы ў агульнаадукацыйных установах.
9.10, 17.15 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.05 Існасьць. Духоўная праграма.
10.35 «Ёсьць толькі міг...».
11.00 З дакладных крыніц.
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.20 Добры дзень, Беларусь!
13.05 «Дзяржаўная мяжа». Сэрыял. Фільм 3-і «Усходні рубеж» («Беларусьфільм»). 2-я сэрыя.
14.35 «Сцэнары мастацтва». Дак. сэрыял.
15.15 «Далікатны ўзрост». Сэрыял.
15.40 «Мурашка-хвалько», «Казьлянятка». Мультфільмы.
16.10 Прыгодніцкі фільм «Апошняе лета дзяцінства» («Беларусьфільм»). Заключная сэрыя.
19.05 Гістарычны фільм «Царазабойца».
20.50 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Начны этэр.

● СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.10 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.10, 22.30 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: камэдыя «Неймаверныя прыгоды дона Вінчэнці ў Аўстраліі». Італія, 1977.
10.15 «Гульнявы рэфлекс».
10.25 «Сталічны футбол з Іванам Савосьцікавым». Спартыўная праграма.
10.50 «Пакуль гарыць сьвечка».
11.15, 12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Клетка». Тэлесэрыял.
14.45 Мультфільм.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.15 Кіно: «Вечны покліч».
18.05 «Добры дзень, доктар!».
18.20 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
20.10 «Запрашаем паскардзіцца...».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.30 «Закон і крымінал».
20.50 Кіно: мэлядрама «Муж сабакі Баскервіляў». СССР, 1990.
22.40 «Навіны СНД».
23.00 Праект «Адлюстраваньне»: «Япі». Дак. фільм.
23.45 Кіно: драма «Д'яблы».

● Першы музычны канал

7.00, 9.10 Рухач.
9.00 «120/80».
14.00 «ІнтэрАктыў».
16.00 «20-ка Першых».
17.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.05 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Маст. фільм «Сэрцы трох». 1-я сэрыя.
10.45 «Жарт за жартам».
11.15 Дыснэй-клюб: «Лойд у космасе».
16.10 Камэдыя «Фаталісты». 1-я сэрыя.
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Каралі сьмеху». Юры Нікулін.
20.00 Час.
21.00 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
22.05 Шматсэрыйны фільм «Пяты вугал».
23.20 Прэм'ера. Дак. фільм «Асабістае жыцьцё Валянціны Церашковай». 2-я сэрыя.
0.00 «На футболе» зь Віктарам Гусевым.
0.30 «Расейскі экстрым».

● РТР

7.45, 19.55 Тэлесэрыял «Галоўныя ролі».
8.40, 20.55 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Забойства на Нягліннай».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00, 22.00 Весткі.
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
22.20 Вячэрні сэанс. Дэтэктыў «Пытаньні і адказы» (ЗША).

● Культура

15.20 «Уладзімер Горавіц іграе Моцарта». Фільм-канцэрт.
16.10 «Клясыкі сучаснага мастацтва».
16.35 «Плянэты». Дак. сэрыял. 2-я сэрыя. «Цьвёрдая зямля».
17.30 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 «Палацавыя тайны». «Таямнічы мсье Філіп».
18.25 «Містыка лёсу». «Медны вершнік: гісторыя і міт».
18.50 «Партытуры не гараць».
19.20 «Шляпа». Маст. фільм.
20.50 «Што рабіць?».
21.45 100 гадоў з дня нараджэньня Міхаіла Сьвятлова. «Прыгожае імя, высокі гонар».
22.30 Навіны культуры.
22.55 XIV Адкрыты расейскі кінафэстываль «Кінатаўр». Трансьляцыя з г.Сочы.

● НТВ

14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога».
17.25 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.15 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў».
19.45 Сэрыял «Дальнабойнікі. Дым у лесе», 9-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет». Галоўныя падзеі дня.
21.30 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе».

● Эўраспорт

9.30 Ралі Акропаліс. Агляд. Паўтор.
10.30 Горны вэлясыпэд. Паўтор.
11.00 Пляжны валейбол. Сусьветнае турнэ. Фінал. Жанчыны. Грэцыя.
12.00 Эўрагалы. Футбольны часопіс. Паўтор.
12.30 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Буркіна Фасо—Мэксыка. Паўтор.
14.00 Тэніс. Турнір АТР. Другі дзень. Хертагенбош. Жывая трансьляцыя.
15.30, 22.45 Бокс. Паўтор.
17.00 Футбол. Легенды Кубку сьвету. Нямеччына. Паўтор.
19.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Японія—Партугалія. Жывая трансьляцыя.
21.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Аргентына—Турцыя. Жывая трансьляцыя.
1.15 Трыял на матацыклах.
1.45 Сэрыі. Аўтаспартыўны часопіс. Паўтор.

18 чэрвеня серада

● БТ

6.00, 7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.00 «Золата Югры». Сэрыял. Заключная сэрыя.
8.50 Выпускны экзамэн па фізыцы за курс сярэдняй школы ў агульнаадукацыйных установах.
9.10, 17.15 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.00 «Сьпявай, душа!». Сьвята Ўзьнясеньня Гасподняга ў Гарадзенскім раёне.
10.25 Здароўе.
10.55 Сола для дэбютанта. Максім Трылецкі (графік).
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.15 Добры дзень, Беларусь!
13.05 «Дзяржаўная мяжа». Сэрыял. Фільм 4-ы «Чырвоны пясок» («Беларусьфільм»). 1-я сэрыя.
14.45 «Масква — Менск».
15.15 «Далікатны ўзрост». Сэрыял.
15.50 Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі. «Як Васіль гаспадарыў», «Хапун». Мультфільмы («Беларусьфільм»).
16.10 «Руіны страляюць...». Сэрыял («Беларусьфільм»). 1-я сэрыя.
18.25 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Менск) — «Тарпэда» (Жодзіна). Жывая трансьляцыя.
20.30 Сусьветная калекцыя кароткамэтражных фільмаў. «Паветраны шарык» (ЗША).
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Начны этэр.

● СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.20 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05 «Менск і менчукі».
8.10, 22.40 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: мэлядрама «Муж сабакі Баскервіляў». СССР, 1990.
9.30 «Мэтафізыка Пецярбургу». Тэлевізійны фільм. Частка 1-я: «Вэктар лёсу».
10.00 «Запрашаем паскардзіцца».
10.15, 23.05 Праект «Адлюстраваньне»: «Ведзьмы». Дак. фільм.
11.00, 20.30 «Аўтапанарама».
11.15 «Закон і крымінал».
11.30 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Клетка». Тэлесэрыял.
14.45 Мультфільм.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.15 Кіно: кінараман «Вечны покліч», 12-я сэрыя.
18.05 «Плянэта людзей».
18.20 «Бацюшка». Дак. фільм цыклу «Агульны дом».
20.10 «Турпаход».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: баявік «Перахопнік». ЗША, 1992.
22.50 «Навіны СНД».
23.50 «Ілюзіён»: камэдыя «Жанчына году». ЗША, 1942.

● Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
9.10, 16.00 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «Пра Fashion».
23.15, 1.00 МэгаМікс.
0.00 «Чарнасьліў».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.05 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Маст. фільм «Сэрцы трох». 2-я сэрыя.
10.45 Дак. фільм «Грэнада Міхаіла Сьвятлова».
11.15 Дыснэй-клюб: «Лойд у космасе».
16.05 Камэдыя «Фаталісты». 2-я сэрыя.
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Дак. дэтэктыў «Гонка па сустрэчнай паласе».
18.35 Сьмехапанарама.
20.00 Час.
21.00 «Слабае зьвяно».
22.05 Маст. фільм «Пяты вугал».
23.20 Прэм'ера. Дак. фільм «Агент, якому верыў Сталін».
0.00 Дэтэктыў «Калабок».

● РТР

7.45, 19.55 Тэлесэрыял «Галоўныя ролі».
8.40 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Забойства на Нягліннай».
9.40 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00, 22.00 Весткі.
16.20 Футбол. Чэмпіянат Расеі. «Дынама» (Масква) — «Чарнаморац» (Новарасійск). Жывая трансьляцыя з стадыёну «Дынама».
18.05 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
20.55 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Забіць крумкача».
22.20 Вячэрні сэанс. Маст. фільм «Снайпэр». 1992 г.

● Культура

15.10 «Партрэт». Хасэ Карэрас.
16.05 «Арт-панарама».
16.35 «Вайна стагодзьдзя». Дак. фільм (Вялікабрытанія). 1-я сэрыя. «Вялікія надзеі».
17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 «Айчына і лёсы». «Чараўнік сцэны Міхаіл Фокін».
18.25 «Містыка лёсу». «Кумір у фатэлі».
18.55 «Збор выкананьняў». Ф.Шапэн. 24 прэлюдыі.
19.40 «Эндзі Пэндзі». Мультсэрыял.
19.45 «Тайны расейскай зброі». «Т-34. Легенды і міты».
20.10 «Дым Айчыны». Маст. фільм.
21.40 «Апокрыф». Ток-шоў.
22.20 «Астравы».
23.25 «Начны палёт».

● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
10.00 «Кулінарны паядынак».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога».
17.25 «Шчырае прызнаньне».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.15 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў».
19.45 Сэрыял «Дальнабойнікі. Лёха», 10-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет». Галоўныя падзеі дня.
21.30 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе».

● Эўраспорт

9.30 Горны вэлясыпэд.
10.00 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.
11.00, 15.30 Футбол. Легенды Кубку сьвету. Францыя. Паўтор.
12.00 Футбол. Легенды Кубку сьвету. Італія. Паўтор.
13.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Аргентына—Турцыя. Паўтор.
14.00 Тэніс. Турнір АТР. Трэці дзень. Хертагенбош. Жывая трансьляцыя.
16.30 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Калюмбія—Мэксыка. Жывая трансьляцыя.
18.15 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Спэцагляд.
19.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Італія—Польшча. Жывая трансьляцыя.
20.45 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Новая Зэляндыя—Японія.
21.45 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Францыя—Калюмбія. Жывая трансьляцыя.
0.15 Конны спорт. Кубак нацый. Познань.
1.15 Гольф. Кемпэр Оўпэн. Спэцагляд.
2.15 Ветразевы спорт.

19 чэрвеня чацьвер

● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10 «Адна ноч». Кароткамэтражны маст. фільм.
9.10, 17.15 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.05 Сьвятыні Беларусі. «Сьвята-Мікалаеўскі храм у Магілёве».
10.30 Лёс чалавека. «Жанчына з Каранам».
10.55 Музэюм. «Гістарычны партрэт Вялікага Княства Літоўскага».
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.20 Добры дзень, Беларусь!
13.05 «Дзяржаўная мяжа». Сэрыял. Фільм 4-ы «Чырвоны пясок». 2-я сэрыя.
14.35 «Сцэнары мастацтва». Дак. сэрыял.
15.15 «Далікатны ўзрост». Сэрыял.
15.50 Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі. «Казкі-небыліцы дзеда Ягора», «Хлеб». Мультфільмы.
16.10 «Руіны страляюць...». Сэрыял («Беларусьфільм»). 2-я сэрыя.
18.15 Сэрыял «Агенцтва НЛС». 1-я сэрыя.
19.10 Драма «Ціхая застава» («Малдовафільм»).
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Начны этэр.

● СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Тэма дня».
8.10, 22.50 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: баявік «Перахопнік». ЗША, 1992.
9.45 «Мэтафізыка Пецярбургу». Тэлевізійны фільм. Частка 2-я: «Неўская Александрыя».
10.20, 20.10 «Турпаход».
10.30 «Гэты стары новы цырк». Дак. фільм.
11.00 «Партрэт у інтэр'еры».
11.15 «Фільм, фільм, фільм».
11.30 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Клетка». Тэлесэрыял.
14.45 Мультфільм.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.20 Кіно: «Вечны покліч», 13-я сэрыя.
18.05 «Тэатральныя гісторыі».
18.20 «Рамонт».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.30 «Фільм, фільм, фільм».
20.50 Кіно: баявік «Замкнёнае кола». ЗША, 2001.
23.00 «Навіны СНД».
23.15 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
23.50 Кіно: камэдыя «Амаль цяжарная». ЗША, 1991.

● Першы музычны канал

7.00, 9.10, 16.00 Рухач.
9.00 «120/80».
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.30 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.00 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 «Сэрцы трох». 3-я сэрыя.
10.45 Сьмехапанарама.
11.15 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
16.05 Камэдыя «Фаталісты». 3-я сэрыя.
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Сканэр».
18.20 Дак. дэтэктыў «Бяз тэрміну даўнасьці». «Сьмерць у растэрміноўку».
20.00 Час.
21.00 «Ня толькі пра футбол».
21.25 «Асноўны інстынкт». Ток-шоў.
22.30 Сэрыял «Пяты вугал».
23.45 Трылер «Перавал Мілера». ЗША.

● РТР

7.45, 19.55 Тэлесэрыял «Галоўныя ролі».
8.40, 20.55 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Забіць крумкача».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00, 22.00 Весткі.
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
22.20 Вячэрні сэанс. Драма «Вінаваты праз падазрэньне» (ЗША).

● Культура

15.10 «Партрэт».
16.10 «Пецярбург: Час і месца». «Цэнтральны вайскова-марскі музэй».
16.40 «Вайна стагодзьдзя». Дак. фільм. 2-я сэрыя. «Віток тэрору».
17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 «Хто мы?». «Хроніка смутнага часу». Перадача 9-я.
18.25 «Містыка лёсу». «Уяўленьне Ўладзімера Набокава».
18.55 Білет у Вялікі.
19.35 «Эндзі Пэндзі». Мультсэрыял.
19.40 «Тайны расейскай зброі». «Ад «калаша» да «абакана».
20.10 «Дзямідавы». Маст. фільм. 1-я сэрыя.
21.25 «Культурная рэвалюцыя».
22.20 «Эпізоды».
23.25 «Начны палёт».

● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Шчырае прызнаньне».
10.00 «Кватэрнае пытаньне».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога».
17.25 «Вочная стаўка».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.15 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў».
19.45 Сэрыял «Дальнабойнікі. Уцёкі», 11-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет». Галоўныя падзеі дня.
21.30 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе».

● Эўраспорт

9.30 Ветразевы спорт. Паўтор.
10.00 Конны спорт. Кубак нацый. Познань. Паўтор.
11.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Італія—Польшча. Паўтор.
12.30 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Францыя—Калюмбія. Паўтор.
14.00 Тэніс. Турнір АТР. Чвэрць фіналу. Хертагенбош. Жывая трансьляцыя.
15.30 Бокс. Паўтор.
16.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Партугалія—Турцыя. Жывая трансьляцыя.
18.15 Футбол. Фэстываль моладзі. Тулён. Англія—Японія. Жывая трансьляцыя.
20.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Турцыя—ЗША. Жывая трансьляцыя.
22.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Бразылія—Камэрун. Жывая трансьляцыя.
0.00 Футбол. Кубок Лібэртадорэс. Паўфінал. Другі матч.
1.45 Ралі. Кіпр.

20 чэрвеня пятніца

● БТ
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10 Сэрыял «Агенцтва НЛС».
9.10, 17.15 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.05 Сад мары.
10.30 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.55 Падарожжа дылетанта. «...І ўзьняўся з попелу Мазыр».
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.15 Добры дзень, Беларусь!
13.05 «Дзяржаўная мяжа». Сэрыял. Фільм 5-ы «Год 41-ы» («Беларусьфільм»). 1-я сэрыя.
14.35 «Сцэнары мастацтва». Дак. сэрыял.
15.15 «Далікатны ўзрост». Сэрыял.
15.50 Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі. «Непаседа», «Дыназаўрык», «Дзед і жораў». Мультфільмы.
16.15 «Руіны страляюць...». Сэрыял («Беларусьфільм»). 3-я сэрыя.
18.15 Маст. фільм «Дзікія зьвяры сьвету» («Беларусьфільм»).
18.40 Драма «Паўночная зорка» (Францыя).
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Маст. фільм «Малы д'ябал».

● СТВ
6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05 «Менск і менчукі».
8.10, 22.50 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: баявік «Замкнёнае кола». ЗША, 2001.
10.00 «Турпаход».
10.10, 23.15 Праект «Адлюстраваньне»: «Палата №6». Дак. фільм.
11.00, 20.30 «Аўтапанарама».
11.15 «Тэатральныя гісторыі».
11.30 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Клетка». Тэлесэрыял.
14.45 Мультфільм.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.15 Кіно: «Вечны покліч», 14-я сэрыя.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.20 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Рэактыўны бокс».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Мае самыя шчасьлівыя сьвітанкі».
23.00 «Навіны СНД».
0.00 Кіно: камэдыя «Хлопчыкі-дзяўчынкі». ЗША, 2001.

● Першы музычны канал
7.00 «Пад'ёмнік».
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «V.I.P.онія».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
23.30 МэгаМікс.

● АНТ
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.05 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 «Ня толькі пра футбол».
10.10 «Сэрцы трох». 4-я сэрыя.
10.40 Сэрыял «Твінісы».
11.00 Прэс-канфэрэнцыя прэзыдэнта Расеі У.У.Пуціна.
13.00 Крылы. «Найвышэйшы пілятаж».
16.00 Камэдыя «Фаталісты».4-я сэрыя (заключная).
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Самі з вусамі».
18.35 «Жарт за жартам».
20.00 Час.
21.00 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
22.05 Шматсэрыйны фільм «Пяты вугал».
23.20 Адкрыцьцё XXV Маскоўскага міжнароднага кінафэстывалю.
0.00 Маст. фільм «Інтэрвію з вампірам» (ЗША).

● РТР
7.45 Тэлесэрыял «Галоўныя ролі».
8.40, 19.55 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Забіць крумкача».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 13.00, 19.00 Весткі.
10.20 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў Фёдара Паўла-Андрэевіча.
11.00 Прэс-канфэрэнцыя прэзыдэнта РФ У.У.Пуціна для расейскіх і замежных журналістаў.
12.30 Мусульмане.
12.45 Весткі—Масква.
13.20 Прыгодніцкі фільм «Мяцеж на «Баўнці» (ЗША). 1962 г.
14.10 Тэлесэрыял «Маскоўскія вокны».
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
22.00 Сустрэча У.Пуціна з удзельнікамі конкурсу «Мой дом. Мой горад. Мая Краіна».
22.45 Вячэрні сэанс. Фантастычны фільм «Яны жывыя» (ЗША). 1988 г.

● Культура
15.10 «Партрэт».
16.05 «Са столі».
16.35 «Вайна стагодзьдзя». Дак. фільм. 3-я сэрыя. «Вучымся перамагаць».
17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 «Хто мы?». «Хроніка смутнага часу». Перадача 10-я.
18.25 «Містыка лёсу».
18.55 Ток-шоў «Аркестравая яма».
19.35 «Эндзі Пэндзі». Мультсэрыял.
19.45 «Тайны расейскай зброі». «Праект БМ-13».
20.10 «Дзямідавы». Маст. фільм. 2-я сэрыя.
21.25 «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.25 «Хто там...».

● НТВ
9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Зусім сакрэтна».
10.15 «Без рэцэпту».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога»..
17.25 «Каманда.ru».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Баявік «Агністы ліс».
22.25 Супэрбокс. Заб Джуда супраць Джуніёра Вітэра.

● Эўраспорт
9.30 Сучаснае пяцібор'е. Вугоршчына.
10.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Турцыя—ЗША. Паўтор.
11.45 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Бразылія—Камэрун. Паўтор.
13.30 Ралі. Кіпр. Паўтор.
14.00 Тэніс. Турнір АТР. Паўфінал. Хертагенбош. Жывая трансьляцыя.
15.30 Тэніс. Турнір WTA. Паўфінал. Істбарн. Жывая трансьляцыя.
17.00 Трыятлён. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Чэхія. Жывая трансьляцыя.
19.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Агляд матчаў. Францыя.
19.30 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Калюмбія—Новая Зэляндыя. Жывая трансьляцыя.
22.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Францыя—Японія. Жывая трансьляцыя.
0.15 «Формула». Часопіс.
0.30 Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле Ману. Агляд.
1.30 «Фэрары». Часопіс.
2.00 Ралі. Кіпр.

21 чэрвеня субота

● БТ
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.30 Маст. фільм «Маленькі сэржант» («Беларусьфільм»).
11.00 Здароўе.
11.30 Тэлевізійны Дом кіно. «Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі». Частка 2-я.
12.20 Вясёлая сямейка.
12.50 Падарожжа дылетанта. «Юравіцкія цікавосткі».
13.00 Сола для дэбютанта. Людміла Сідаркевіч (актрыса).
13.15 Плянэта АРТ.
13.40 «Ёсьць толькі міг...».
14.10 «Другая сусьветная вайна ў колеры». Дак. фільм.
15.15 «Жывы тавар. Стоп: трафік!» Відэафільм АТН.
15.40 Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі. «Не шарахцець», «Квака-задавака». Мультфільмы («Беларусьфільм»).
16.00 Драма «Яны ішлі на Ўсход».
18.35 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
19.00 «Мікалай Яроменка-старэйшы. Пасьлялоўе». Дак. фільм.
19.30 Мэлядрама «Сын за бацьку».
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 «Маладэчна-2003». Нацыянальны фэстываль беларускай песьні і паэзіі.
0.50 Футбол. Кубак Інтэртота. «Шахцёр» (Беларусь) — «Ома Таўн» (Паўночная Ірляндыя).

● СТВ
7.25 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
7.50 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.15, 19.55 «СТВ-спорт».
8.25 «Рэактыўны бокс».
8.40 «Запрашаем паскардзіцца...».
8.50 «Плянэта людзей».
9.10 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.35 «Кіно — дзецям»: тэлефільм «Прыгоды Электроніка». СССР, 1979.
10.55 «Разам».
11.25 «Рамонт».
11.40, 20.15 Кіно: тэлесэрыял «Варыянт «Амэга». СССР, 1975.
13.05 Кіно: камэдыя «Ішоў сабака па раялі». СССР, 1978.
14.30 Праект «Адлюстраваньне»: «Подыюм». Дак. фільм.
15.25 «Клюб «Белы папугай». Найлепшае.
16.20 «Вовачка-2». Сэрыял.
16.55 «Найлепшыя шоў сьвету з Урмасам Отам».
17.50 Кіно: камэдыя «Жандар з Сэн-Трапэ».
19.30 «24 гадзіны».
21.40 Кіно: камэдыя «Беражыце мужчын». СССР, 1982.
23.00 «Навіны СНД».
23.15 Кіно: драма «Хлопцы з раю». Японія, 2000.

● Першы музычны канал
8.00 Рухач.
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ
8.00 Навіны.
8.05 Маст. Фільм «Пастарайся застацца жывым».
9.10 «Тайна неўміручасьці». Дак. фільм.
9.35 Мы робім «Ералаш»-2.
10.05 «Падводны сьвет Андрэя Макарэвіча».
10.30 «Сэрцы трох». 5-я сэрыя, заключная.
11.25 Прэм'ера. «Крэмль-9».
12.05 «Сьмешныя людзі».
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.00 Навіны (з субтытрамі).
14.20 «Слабае зьвяно».
15.15 «Ералаш».
15.25 Юбілейны канцэрт У.Шаінскага «Калі мае сябры са мной».
17.25 «Ідалы».
17.50 «Гісторыя Маскоўскага кінафэстывалю».
18.20 Маст. фільм «Уварваньне». СССР, 1980 год.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 «Поле цудаў».
22.05 Творчы вечар Аляксандра Абдулава.
23.35 Трылер «Прэзумпцыя невінаватасьці». ЗША.

● РТР
8.05 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Забіць крумкача».
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.20 Дэтэктыў «Пуаро Агаты Крысьці. Забойства Роджэра Акройда».
12.15 «Клюб сэнатараў».
13.00 Весткі.
13.20 «Мая сям'я».
14.15 «Пакой сьмеху».
15.15 «Сынэманія».
15.45 «Экспэртыза».
16.20 «Сам сабе рэжысэр».
17.20, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
17.50 «Аншляг».
18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
19.55 Камэдыя «Ўваход праз вакно». 2002 г.
22.30 Маст. фільм «Жыцьцё гэтага юнака» (ЗША). 1993 г.

● Культура
10.40 Маст. фільм Л.Шапіцькі «Ўзыходжаньне» паводле аповесьці В.Быкава «Сотнікаў».
12.30 «Запаведная Расея». «Дружба» на разьдзеленай зямлі».
13.00 «Генры Джэймз». Тэлесэрыял.
13.50 «Кліч продкаў». Мультфільм.
14.45 Кіно — дзецям. «Самая кепская ведзьма». Тэлесэрыял.
15.10 Музычная гісторыя ад Ціхана Хрэньнікава.
16.05 «Парыскі часопіс». «Барыс Вільдэ. Чалавек з Музэю Чалавека».
16.35 «Вайна стагодзьдзя». Дак. фільм. 4-я сэрыя. «Помста».
17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 Дзёньнік фэстывалю «Зоркі Белых начэй».
18.25 «Містыка лёсу». «Тры містычныя спатканьні Ўладзімера Салаўёва».
18.55 «Сфэры».
19.40 «Прывалаўскія мільёны». Маст. фільм.
22.20 «І даўжэй за стагодзьдзе...».
23.25 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».

● НТВ
9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Каманда. ru».
10.00 «Кулінарны паядынак».
10.55 Спорт. «Лято 6 з 49».
11.00, 14.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.30 «Краіна Саветаў».
12.30 Баявік «Выпадак у квадраце 36-80».
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Камэдыя «Вялікая няня-2».
18.00 «Найноўшая гісторыя. З камэры сьмяротнікаў на Лубянку».
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Махаон».
20.00 «Асабісты ўнёсак».
21.00 Баявік «Фактар холаду».
23.05 «Усё адразу!».

● Эўраспорт
9.30 Ралі. Кіпр. Паўтор.
10.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Калюмбія—Новая Зэляндія. Паўтор.
11.00 Трыятлён. Чэмпіянат Эўропы. Мужчыны. Чэхія. Жывая трансьляцыя.
13.00 Пляжны валейбол. Сусьветнае турнэ. Паўфінал. Жанчыны. Швайцарыя. Жывая трансьляцыя.
14.00 Тэніс. Турнір АТР. Фінал. Хертагенбош. Жывая трансьляцыя.
15.30 Ралі. Кіпр. Паўтор.
16.00 Лёгкая атлетыка. Кубак Эўропы. Флярэнцыя. Жывая трансьляцыя.
20.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Фінал. Тулён. Жывая трансьляцыя.
22.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Бразылія—ЗША. Жывая трансьляцыя.
0.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Камэрун—Турцыя.
1.15 Ралі. Кіпр.
1.45 Тэніс. Турнір WTA. Фінал. Істбарн.

22 чэрвеня нядзеля

● БТ
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Дачка камандзіра». Маст. фільм («Беларусьфільм»).
8.20 5 цудаў.
8.30 Арсэнал.
9.05 Алхімія слова.
9.10 «Я, лейтэнант Махнач...». Дак. фільм.
9.40 Драма «Вянок санэтаў» («Беларусьфільм»).
11.10 Сад мары.
11.40 Музэюм. «Партрэты роду Завішаў».
12.15 «Галасы». Відэафільм.
12.55 «Ваша лято».
13.35 Сьвятыні Беларусі. «Менскі абраз Божай Маці».
14.00 «Прыватная хроніка часоў вайны». Дак. фільм. Фільм «Тварам да твару».
15.15 Лёс чалавека.
15.45 Ваенны кінараман «Чорная бяроза» («Беларусьфільм»).
18.00 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
18.55 Маст. фільм «У жніўні 44-га...».
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.15 Драма «Гадзіньнік спыніўся апоўначы» («Беларусьфільм»).

● СТВ
7.25 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
7.50 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.15 «СТВ-спорт».
8.30 «Філярманічны тыдзень».
8.35 «Менск і менчукі».
8.40 «Партрэт у інтэр'еры».
8.55 «Добры дзень, доктар!».
9.10 «Аўтапанарама».
9.35 «Кіно — дзецям»: тэлефільм «Прыгоды Электроніка». СССР, 1979.
10.50 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
11.15 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.30 «Сьвецкая хроніка».
11.40, 20.40 Кіно: тэлесэрыял «Варыянт «Амэга». СССР, 1975.
13.05 Кіно: маст. фільм «У чорных пясках». СССР, 1972.
15.00 Кіно: драма «Ў бой ідуць адны «старыя». СССР, 1973.
16.40 «Мэтафізыка Пецярбургу».
17.40 «Валянцін Елізар'еў. 30 год зь беларускім балетам».
18.15 «168 гадзін».
19.10 «Пакуль гарыць сьвечка...».
19.40 «Аўтапанарама».
20.00 «Асабісты інтэрас».
22.00 «Турпаход».
22.10 «Навіны СНД».
22.30 Кіно: маст. фільм «Ішоў чацьверты год вайны». СССР, 1984.

● Першы музычны канал
8.00, 13.45 Рухач.
12.00 «Чарнасьліў».
13.00 «Пра Fashion».
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Служу Айчыне!
8.45 «Ералаш».
8.55 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Юкі адкрывае Дыснэйлэнд».
10.15 «Падарожныя нататкі».
10.35 Пакуль усе дома.
11.15 Дог-шоў.
11.55 Тайны забытых перамог. «Зброя перамогі. Кацюша».
12.25 «Клюб падарожнікаў».
13.05 Разумніцы й разумнікі.
13.35 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.20 «Валадар смаку».
15.10 Ток-шоў «Выбар».
15.50 Баявік «Разьведчыкі».
17.15 «Вялікія бацькі».
17.50 Жывая прырода. «Прагулкі з дыназаўрамі. Тайна нараджэньня».
18.50 Маст. фільм «Перад сьвітаньнем».
20.30 Контуры.
21.15 Шон Конэры, Нікалас Кейдж і Эд Харыс у баевіку «Скала» (ЗША, 1996).
23.25 Часы.
0.25 Дзёньнік XXV Маскоўскага міжнароднага кінафэстывалю.
0.35 Камэдыя «Мафія» (ЗША).

● РТР
9.15 «Ранішняя пошта».
9.45 «Гарадок». Дайджэст.
10.20 Камэдыя «Матрос з «Камэты». 1958 г.
12.10 «Парлямэнцкі час».
13.00 Весткі.
13.20 «Вакол сьвету».
14.20 «Вайсковыя песьні». Канцэрт Дзьмітрыя Хварастоўскага.
15.15 «Доўгі, доўгі дзень».
16.00 Сьвяточны кацэрт, прысьвечаны 90-годзьдзю Мікіты Багаслоўскага.
17.05 Маст. фільм «Беларускі вакзал».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Сусьветнае кіно. Прэм'ера. Маст. фільм «Вар'яцкі горад» (ЗША).
22.30 Маст. фільм «Розум і пачуцьці» (ЗША).

● Культура
11.10 Пецярбург-300. «Надзея». Дак. фільм.
11.25 «Рыцары сьмеху». «Дзеці-артысты».
11.55 Нядоўгія гісторыі.
12.10 «Ну, пачакай!». Мультфільмы.
13.00 «Вайна сьвяшчэнная». Дак. сэрыял. Фільм 1-ы. «Берасьце».
13.30 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
14.25 «Час музыкі». Тэлечасопіс.
14.55 «У сьвеце танцу». «Зялёны стол». Фільм-балет.
15.35 «Людзі 1941 году». Дак. фільм.
16.30 «Кіно, якое было». «Марлен. Разьвітаньне з шасьцідзясятымі».
17.10 «Два Фёдары». Маст. фільм.
18.35 Магія кіно.
19.05 Сьмеханастальгія.
19.30 «Дом актора».
20.15 «Болей чым каханьне». Фільм 1-ы.
20.55 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял.
21.20 Культ кіно. «Санаторы пад Клепсыдрай». Маст. фільм.
23.25 Джэм-5.

● НТВ
9.00 Сэрыял у нядзелі. «Каханьне ўдаўца»..
9.55 «Песьні вайны».
10.15 «Расьліннае жыцьцё».
10.50 Гуляем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 14.05 «Сёньня».
11.10 «Уплыў».
12.00 Маст. фільм «Атрад».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Экстрэмальны кантакт. Нырцы ў жывёльным сьвеце», 13-я сэрыя, заключная.
15.50 «Жаночы погляд».
16.25 Баявік «Рызыка без кантракту».
18.05 «Калі заўтра вайна?». Фільм Аляксея Паборцава.
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Страсьці па Філонаву».
20.00 «Надоечы».
21.30 Фільм тыдня. Прэм'ера. Баявік «Атрад 10 з Наварону».

● Эўраспорт
9.30 Ралі. Кіпр. Паўтор.
10.00 Пляжны валейбол. Сусьветнае турнэ. Фінал. Жанчыны. Швайцарыя.
11.00 Веславаньне. Кубак сьвету. Мюнхен. Жывая трансьляцыя.
13.00 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Сан Марына. Жывая трансьляцыя.
14.00 Супэрспорт. Сан Марына. Жывая трансьляцыя.
15.00 Лёгкая атлетыка. Кубак Эўропы. Флярэнцыя. Жывая трансьляцыя.
18.00 Пляжны валейбол. Швайцарыя. Жывая трансьляцыя.
19.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Бразылія—ЗША. Паўтор.
20.00 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Сан Марына.
20.30 Кік-боксынг. Паўтор.
21.45 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Жывая трансьляцыя.
0.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя.
1.15 Ралі. Кіпр.
1.45 Аўтагонкі сэрыі КАРТ. Сусьветныя сэрыі. Портлэнд.

Каліноўскі ў Баранавічах

У Баранавіцкім краязнаўчым музэі адкрылася выстава «За зямлю, за волю». Яна прысьвечана 140-годзьдзю паўстаньня пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Музэй працуе штодня, акрамя нядзелі.

Равяка Руслан, Баранавічы

Стаж у Польшчы

для маладых навукоўцаў (да 35 гадоў), што маюць вышэйшую адукацыю па спэцыяльнасьцях: міжнародныя адносіны, гісторыя, паліталёгія, сацыялёгія, этналёгія, культуразнаўства, грамадзкая псыхалёгія, адміністрацыя і кіраваньне, а таксама для студэнтаў апошняга году навучаньня. Абавязковая ўмова — добрая агульная арыентацыя ў польскай праблематыцы па сваёй спэцыялізацыі, веданьне ангельскай ці польскай моваў на ўзроўні хоць бы разуменьня лекцыйнага матэрыялу. Час стажу — дзевяць месяцаў. Памер стыпэндыі (уключае ў сябе кошт харчаваньня і пражываньня) — 1200 польскіх злотых на месяц.

Неабходныя дакумэнты: копія дыплёму (у выпадку студэнтаў апошняга курсу — даведка з навучальнай установы); анкета кандыдата; кароткі ліст-матывацыя, з пазначэньнем спэцыялізацыі, плянаў, зьвязаных з рэалізацыяй стыпэндыі, а таксама, па магчымасьці, навуковай арганізацыі Польшчы, у якой магло б адбывацца стажаваньне; curriculum vitae па-польску ці па-ангельску, складзенае пачынаючы з апошніх падзеяў; два фатаздымкі; рэкамэндацыі двух навуковых аўтарытэтаў у галіне спэцыялізацыі кандыдата; сьпіс публікацыяў, дасягненьняў і прафэсійных ідэй; дакумэнт, які пацьвярджае веданьне польскай ці ангельскай моваў; іншыя дадзеныя, якія могуць дапамагчы Кваліфікацыйнай камісіі.

Дакумэнты неабходна выслаць поштай на адрас Пасольства Рэспублікі Польшчы (вул.Румянцава, 6, 220034, Менск) з пазнакай «Стыпэндыя для маладых навукоўцаў». Заявы прымаюцца да 6 ліпеня 2003 г. Пра дату сумоўя кандыдатаў паінфармуюць лістом.

Кубак Стэнлі для Русланкі

Маці Руслана Салея, спн.Тамара Салей — энэргічная жыцьцярадасная жанчына з уладнымі, але стрыманымі манерамі. Ня скажаш, што пэнсіянэрка. Я прыдзірліва ўзіраюся ў яе: усё ж маці Героя. Можа, і мой сын калі-небудзь дасьць джазу… З гэтай спадзеўкай задаю першае пытаньне:

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Тамара Салей хварэе за сына кожны матч, але не ўспрымае яго як героя

«НН»: Спн. Тамара, як Вам у якасьці мамы Героя? Ці думалі Вы, несучы сына з радзільні, што праз чвэрць стагодзьдзя ён упора такі цуд?

Т.С.: Па-першае, я не ўспрымаю Руслашу як героя. Ён проста прафэсійна робіць сваю справу, ведае, чаго хоча, а потым шукае найкарацейшыя шляхі, каб гэтага дасягнуць…

«НН»: Гэта і ёсьць Герой. Прынамсі, мы тут у Беларусі па такім засумавалі…

Т.С.: Ну, можа. Але я не плянавала для сына будучыні. У 1974 г. мне ўжо 34 гады было, двое дзетак, сьціплы дабрабыт. Руслан быў сюрпрызам. Але мы з мужам падумалі: вось і добра, дзе двое, там і трое. Тады думалася так: абы вырас сапраўдны савецкі чалавек — шчыры, адкрыты, спагадлівы… Ну, і шчасьлівы.

«НН»: А як выйшла, што малы стаў ня гузікі касьцяныя зьбіраць ці на фартэпіяна граць, а хакеем заняўся?

Т.С.: Ну, маркі ён усё ж калекцыянаваў. Руслаша паводле гараскопу Скарпіён, а па нараджэньні — Складаны Тыгр. Вельмі моцны, спакойны, імклівы характар. Змалку пайшоў на картынг. Я ня так таго картынгу баялася, як даезду да яго — трэ было дзіцяці ехаць праз увесь горад у Зялёны Луг, вяртацца прыцемкам. Я кажу: «Сынку, ты як хочаш, але шукай сэкцыю дзе каля дому». І ён пайшоў у хакей — у Палац спорту, у спартовую школу №12. І там адразу выявілася: шчасьлівы выбар. Мне зь дзецьмі пашанцавала: яны выбралі сабе справу і з задавальненнем займаюцца ёй.

«НН»: Раскажыце падрабязьней.

Т.С.: Сама я тэхноляг будматэрыялаў, усё жыцьцё прапрацавала на МАПІД (раней ДБК-1). Муж таксама будаўнік. Вадзім, сын, 41 год яму цяпер, — галоўны мэханік на ДБК. Такая дынастыя будаўнікоў. А вось дачка Анжэла — акушэрка ў радзільні №2. Ёй 39 гадоў, мае траіх дзетак. Малодшай — 3 гады, назвалі ў гонар дзядзі Русланкай. Пляменьнікі Руслана ніяк не дачакаюцца. І ён па іх прападае. Звоніць Русланцы: «Што табе прывезьці, маленькая?» А тая: «Кубак Стэнлі, дзядзечка!»

«НН»: Як родныя, блізкія і суседзі ставяцца да Русланавага посьпеху? Не зайздросьцяць?

Т.С.: Ой, што Вы! Усе такія радыя, так віншуюць. Хварэюць за кожны матч. Вітаюцца, загаворваюць, распытваюць. Ніякай зайздрасьці, вялікая цікаўнасьць і радасьць.

«НН»: Сын трымае цяпер сувязь зь сям'ёй ці заглыбіўся ў гульню?

Т.С.: Пунктуальна трымае. Нам з бацькам тэлефануе штотыдня, а старэйшаму брату Вадзіму — амаль штодня. У братоў моцныя повязі.

«НН»: Спн.Тамара, падзяліцеся сямейнымі забабонамі: што Вы робіце, каб Руслан выйграваў? Пальцы крыжуеце, моліцеся, за гузікі трымаецеся?

Т.С.: Не да таго. Я так хварэю, сябе забываюся. Рукі сьцісну ў замок, слова ня вымаўлю, вачэй з экрана не зьвяду. Мне людзі казалі: «Тамара, чаго ты так пераймаешся з таго хакею. Ну, гуляе хлапец, хай гуляе». А я ніводнай ягонай гульні не прапусьціла ні ў дзяцінстве, ні цяпер. Радавалася кожнай удачы, перажывала, як што ня так. Баялася траўмаў. Я бачыла, як ён ставіцца да хакею.

«НН»: За гэтыя гады Вы сталі цудоўна разьбірацца ў гульні?

Т.С.: Да тонкасьцяў. І ўся мая сям'я. Старэйшы сын гуляе някепска, як аматар.

«НН»: Ці не падаецца Вам, што тут усё ж нешта ня так? Возьмем якую бабулю зь вёскі: 50 гадоў буракі палола, бульбу капала, а мусіць дажываць у страшнай галечы. А Руслан займаўся любімай пагулянкай і атрымаў усё: грошы, славу, магчымасьць спазнаць сьвет… Ці ёсьць справядлівасьць на сьвеце?

Т.С.: Сказана ж недзе: праўда ходзіць далёкімі шляхамі. Шкада, што гэтая жанчына не атрымала за працу належнага. Гэта трагедыя. Але Руслан узяў сваё, я лічу. Вы б паглядзелі, як яны працуюць у спартовых школах, што гэта такое — праца спорту! Ну і потым, я сустракаю людзей, якім хакей ня менш, а можа, і больш патрэбны за буракі і бульбу. Чалавеку патрэбна ня толькі ежа. На тое ён і чалавек, каб цікавіцца гульнёй, мастацтвам, кнігамі… І плаціць за гэта.

«НН»: Тым больш у Амэрыцы, дзе грошай нязьмерна болей. Паедзеце туды жыць да сына?

Т.С.: А мы былі там два разы. Вельмі добра там. Але дома заўжды лепей.

«НН»: І Руслан так лічыць?

Т.С.: Ён лёгка прыстасоўваецца да абодвух сьветаў. Кажа мне: прыеду ў Амэрыку, адаптоўваюся да таго жыцьця і жыву добра ды лёгка. Потым вяртаюся ў Беларусь і адаптоўваюся тут, быццам і ня быў у Амэрыцы. Спачатку, як паехаў туды, то сумаваў страшна, лісты пісаў нам. А цяпер часьцей тэлефануе.

«НН»: Дзяўчыну мае там? Ці мясцовым нявестам ёсьць на што спадзявацца?

Т.С.: Ёсьць там у яго дзяўчына, Бэтан. Мадэлька. Ды лепей хай ён сам пра гэта расказвае.

«НН»: Хакей — захапленьне Аляксандра Лукашэнкі. Лядовыя палацы будуе, з Бурэ гуляе. Напэўна, сп.прэзыдэнт рады, што свой хакейны геній зьявіўся. Не тэлефанаваў, не віншаваў?

Т.С.: Не, не віншаваў. Я ведаю дакладна, што прэзыдэнт паважна ставіцца да Руслана, сочыць за ягонай працай. Але я думаю, што прэзыдэнт занадта заняты чалавек, каб тэлефанаваць нам. Сумняюся, што ў яго ёсьць час.

«НН»: І ў нас часу не засталося. Матч неўзабаве…

Т.С.: Ой, зноў ноч прахварэю. Дапамажы ім Бог!

Гутарыла Сьвятлана Курс

Параза: у вырашальным матчы «Качары» прайгралі «Нью-Джэрзі» 0:3.

Даведка «НН»



Руслан Салей, абаронца, нарадзіўся 2 лістапада 1974 г. у Менску. Рост 188 см. Вага 93 кг. У 1992—95 г. іграў у менскіх «Дынама» і «Цівалі». У 1995—96 г. — за каманду з Лас-Вэгасу. У 1996 г. быў задрафтаваны пад №9 у клюб «Anaheim Mighty Ducks» («Анагаймскія магутныя качары»). Драфт — гэта купляньне камандамі НХЛ новых гульцоў. Руслан спрыяў выхаду «магутных качараў» з заняпаду. Цяпер амэрыканская прэса называе каманду «самай яркай папялушкай хакею». Казачны каляpыт тут ня дзіўны, бо каманда Салея належыць студыі «Ўолт Дыснэй». Таму й «качарамі» завуцца. Да Салея ніводны беларус не выступаў у Кубку Стэнлі. Да чэрвеня 2003 г. Р.Салей згуляў 400 матчаў. Яго называюць «пэнсіянэрам» і «вэтэранам» па гадах і колькасьці сыграных матчаў, аднак менавіта Салей — рэкардсмэн «качак» па часе, праведзеным на пляцоўцы. Вызначаецца выключнай трывушчасьцю і жорсткай гульнёй. Пры першай магчымасьці гуляе за Беларусь, у тым ліку на Чэмпіянаце сьвету 2001 г., Алімпійскіх гульнях 1998 і 2002 г. Клюбны кантракт Салея складае 3,5 млн даляраў.

Кніжка Хілары Клінтан

200 тысяч асобнікаў мэмуараў Хілары Клінтан «Жывая гісторыя» разышліся за першы дзень продажаў. Успаміны былой «першай лэдзі», што выйшлі днямі ў прэстыжным выдавецтве «Simon & Schuster», — хутчэй новы палітычны крок, чым магчымасьць зарабіць грошай.



AP

У кнізе больш за 500 старонак. Шмат месца адводзіцца гучнаму скандалу вакол Біла Клінтана і Монікі Левінскі. Хілары Клінтан працягвае настойваць на тым, быццам яна і яе муж сталі аб'ектам «шырокай змовы правых радыкалаў, што мела на мэце павярнуць ход гісторыі». Згаданы ў гэтай сувязі й пракурор Кенэт Стар, які ініцыяваў поўнамаштабнае расьсьледаваньне скандальнай справы. Сэнатарка ЗША апавядае, як яна крычала на змарнелага мужа, а той паўтараў: «Даруй мне! Даруй мне! Я зраблю ўсё, каб абараніць цябе і Чэлсі» (дачка Клінтанаў). Пра тое, як адзіным сямейнікам, які кантактаваў з апальным прэзыдэнтам, быў сабака. Пра тое, як яе сэрца разьбілася, але потым зноў склеілася...

Ёсьць у мэмуарах і ўяўныя дыялёгі Хілары з Элеанорай Рузвэльт, у якіх першая выказвае свае думкі аб лёсе Амэрыкі і іншых падобных рэчах. У іх ясна праглядваецца намер пані Клінтан зрабіцца першай амэрыканскай прэзыдэнткай.

Цемрашалы паляць школы

Згарэла школа для дзяўчынак у правінцыі Майдан, што за 30 км ад Кабулу, нядаўна адрамантаваная і абсталяваная ААН. Спаліць яе маглі ісламскія фундамэнталісты. Талібы забаранялі жанчынам вучыцца, аднак пасьля зьвяржэньня іх рэжыму сотні тысяч дзяўчынак вярнуліся ў школы.

Ад 2001 г. гэта ўжо шостая школа, спаленая ў правінцыі Майдан.

Скарб у каналізацыі

Сусьветна вядомы скарб Німруд, лёс якога быў невядомы з моманту ўзяцьця Багдаду, быў знойдзены ў ірацкім Цэнтрабанку (на здымку). Скарб — залатыя завушніцы, дыядэмы, бранзалеты, пярсьцёнкі, рытуальныя сасуды з грабніцаў асырыйскіх цароў — быў схаваны ў каналізацыі. У вышуку застаюцца толькі 50 прадметаў з экспазыцыі Нацыянальнага музэю Іраку.

AP

Інтэграцыя бандзюганаў

У Маскве арыштаваны барысавец Мсьціслаў К., 1962 г.н., які падазраецца ў арганізацыі забойства Леаніда Аблонскага, намесьніка прэфэкта Зеленаградзкай адміністрацыйнай акругі, што быў застрэлены каля пад'езду дому, у якім жыў. Разам з Мсьціславам К. арыштаваныя хаўрусьнікі, што маюць дачыненьне да гэтага гучнага забойства. Апошнім часам прадстаўнікі барысаўскага і маскоўскага крыміналітэту ўсё часьцей «яднаюць намаганьні» ў зьдзяйсьненьні цяжкіх злачынстваў, асабліва такіх, як забойствы і гандаль беларускімі жанчынамі. Цана забойства, паводле пэўных зьвестак, складае 3500 даляраў.

СП

Хаваншчына без палітыкі

У Опэры пасьля доўгага перапынку зноў зьявілася «Хаваншчына». Пастаноўку ажыцьцявіла мастацкая кіраўнічка тэатру Маргарыта Ізворска разам з дырыжорам Генадзем Праваторавым. Прэм'ера адбылася 29 траўня. Калі ў тэатры ставяць «Хаваншчыну», заўжды ўзьнікае пытаньне: «Навошта?»

Навошта былі патрачаныя немалыя грошы, час і намаганьні? Бо ў «Хаваншчыне» (акрамя ўвэртуры) нават самая палкая фантазія не адшукае ніводнай прыгожай мэлёдыі. З школьных урокаў музыкі, зь сьмяротна нуднай тэлетрансьляцыі спэктаклю Вялікага тэатру паўстае вобраз опэры невыносна доўгай, безь сюжэту, сэнсу і драматургіі. Затое з прэтэнзіяй на «адлюстраваньне сутнасьці расейскай душы».

За «Хаваншчынай» стаіць аўтарытэт геніяльнага Мадэста Мусаргскага — прарока новай расейскай музыкі. Аднак опэра пісалася ў 1875—81 г., калі кампазытар патанаў у віры алькагалізму. Нават твору скончыць ня здолеў — памёр, пакінуўшы бессыстэмны жмут нотных аркушаў, сьпісаных дрыготкай рукою горкага п'яніцы. Мусіла прайсьці 50 гадоў, перш чым маскоўскі музыказнаўца Павел Лам у 1931 г. склаў поўны «навукова абгрунтаваны» клявір «Хаваншчыны». Аднак няма пэўнасьці, што ён слушна прачытаў крамзолі Мусарскага, што па парадку склаў аркушы, што выбраў слушныя варыянты. Бо варыянтаў было безьліч, і ўсе прыкладна аднолькавай якасьці.

А сяго-таго ў «Хаваншчыне» Мусаргскі папросту не дапісаў. Ён сам казаў, што не стае «кавалачка ў заключнай сцэне самаспаленьня». Заставаліся недароблены́мі й музычныя зьвязкі паміж эпізодамі, мільгацелі нестасоўнасьці, прапушчаныя гармоніі ды абрывы голасавядзеньня. Мікалай Рымскі-Корсакаў, які абнародаваў сваю вэрсію «Хаваншчыны» праз два гады пасьля сьмерці Мусаргскага, многае дапісаў, але й выкінуў зь яе амаль гадзіну музыкі.

Аркеструючы «Хаваншчыну», Рымскі-Корсакаў апрануў яе ў сьціплыя, сьветлыя адзежы «сьвятой Русі». Опэра ў ягоным варыянце скончалася эфэктным самаспаленьнем раскольнікаў і пераможным зьяўленьнем пацешных войскаў Пятра I. Гэткі «аптымізм» адпавядаў густам імпэрскага істэблішмэнту, аднак ставіць «Хаваншчыну» ўсё адно не дазволілі. Патрэбны быў талент і настырнасьць Шаляпіна (той абагаўляў Мусаргскага, а асабліва партыю Дасіфея ў «Хаваншчыне»), каб «прасунуць» яе ў Вялікі тэатар.

У 1913 г. расейскі антрэпрэнэр Сяргей Дзягілеў уключыў «Хаваншчыну» ў праграму «Расейскіх сэзонаў» у Парыжы й Лёндане. Але бясконцыя баярскія маналёгі пра лёсы праваслаўя і Расеі не былі б цікавыя для Эўропы. Перапрацаваць «Хаваншчыну» даручылі маладым Марысу Равэлю і Ігару Стравінскаму. Яны аднавілі харавыя сцэны, выкінутыя Рымскім-Корсакавым, а фінал Стравінскі перапісаў цалкам. Самаспаленьне раскольнікаў адбывалася за сцэнай, трагічны і прывідны фінальны хор раставаў у прасторы. Опэра ператварылася ў драму народу, якому ўлада не пакінула месца на ягонай жа зямлі. У Расеі пра рэдакцыю Стравінскага і Равэля маўчалі аж да канца XX стагодьдзя.

Пастаноўка «Хаваншчыны», якую ажыцьцявіў у 1950 г. сталінскі прыдворны дырыжор Мікалай Галаванаў, таксама далёка адбягала ад рэдакцыі Рымскага-Корсакава. Аркестроўка зрабілася пампэзнай, народныя сцэны — «прымітыўна народнымі». Рэжысэр Леанід Баратаў зрабіў галоўнай ідэяй спэктаклю праслаўленьне рэпрэсіяў Пятра I (чытай — сталінскіх), крыху прыпудранае псэўдапатрыятычнай і псэўданароднай рыторыкай. Баратаў і Галаванаў атрымалі Сталінскую прэмію. Іхная пастаноўка шчасьліва дажыла да 1995 г.

У 1959 г. «Масфільм» выпускае стужку «Хаваншчына», якая намінавалася на «Оскара» ў катэгорыі «найлепшая адаптацыя музыкі». У фільме танчыць Мая Плісецкая і сьпявае Марк Рэйзэн. Аднак галоўнае там — новая аркестроўка Дзьмітрыя Шастаковіча, вытрыманая ў стылі яго змрочных Шостай ды Восьмай сымфоніяў. Страшныя падзеі расейскай гісторыі XVII ст. асацыятыўна зблізіліся з падзеямі стагодзьдзя дваццатага. Кампазытар вымысьліў трапяткі, трывожны, поўны надзеі фінал: пасьля жудаснай сцэны самаспаленьня вяртаецца тэма сьвітаньня на Маскве-рацэ.

Гэтая рэдакцыя ў часе хрушчоўскай адлігі сталася сэнсацыяй ня толькі музычнай, але й палітычнай. Яе пасьпяшаліся нэўтралізаваць, даручыўшы ставіць опэру таму ж Баратаву. Тая пастаноўка 1960 г. існуе дагэтуль. Амэрыканцам, якія час ад часу арандуюць спэктакль, яна не падабаецца. Але опэра Мусаргскага-Шастаковіча сталася модным таварам. Раней заходнія тэатры самі яе ставілі, але цяпер ахвотней арандуюць у Марыінскім тэатры, каб не выдаткоўваць мільён на какошнікі, баярскія футры і настаўнікаў расейскае мовы. (У выязной пецярбурскай «Хаваншчыне» ўдзельнічаюць маладыя беларускія сьпевакі Кацярына Семянчук і Ўладзімер Мароз.) Хіба што Ангельская нацыянальная опэра, парыская «Апэра Бастый» і тэатар «La Monnaie» ў Брусэлі ставяць опэру самі.



ВАСІЛЬ МАЙСЯЁНАК

Зьлева направа: Аксана Якушэвіч (Марфа), Яраслаў Пятроў (Дасіфей) і Вікторыя Курбацкая (Эма).

У Менску за саветамі таксама ішла «Хаваншчына» ў рэдакцыі Шастаковіча. Яе паставіў у 1970 г. Сямён Штэйн. Партыю Дасіфея сьпяваў выдатны бас Аскольд Сухін. Аднак гэтай пастаноўцы ня лёсіла доўгае жыцьцё. Спн.Ізворска таксама спыніла свой выбар на рэдакцыі Шастаковіча, хоць і зьмяніла фінал, выкінуўшы кавалак тэксту:

Ох ты, родная матушка Русь,
Нет тебе покоя, нет пути.
Грудью крепко встала ты за нас,
Да тебя ж, родимую, гнетут.
— Что гнетет тебя не ворог злой,
чужой, непрошеный,
А гнетут тебя, родимую,
Все твои ж ребята удалые...

Дый увогуле, ад «палітыкі» яна старанна ўхіляецца — і ў мізансцэнах, і ў выказваньнях. Але абмежаваць «Хаваншчыну» этычнай праблематыкай немагчыма, бо дабро ў ёй ніяк не фігуруе. Дый няздольныя гэтыя пэрсанажы выбіраць паміж дабром і злом, бо абставіны і ўласныя захапленьні пазбавілі іх свабоды выбару.

Атрымаўся спэктакль пра ўнутраную і вонкавую несвабоду, якая зьнішчае людзей. Рэжысэрка інстынктыўна гэта адчувае, бо замыкае дзею ў прасторы царкоўнага купалу. Купал робіцца сымбалем духоўнае вязьніцы, заганным колам, за якое людзям ня лёсіць вырвацца, непераадольнай перашкодай, якая адлучае іх ад Бога. Бо калі людзі ў царкве пачынаюць забіваць іншых ці сябе, царква перастае быць царквою і яе трэба асьвячаць нанова.

У спэктаклі шмат гэткіх некантраляваных асацыяцыяў. «Батя, батя, выйди к нам!» — сьпявае хор. Варта пабачыць, як рэагуюць на гэтую фразу гледачы. Яшчэ цікавей глядзець на сцэну. Уся маса народу раптам зьвяртае зрок да нейкае таямнічае кропкі ў прасторы і, укленчыўшы — суцэльная стракатая коўдра з плеч і сьпін, — замірае ў экстазе пачцівасьці. Гэта «электарат» чакае на князя Хаванскага. Думка, якая зьяўляецца пасьля прагляду: навошта лезьці ў тую Расею, калі людзям там заўжды жылося несалодка? Наўрад ці спн.Ізворска разьлічвала на гэткі эфэкт.

Затое фінал атрымаўся надзвычай прыгожы: пасьля самаспаленьня раскольнікаў па сцэне лётаюць белыя анёлкі-матылькі — душы. Гэта адзіны момант, калі вочы ўражлівага гледача зьлёгку макрэюць.

Рэжысэрка выявіла майстравітасьць у арганізацыі масавых сцэнаў. Прыемна глядзіцца і сцэнаграфія Вячаслава Окунева. Адзінае — чаму на сцэне ўвесь час зьмяркаецца, калі дзея опэры ахоплівае суткі, ад золку 5-га да золку 6-га ліпеня 1682 г.?

Цудоўна гучыць аркестар. Генадзю Праваторову ўдалося часткова пераадолець галоўны недахоп «Хаваншчыны» — ейную мазаічнасьць, неабавязковасьць асобных кавалкаў музыкі. Хор, як заўжды, бездакорны. А вось з салістаў можна вылучыць хіба толькі Алега Мельнікава, які быццам нарадзіўся, каб іграць князя Івана Хаванскага, а таксама Генадзя Чэпікава ў ролі Падзячага. Прыемнае ўражаньне пакінуў і Сяргей Франкоўскі (князь Галіцын). Астатнія выклікалі неўразуменьне: навошта рэжысэрка даверыла ім лёс прэм'еры? Чаму ў ролі Марфы-раскольніцы казалася Аксана Якушэвіч, а не Натальля Руднева, у ролі Дасіфея — Яраслаў Пятроў, а не Васіль Кавальчук, у ролі Шаклавітага — Мікалай Майсеенка, а не Ўладзімер Пятроў? Януш Нэлепа ў ролі палкага каханка Андрэя Хаванскага — гэта недарэчнасьць, але іншага лірычнага тэнара ў тэатры няма. І вырашаць гэтую праблему трэба, інакш усе намаганьні рэжысэраў мала чаго вартыя.

Так ці інакш — прэм'ера адбылася. Рэпэртуар Опэры ўзбагаціўся яшчэ адным канцэптуальным творам. Ці будуць людзі на «Хаваншчыну» хадзіць? У Маскве яна ідзе рэдка, бо не зьбірае поўных заляў, у Пецярбургу вывозіцца пераважна на экспарт, у Парыжы вытрымала дзесяць паказаў, але сэнсацыйных. У Менску — жыцьцё пакажа.

Юлія Андрэева

ВАСІЛЬ МАЙСЯЁНАК

Зьлева — Алег Мельнікаў у ролі Яна Хаванскага, справа — Сяргей Франкоўскі ў ролі князя Галіцына.

Яр

Дуэт «Яр». Дэма-CD. (р) 2003

Адбываецца новае прышэсьце на айчынную сцэну яскрава акрэсьленага этна. Яно яшчэ больш арыгінальнае ў параўнаньні з папярэднікамі як складам, так і манераю. Здавалася б, ніякага разгону няма, бо дуэт складаецца ўсяго з двух выканаўцаў: Мар'і Лагодзіч (вакал) і Натальлі Пятровіч (віялянчэль, бубен). Але і ў такім вось мінімалізаваным складзе дзяўчаты змудраюцца выконваць жывую, напоўненую драйвам музыку.

Мар'я Лагодзіч раней удзельнічала ў праекце «Юр'я» і вынесла з таго досьведу ўменьне паказаць народныя песьні цалкам небанальна і па-новаму. Усё суправаджэньне — гэта адна віялянчэль, якая то акампануе, то вядзе басовую ды рытмічную лініі. Толькі час ад часу ўжываюцца пэркусіі, гукавыя эфэкты. І запісы «Яру» пакідаюць моцнае ўражаньне, нават калі гучаць ужо раскручаныя раней папярэднікамі творы («Бярозка», напрыклад). Бо дзяўчаты робяць уласныя аранжыроўкі. Часам з гэтай музыкі так і прэ чарадзейнае язычніцтва («Выходзіло сонца», «Ой, кіну, кіну каменя»), якое ня можа не кранаць генных струнаў.

Думаю, аматары «Юр'я» ці «Тройцы» палюбяць і «Яр». Застаецца пажадаць Мар'і ды Натальлі, гэткім антыподам Сашы і Сірожы, пасьпяхова выступіць у ліпені на міжнародным фэстывалі «Этнасфэра» ў польскіх Скернявіцах.

Яры СЛУХАЧ

Рыфмы лёсаў

«Сьцяна». Дэма-CD. (р) 2002

Гэты альбом берасьцейскае групы «Сьцяна» варта было б назваць «Пінк Флойд». Але кажу гэта не дзеля зьдзеку, бо дыск пакідае неблагое ўражаньне.

Найперш дзякуючы ўдаламу ўпляценьню ў музычную тканіну добра адрэпэтаванай духавой сэкцыі. Ужо ва ўступнай п'есе «Перадсьпеў» яе фанкавыя рыфы годна адцяняюць жаночы вакаліз у народнай манеры. Удала гучаць духавыя і ў песьні «Павешаным 1863-га», адзіным творы ў альбоме, напісаным на верш паэта «збоку» — Караткевіча.

Нягледзячы на дастаткова аднастайны мэлядычны матэрыял, зьвяртаюць увагу чыста выпісаныя, разумныя аранжыроўкі, на якіх і трымаецца музыка. Рыса рэдкая для музыкаў-пачаткоўцаў і дае вялікія спадзяваньні на будучыню. Тым больш што ў аснове музыкі «Сьцяны» ўсё ж ляжыць гард-рок. А валодаюць інструмэнтамі ўдзельнікі групы ўпэўнена.

Тэматыка песень, як раней пісалі, вайсковапатрыятычная. Адна ўжо песьня на верш Караткевіча гаворыць сама за сябе. А тут яшчэ заліхвацка-плякатная, мітынговая «Здаецца нам вечнаю сьцюжа...», «Эвангельле ад «Сьцяны», у якой музыкі сьцьвярджаюць, што «спачатку ўзьнікла ня слова, яму папярэднічаў гук».

Слабае месца «Сьцяны» — няўпэўнены пакуль вакал, які да таго ж часам выдае прыналежнасьць да школы Лявона Вольскага. Тут ёсьць над чым працаваць. Аднак калектыў варта паказваць і ўзяць на аловак хоць бы той жа «БМАgroup», як гурт пэрспэктыўны і арыгінальны. Хоць прадукт «Сьцяны» — зусім не камэрцыйны. Прадаць яго будзе цяжкавата. Праўда, маецца на дыску «Трычатыры» — гэткі ляпіструбяцкоўскі шлягер, пабудаваны на жорсткіх гітарных рыфах і зноў жа ўдалым ужываньні духавых. І калі палепшыцца вакал, калі ідэалёгія песень пачне ўсё ж улічваць жорсткія вымогі шоў-бізнэсу, група здолее прабіць сьцяну невядомасьці вакол сябе.

Засьценкавы СЛУХАЧ

Слэнг

Група «Слэнг». Дэма-CD, (р) 2003.

Зьяўленьне вялікае колькасьці дэма-дыскаў тлумачыцца як няспынным разьвіцьцём музычнага рынку, так і адсутнасьцю на гэтым рынку інвэстараў, якія б маглі ўкласьці грошы ў выданьне паўнавартаснага прадукту. Вось і гурт «Слэнг» абмежаваўся арыгінальным дэма, на якім прадстаўленыя тры студыйныя фанаграмы і некалькі песень, запісаных падчас аднаго з канцэртаў у «Акварыюме».

У студыі гурт пачуваецца ўпэўнена, і як вынік — заснаваная на гард-рокавых рыфах цалкам удалая і «фарматная» песьня «Отражение», аздобленая добрым вакалам Сяргея Федарэнкі. Хоць ён крыху штучна фарсуе голас. Далей — «Море цветов». Вось тут якраз да вакальнай

партыі можна было б паставіцца больш патрабавальна. Нарэшце, трэці студыйны трэк — інструмэнтальны «Блюз реки», гэткі смачны чупа-чупс, які сам растае ў вушах: прыгожая мэлёдыя з крыху пінк-флойдаўскім уступам, годна зайграная.

Далей — шэсьць канцэртных трэкаў. Запіс няважны. Па ім можна хіба зразумець стылістыку гурту і атрымаць агульнае ўяўленьне пра найбольш удалыя песьні. А яны ёсьць, як хоць бы няхітрая «Гой-да» — патэнцыйны шлягер, у якой абыгрываецца амаль народны матыўчык. Нездарма тады ў клюбе народ пад музыку «Слэнгу» весела танчыў. Тамсама былі запісаны канцэртны варыянт песьні «Блюз реки», вэрсія славутай «Come Together» і антынікатынавая агітка «Брось сигарету».

Лідэр «Слэнгу» — гітарыст Аляксандар Насковіч, які ў свой час выступаў у складзе стылёвай групы «Flat». Ён намацаў тую музычную мову, якая дазваляе калектыву выказвацца так, што зблытаць яго зь іншымі айчыннымі вестунамі рок-н-ролу нельга. Спадзяюся, настане час, калі «Слэнг» здолее запісаць цалкам студыйны альбом.

СЛУХАТ-Ч

Make up your mind

«Seven B». Аўтарскае выданьне, (р) 2002.

Гэты альбом — яскравы адказ на меркаваньні тых скептыкаў, якія ня вераць у патэнцыял айчынных музыкаў. Маўляў, ні яны самі, ні іх музыка нецікавыя за мяжой ні для кога. Тым ня менш, альбом тыражаваны ў Польшчы, а аснову групы «Seven B» складаюць беларусы — лідэр-гітарыст Андрэй Макарэвіч зь Ляхавіч і вакаліст Генадзь Лоска, народжаны ў Белаазерску. Гадоў зь дзесяць таму яны сабралі ў Беларусі гурт, які прэзэнтаваў на некалькіх рок-фэстах Горадню. Пасьля Макар і Генак зьехалі ў Польшчу, зьбераглі назву групы, запрасілі польскіх музыкаў і ў выніку вось ужо гадоў сем зарабляюць на жыцьцё музыкай, маючы мэнэджэра, уласны транспарт, рэкляму, выдадзеныя дыскі, канцэрты. Не прапалі! Трэці ў групе беларус, мяркуючы з імя, — бубнач Валеры Новік.

Выконвае гурт ангельскамоўны рок-н-рол, хоць у аснове музыкі выразна адчуваецца блюз. Гучаць «Seven B» упэўнена, зладжана і пераканальна. Аснову рэпэртуару складаюць песьні, напісаныя непасрэдна ў калектыве. Сярод тых, што ёсьць на «Make Up Your Mind», з «чужых» песень — адзін твор Джо Ўолша, славутая «Mercedes» з рэпэртуару Джэніс Джоплін і песенька «Jasiek» («Касіў Ясь канюшыну», якую «Seven B» робяць ледзь не ў парадыйнай манеры, бліжэй да коды выходзячы амаль на стылістыку кантры). Добрая каманда! Варта было б зь якой-небудзь нагоды запрасіць яе на радзіму.

СЛУХАЧ В

In my kitchen

Big Val. Аўтарскае выданьне, (р) 2003.

Першы альбом навічка на музычнай сцэне. Вялікі Валера запісаў яго ў кампаніі з сваімі сталымі партнэрамі Сьветам ды Элам. Рэшту склалі малады ды ўдалы саксафаніст Павал Аракелян і кантрабасіст Арцём Гаўрушын. Рэпэртуар альбому складаюць пэрліны клясычнага блюзу, які гучаў яшчэ ў другой палове XIX ст., пасьля чаго пераўвасобіўся ў аўтарскія творы Робэрта Джонса, Вілі Дыксана, Джона Лі Хукера ды іншых.

Сьпяваць блюз Біг Вал пачаў гады з тры таму. Панавыпісваў праз Інтэрнэт розных школаў, праплаціў і, як ні дзіўна, усё атрымаў. Альбом невыпадкова завецца «Ў маёй кухні»: гэта такія дысыдэнцкія, як на цяперашнюю папсу, песенькі, зусім не арыентаваныя на камэрцыйны посьпех. Да таго ж, пісаўся ён у адной з хатніх студый, і выканаўцы здолелі зьберагчы гэткую атмасфэру непасрэднага выказваньня з жартачкамі, перамовамі.

Усе творы ня «зьнятыя» з арыгіналаў, а выкананыя па-свойму. Дастаткова паслухаць хоць бы вэрсію славутага стандарту «Hoochie Coochie Man»!

А пэрліны, згаданыя напачатку, — гэта «Cross Road Blues», «Walking Blues» і, вядома ж, таямніча-шаманская «I'm the Wolf». Гэты альбом — найбольш моцны і майстэрскі зборнік ня толькі сярод беларускіх выданьняў акустычнага блюзу, але і ці не найбольш аўтэнтычная, стылёвая праграма наагул сярод усіх выданьняў беларускіх блюзмэнаў. Паслухаўшы гэтую непрацяглую праграму, на блюз можна падсесьці назаўсёды. Зрэшты, здароўю тое аніяк не пашкодзіць...

LITTLE SLU

ШТО СЛУХАЎ, ШТО ПАЧУЎ

Лявон Вольскі

Мы слухаем музыку. Інтэнсіўнасьць слуханьня залежыць ад веку, густу, наяўнасьці сродкаў праслухоўваньня. Аўтамабілісты слухаюць болей, бо маюць магнітолы ці CD-чэйнджэры. Офісныя работнікі слухаюць FM-станцыі. Просты народ глядзіць тэлевізар, запоўнены таннай музыкай, якая фармуе ягоныя густы. Мэталёўцы слухаюць мэтал. Панкі слухаюць панк. Зрэшты, найчасьцей гэта зь імі адбываецца ня цягам жыцьця, а падчас юнацтва і раньняе маладосьці. Бо панкі з мэталёўцамі маюць уласьцівасьць пераўтварацца ў офісных работнікаў, аўтамабілістаў ці просты народ…

Я таксама слухаю музыку. І калі журналісты пытаюцца: «Які ваш любімы гурт, вашая ўлюбёная музыка?» — яны не атрымліваюць адказу. Гэта тое самае, што адказваць на пытаньне пра ўлюбёную кнігу. Цікавых, геніяльных і проста выдатных кнігаў безьліч. І кожная прывабная па-свойму. Тое ж з гуртамі, музыкамі й кампазытарамі. Улюбёны гурт бывае ў 16 гадоў. Пасьля ты папросту нешта вылучаеш для сябе з акіяну сусьветнае музыкі.

Ня так даўна я паглядзеў на нейкім эўрапейскім музычным канале маленькі канцэрцік гурту «Queens of the Stone Age». Спачатку кінулася ў вочы, што на бубнах грае былы драмэр «Nirvana» і цяперашні лідэр «Foo Figters» Дэйв Грол. Потым зацікавіла ўласна музыка. Потым падалося цікавым тое, што тры песьні сьпявалі тры розныя асобы: першую — асноўны вакаліст, другую пракрычэў басіст, а трэцюю прасьпяваў чалавек, які да і пасьля гэтае песьні на сцэне не зьяўляўся. Праз пэўны час я паглядзеў кліп на песьню «No One Knows». Распавядаць сюжэт кліпу — справа няўдзячная, папросту раю яго паглядзець. Дарэчы, і песьня вартасная. Пасьля ўсяго гэтага я не ўстрымаўся ад праслухоўваньня апошняга дыску «Q.O.T.S.A». Назва — «Songs for the Deaf». Музыка сьвежая, без уплываў модных кораў, рэпкораў і хіп-хопаў.

Я ня супраць вышэйзгаданых музычных стыляў, для ўсяго ў сьвеце мусіць быць сваё месца, і нічога (у музыцы) ня варта ненавідзець і выкрэсьліваць. Папросту надакучае, калі ўсе граюць прыкладна адно і тое. Гэтыя ж хлопцы ствараюць цікавыя незаштампаваныя песьні. Апроч парачкі нуднаватых шматчасткавых канцэптуальных кампазыцыяў, альбом вельмі ўдалы, запісаны адмыслова «непапсова», гэткім «мыльнаватым», нявострым гукам. Да ўсяго, гітары гучаць нямодна, так бы мовіць, няма «валу». Быццам бы гэта выдае на хібы запісу. Але насамрэч альбом стварае нейкую таямнічую дзіўнаватую атмасфэру, зацягвае ў свае хваравітыя нетры. Вакаліст пяе без асаблівае напругі, нейкім «нетутэйшым» голасам, які даволі арыгінальна кладзецца на хрыплае гітарна-бубнова-басовае тло. Гучыць сьвежа, прыцягвае ўвагу. Калі каго зацікавіла, дык на старонцы www.QOTSA.com ёсьць інфармацыя пра гурт, яго радавод у выглядзе фамільнага дрэва: там можна паглядзець, хто калі прыйшоў у гурт, хто калі куды сышоў.

І на заканчэньне: гэтая каманда нагадала мне, што рок-н-рол у сваіх размаітых праявах — гэта таксама мастацтва.

Уладзімер Някляеў

Урывак з раману*

Крэматорый

Сьпякотным і пагібельна засушлівым выдалася ў Беларусі лета 1992 году. У ліпені на поўдні, на Палессі, а ў жніўні на Меншчыне пачалі ўзгарацца тарфянікі і лясы; не хапала ні сродкаў, ні сіл чалавечых на тое, каб тушыць пажары, — і над Менскам днямі і начамі віселі дымы, якія цяжка і душна клаліся на горад. Яны зьмешваліся з гарадзкім смогам, з дымам кацельняў, аўтамашын, заводаў — і распаленую, едкую, ліпкую гэтую сумесь было не прадыхнуць. Зьнясіленыя сьпёкай і духатой людзі ледзьве соўгаліся па вуліцах, па расплаўленым асфальце, выбіраючыся з дому, дзе ратаваліся зрудзелай трубаправоднай вадой, толькі дзеля самых неадкладных клопатаў і патрэб.

У сярэдзіне жніўня па замаруджаным, запаволеным горадзе, выціраючы насоўкай маладую і здаровую лысіну (а болей ніяк не зважаючы ні на сьпёку, ні на духату), шпарка бегаў чалавек — у чорным касьцюме, у чорных чаравіках, у белай кашулі і пры чырвоным гальштуку. Быў ён цыбаты, крыху сутулы, даўгарукі, з буйным носам і цыганскім выразам блізкапасаджаных каля пераносься, невялікіх, але цяжкапаглядных вачэй, з прадаўгаватым тварам і вусікамі над ледзь прыпухлымі, відавочна ласымі да слодычы губамі. Глухі гарнітур ягоны нічым, апрача палымянага гальштука, не адпавядаў надвор'ю, але надвор'е было ня з тых, як бы ён сам сказаў, прыярытэтных фактараў, якім чалавек гэты лічыў вартым адпавядаць. Затое і чорны касьцюм, і чорныя чаравікі, і белая кашуля, і нават нечакана чырвоны гальштук цалкам адпавядалі той задачы, якую на сёньня ён перад сабой паставіў. Інтуіцыя падказвала яму, што ў гэты сьпякотны дзень усё ў яго складзецца як мае быць. І ён не даваў сабе перадыху, наразаючы кругі па гарадзкім пекле.

Спорна перабіраючы жардлявымі нагамі, на якіх матляліся шыракавастыя і пухірыстыя ў каленях штаніны, чалавек унівэрсытэцкімі дварамі прабраўся ад Прывакзальнай плошчы да плошчы перад Домам ураду. Яе ўжо год хто як хацеў, той так і называў: нехта плошчай Незалежнасьці, а нехта плошчай Леніна. Помнікаў Леніну было на плошчы два: адзін у поўны рост, на зямлі, а другі, бюставы, пад зямлёй, на станцыі мэтро імя Леніна пад правым крылом унівэрсытэту імя Леніна. З чаго нават арытмэтычна вынікала, што плошча гэтая разы ў тры-чатыры пакуль яшчэ больш ленінская, чым незалежніцкая. Пра год таму здабытую краінай незалежнасьць нагадвала грамадзянам адзіная таблічка — дый тая фанэрная, самаробная, якую нацыянальна сьвядомыя студэнты прыкруцілі дротам да слупа на тралейбусным прыпынку: «Плошча Незалежнасьці». Нехта ня надта нацыянальна сьвядомы спытаўся ўнізе сінім флямастэрам: «Ад каго?» — а хтосьці ўжо на слупе, паколькі на таблічцы бракавала месца, не паленаваўся адказаць: «Ад вас!» — і так яно ўсё разам блякла і выгарала пад пякельным сонцам.

Выскачыўшы з унівэрсытэцкіх двароў і скіраваўшы ўправа па плошчы невядома чыйго імя, цыганісты чалавек ужо трохі павольней, нібыта нешта канчаткова на хаду дадумваючы, дашыбаваў да шкляных дзьвярэй будыніны выканаўчага камітэту Менскага гарадзкога савету.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Выканаўчы камітэт Менскага гарадзкога савету, як і плошча, на якой мясьціўся ён, таксама не зусім цяміў, як яму цяпер сябе самога называць: камітэтам і саветам ці мэрыяй і муніцыпалітэтам.

Вокны кабінэту старшыні выканкаму Менгарсавету год таму адназначна выходзілі на плошчу імя Леніна, дзе і ўбачыў ён у мінулагоднім жніўні ахоплены трыюмфальнай радасьцю незьлічоны натоўп, над якім луналі бел-чырвона-белыя сьцягі і скакалі рыцары зь мячамі. І невядомае раней гэтым людзям шчасьце, нязвыклае для іх пачуцьцё сваёй, вольнай, незалежнай Айчыны так захапіла і ўзрушыла старшыню, што ён раптам паверыў, быццам жыве ў сапраўды эўрапейскай краіне — і ў гарачцы загадаў-такі называць сябе мэрам, а падуладную яму ўстанову — муніцыпалітэтам. Праз месяц позна ўвечары, калі ўжо сышла сакратарка і яшчэ не зьявіўся начны дзяжурны, у дзьверы кабінэту мэра акуратна пастукаўся ягоны кадравік, адстаўны кадэбэшны пацук у акулярах, і акуратна паклаў на стол перад мэрам цёмную таўсьценную кнігу і празрыстую тонкую папку з аркушам паперы.

— Гэта «Тлумачальны слоўнік», — сказаў кадравік. — А гэта папера, на якой я выпісаў тое, што для вас трэба, каб вы не шукалі. — І з тым кадравік пайшоў, бліснуўшы з-за дзьвярэй пацучынымі сваімі акулярамі.

З таго, што выпісаў з «Тлумачальнага слоўніка» кадравік, вынікала, што мэр — гэта сапраўды галава муніцыпалітэту, а муніцыпалітэт — сапраўды орган гарадзкога або сельскага самакіраваньня, але *ў некаторых краінах*. Гэтае «ў некаторых краінах» адстаўны пацук двойчы падкрэсьліў, а што гэта — *у некаторых краінах?* Беларусь — гэта ўсё яшчэ *каторая* ці ўжо *некаторая* краіна? Больш першая альбо другая? Ці яна пакуль і ня тая, і ня гэтая? Тады якая?..

За вокнамі было ўжо цёмна, сьцягі над плошчай не луналі, і рыцары не скакалі, каля гасьцініцы «Менск» пасьвечвалі падфарнікамі міліцэйскія «газікі», далей, за гасьцініцай, на праспэкце ўжо нібыта не імя Леніна, але яшчэ і не імя Францыска Скарыны ня гасьлі нядрэмныя вокны ў гмаху Камітэту дзяржаўнай бясьпекі. І мэр з халадком ніжэй жывата адчуў, што будучыня непрадказальная ў любой драбязе і ў нечым ён пасьпяшаўся, і праз тое моцна рызыкуе...

— У вас чаму ўсялякая самаробная хранацень да слупоў дратамі прыкручаная?.. На галоўнай плошчы гораду! Зараз у газэты званю — няхай прыедуць і напішуць! Дзе мэр, у сябе?..

Высушаны, як вобла, сьпёкаю ў шкляным акварыюме мэрыі паставы міліцыянт, на якога, ледзь адчыніўшы дзьверы, адразу накінуўся цыганістага выгляду грамадзянін, сонна пацягнуўся і абыякава празяхнуў:

— Нямашака тут аніякага мэра... Пабыў трохі — і перастаў... Дакумэнты.

— Якія дакумэнты? Якія такія дакумэнты! — узьвіўся нахрапісты грамадзянін. — Што ў вас тут за старыя парадкі савецкія — без паперкі не ўвайсьці і ня выйсьці! Тут гарадзкая ўправа ці генэральны штаб? Я ў цябе пытаюся пра генэрала ці пра мэра? Хто ў цябе начальнік службы?

— Зараз пабачыш хто, — па-ранейшаму абыякава пазяхаючы, сказаў паставы міліцыянт і пасунуўся да службовага тэлефона. Грамадзяніна гэта рэзка супакоіла — і ён паклаў на стол паставога зашмальцаваны пашпарт:

— На.

— Цяпер праходзь, — сказаў міліцыянт, нават не зазірнуўшы ў дакумэнт. — Мэр у адпачынку.

— Дык да каго мне тады?

— Да каго хочаш. А то б цябе мэр прыняў, калі б нават быў, — яшчэ раз пазяхнуў паставы і, пазяхаючы, дадаў: «Пі-я-нер за-сра-ны...»

Грамадзянін лыпануў вачамі, набычыўся, нібы хацеў ці сказаць, ці нават зрабіць нешта ў адказ міліцыянту, ва ўсякім разе не саступіць, але толькі крутнуў потнай шыяй у зацягнутым гальштуку і рушыў да лесьвіцы...

На другім паверсе ён найперш адшукаў прыбіральню, бо міліцыянт яго трохі знэрваваў; паправіў гарнітур, гальштук, працёр чаравікі. Выйшаўшы з прыбіральні, рушыў з канца ў канец калідору, разглядаючы таблічкі на аднолькава шырокіх, аднолькава высокіх і аднолькава скураных дзьвярах пад рознымі нумарамі. Ён любіў такія экскурсіі па казённых установах, дзе пахла параграфамі, клясыфікацыяй, сыстэмай, дзе на кожных дзьвярах напісана, хто за імі сядзіць і чым, седзячы там, кіруе.

На пафарбаваных у колер сьцяны, а таму малапрыкметных дзьвярах у самым канцы калідору не было ні таблічкі, ні нумару, але грамадзянін, якога толькі што знэрваваў і разславаў паставы міліцыянт, з досьведу свайго ведаў, хто звычайна сядзіць ва ўсіх больш-менш сур'ёзных дзяржаўных установах за такімі ніяк не пазначанымі дзьвярыма. Грамадзянін лёгка націснуў на клямку, каб паглядзець, ці таксама замкнёныя гэтыя дзьверы зьсярэдзіны, як замкнёныя падобныя да іх паўсюль і заўсёды, і неспадзявана дзьверы плаўна прыадчыніліся. Зазірнуўшы ў праём, ён убачыў глыбокі кабінэт са сьценавымі сэйфамі, глухімі шафамі і пісьмовым сталом, за якім нікога не было.

У незамкнёным кабінэце адсутнічала службовая асоба, адказная за закрытую дакумэнтацыю сталічнай мэрыі! За сакрэтныя інструкцыі і перапіску! За дасье на супрацоўнікаў! За... ды за ўсё! Некалькі сэйфаў і шафаў, застаўленых тоўстымі і тонкімі папкамі, не былі аплямбаванымі! Гэта быў такі непарадак, такое парушэньне ўсіх прадпісаньняў, што дастаткова стаць сьведкам гэтаму — і ўжо бяды не абярэшся! Таму найлепей было б асьцярожна прычыніць дзьверы і даць ходу па пажарнай лесьвіцы, пакуль ніхто не зьявіўся на калідоры. Грамадзянін асьцярожна прычыніў за сабой дзьверы, але зьсярэдзіны, пераступіўшы парог кабінэту.

Агледзеўся па кутах і, не знайшоўшы нікога ні за шафамі, ні за фіранкамі, ён рашуча падышоў да пісьмовага стала, усеўся ў пустое крэсла за ім, усклаў на стол рукі з кавальскімі кулакамі — і стаў чакаць... Гэта быў трэці варыянт разьвіцьця падзей, які ён ліхаманкава абдумаў і прыняў, адразу адкінуўшы варыянт уцёкаў па пажарнай лесьвіцы, а пасьля і варыянт тэлефоннага званка мэру з прапановай неадкладна зайсьці ў першы аддзел. Мэр ужо вярнуўся з адпачынку, употай ад усіх быў на рабоце — і грамадзянін, які нахабна заняў чужое і сакрэтнае крэсла, дакладна пра тое ведаў…

— Якога д'ябла! — аслупянела ўтаропіўся начальнік першага аддзелу Пятро Ўсьцінавіч Пумін, па дзіцячай мянушцы Пумапацук і па дарослай мянушцы Пума, на незнаёмага цыганістага выгляду мужыка гадоў пад сорак, які ў ягоным службовым кабінэце сядзеў за ягоным службовым сталом у ягоным службовым крэсьле. — Вы што тут робіце?

— А вы што тут ня робіце? — спакойна перапытаў мужчына. — Чаму вас тут няма? Чаму тут я, а ня вы?

Гэта ўжо было занадта, каб быць выпадковым...

Пятро Пумін ня быў дурнем, хутчэй наадварот. Праз лішні розум ён і апынуўся на нікчэмнай службе ў мэрыі, куды яго сплавілі з пасады намесьніка старшыні КДБ пасьля правальнага путчу ў Маскве. Сказалі, што гэта да лепшых часоў, да стабілізацыі. Якой стабілізацыі?.. Чаго стабілізацыі?.. Гэтыя маскоўска-кручкоўскія далбалобы думалі яшчэ пра нейкі стабілізатар для самалёта, які разваліўся, нават не ўзьляцеўшы. З паэтам Восеневым кампанію яны завялі, юрыдычна-прававыя вершы ягоныя слухалі! Замест таго каб на ўсю краіну паказаць, як коціцца па Лобным месцы мечаная галава Гарбачова, танцы маленькіх лебедзяў паказалі! І дзеля гэтага ён, Пятро Пумін, настойваў, каб зь дзевятнаццатага жніўня ўсе беларускія тэлеперадатчыкі трансьлявалі толькі першую агульнасаюзную праграму? І дзеля гэтага ён змусіў цэкоўскага сакратара Малафеева загадаць, каб не друкавалі рэспубліканскіх газэт?.. І праз гэта стаіць ён зараз на парозе ўласнага кабінэту і ня ведае, што рабіць зь нейкім цыганом, якога б два гады таму папросту ў распыл пусьціў...

— Гадаеце, хто я і што са мной рабіць? — прачытаў ягоную паўзу грамадзянін за ягоным сталом. — А раптам я сам думаю, што мне рабіць з вамі, га?.. А раптам я адкуль-небудзь адтуль? — шыяй пацягнуўся ён уверх, прыгладзіўшы мімаходзь лысіну. — А ня потна тут у вас, прахалодна...

«Ніадкуль ты не адтуль, але як на цяперашні час, бадай, можаш там быць», — зрабіў для сябе заключэньне Пума і сказаў:

— Я паступлю з вамі вельмі проста... Здам паставому.

— Дзіўны ён нейкі, гэты паставы, вам не здаецца? — абапёршыся на свае кавальскія кулакі, падняўся нарэшце не са свайго крэсла грамадзянін. — Я празь яго да вас і зайшоў. Разумею, што гэта драбяза, ня вашы кадры, але ня месца яму на такой службе. Непрыемны з выгляду, распушчаны, занадта дэмакратычны для такой работы, я б сказаў... Нават дакумэнтаў у мяне не праверыў. Ды вы праходзьце, сядайце, што вы там сталі, бы ўкапаны? Ці пашпарт паказаць?..

«Э, галубе, ды ты ніяк наш. А ну дай мне да цябе прыгледзецца», — узяў Пумін працягнуты яму пашпарт і сеў за прыналежны яму стол у прыналежнае яму крэсла. І адразу адчуў палёгку, бо гэты вусаты і лысы піянер мімалётную насьцярогу ў ім выклікаў. Пры тым разгоне старых кадраў якія толькі лепяхі каровіны наверх не ўсплывалі.

— Дык ты зямляк мой, Грыша, — неслужбовым тонам сказаў Пумін, гартаючы старонкі зашмальцаванага пашпарта.

— Вы магілёўскі?..

— Сам я не, але бацька мой адтуль сабе жонку ўзяў — і з тваіх якраз мясьцін... А я ўжо ў іх у Маскве нарадзіўся.

— О-о-о!..

— Вось табе і о-о-о... Масква, Грыша, зь мяне чалавека зрабіла. Масква гэта Масква... А ты сам сябе як, дарэчы, называеш: Грыгорыем ці ўжо па-нацыянальнаму сьвядома — Рыгорам?

— Як у пашпарце.

— Гэта добра, што як у пашпарце. А то цяпер іншым разам і не зразумееш, нашто людзям пашпарты... Мэру званіў?

— Хацеў, але перадумаў.

— Правільна. Зь яго толку мала. Мэрыю прыдумаў, муніцыпалітэт. На мітынгі пачаў хадзіць. Цяпер сядзіць, думае, што яму за гэта будзе. Нават адпачынку не дабыў.

— Я да яго якраз і зьбіраўся, але праз паставога вашага патрапіў да вас. Выпадак.

— Выпадак... Вялікая гэта штуковіна, Грыша, — выпадак... З паставым мы з табой вырашылі, а па што ты да мэра сабраўся?

— Па работу.

— Па работу... І па якую?

— Дырэктарам крэматорыю.

Пумін перастаў гартаць старонкі пашпарту, павольна-павольна падняў ад стала галаву і ўпёрся ў цяжкі, карычнева-цёмны пагляд Грыгорыя,



КАЛЯЖ АНДРЭЯ ЧЫКА

вочы якога, сустрэўшыся зь бясколерным позіркам Пумы, мітусьліва забегалі, нібыта асобныя ад пагляду, які зыходзіў быццам зь пераносься, з надброўя, з пукатага Грышкавага лобу.

— Паўтары яшчэ раз, — папрасіў Пумін. — Не інспэктарам прафілякторыю? І ня рэктарам кансэрваторыі?..

— Дырэктарам крэ-ма-то-ры-ю, — цьвёрда і выразна паўтарыў грамадзянін у чорным гарнітуры пры чырвоным гальштуку. — У мяне няма музычнай адукацыі.

— А там музыка гучыць, я неаднойчы слухаў, — кісла пажартаваў Пумін, якога выбар участку на працоўным фронце, а яшчэ больш асобныя ад пагляду вочы навялі на пытаньне пра тое, з кім ён губляе час.

— Няхай гучыць, там музыка ня шкодзіць, — сказаў Грыгорый.

— А дзе яна шкодзіць? — асьцярожна спытаў Пумін.

— Шмат дзе, — неакрэсьлена крутнуў рукой каля галавы пумінскі зямляк. — Усё, што ёсьць у сьвеце, можа ў розны час і ў розным месцы быць і карысным, і шкодным. І музыка, і мэр, і паставы.

— Гэта правільна, — згадзіўся Пумін. — Дык цяперашні дырэктар крэматорыю ў гэты час шкодны на сваім месцы?

— У гэты час ён і ня шкодны, і не карысны, — абыякава падняў і апусьціў плечы Грыгорый. — Учора ён памёр, а пазаўтра яго хаваюць.

— Та-а-к... Гэта мяняе справу. Ты тут нічога ў мяне ня ўкраў?

— Тое б цяпер мэр чытаў.

— Ха, — нечакана для самога сябе хакнуў Пумін, і ў гэты момант зямляк канчаткова глянуўся яму на пэрспэктыву. — Што ж, давай тады працаўладкоўвацца... Толькі дырэктар — ён і ў крэматорыі дырэктар, і наўрад ці гэта будзе проста.

— Мне трэба заўтра, — даволі настойліва сказаў будучы дырэктар крэматорыю. Ён убачыў, што гэтага пацука ў акулярах хоць на нітачку, але ўжо наважыў, і ня трэба цяпер торгаць, каб нітачка не парвалася, але і адпускаць нельга, каб нітачка не правісла, каб ён яе адчуваў.

— Ну, так хутка такія справы ня робяцца, — запярэчыў Пумін, шукаючы ў тэлефонным даведніку гарвыканкаму патрэбны нумар. — З чаго такая сьпешка?

— Хачу дырэктара крэматорыю пахаваць дырэктарам крэматорыю. Як генэральнага сакратара хаваў генэральны сакратар.

— Так не было, — катэгарычна не згадзіўся Пумін. — Генэральнага сакратара хаваў старшыня пахавальнай камісіі, які ўжо пасьля абіраўся генэральным сакратаром.

— Дык прызначце мяне ў старшыні пахавальнай камісіі! Астатняе я сам дацісну!

Пумін адкінуўся на сьпінку крэсла.

— Прыемна з табой мець справу, Грыгорый. Але дзе ты чуў пра камісіі па пахаваньні дырэктараў крэматорыяў? А тым больш пра тое, каб старшыняў у гэткія камісіі прызначалі кіраўнічыя структуры?

— А, якіх толькі цяпер камісій не бывае, — махнуў кавальскім кулаком Грыгорый. — Абы старшыня. А ўжо чаго, кім прызначаны — справа дзясятая. Вось вы зараз званілі б начальніку ўпраўленьня крэматорыяў...

— Няма такога ўпраўленьня.

— Гэта ня важна, некаму ж вы будзеце званіць... І што казаць?.. Зойдзе ад мяне чалавек, зрабі так, як я прашу?.. А ў яго ўжо ёсьць свой чалавек. І ён скажа: ну, няхай прыходзіць, падумаем... І ні чарта ня зробіць, бо ўжо пра ўсё падумана. У выніку і мне ня масьць, і вам ня козыр. Так?..

— А як будзе ў твой спосаб?

— Вы зараз звоніце мэру і кажаце, што не хацелі б яго турбаваць, але памёр дырэктар крэматорыю, які меў такія заслугі перад Радзімай, пра якія звычайна не паведамляюць у прэсе, а таму пра іх мала хто ведае. Тыя ж, хто пра іх ведае, папрасілі вас арганізаваць усё на належным узроўні і прыслалі для гэтага спэцыяльнага... ну, спэцыяліста.

— Не гучыць, таўталёгія, — паморшчыўся Пумін, які ўсё жыцьцё быў спэцыяльным спэцыялістам, што займаўся савецкімі і ня надта савецкімі грамадзянамі самых розных катэгорый. Але такія экзэмпляры нават яму сустракаліся нячаста, і ён глядзеў на гэтага падцыганчыка ў чырвоным гальштуку з усё большай цікавасьцю.

— Спэцыяльнага прадстаўніка, — паправіўся Грыгорый, — і ёсьць меркаваньне, каб гэты спэцыяльны прадстаўнік узначаліў камісію па пахаваньні Якава Абрамавіча Райскага, былога дырэктара крэматорыю і таемна ад усіх заслужанага грамадзяніна.

— Ён што табе — радня? — насьцярожана, працёршы акуляры, скасіўся на Грыгорыя Пумін.

— Гэтай праблемы няма, — супакоіў яго Грыгорый. — Цёзка па прозьвішчы. А прозьвішча мне ў дзетдоме далі, бо я райскія яблыкі любіў. Яны ў нас дзічэлі там, ніхто іх ня еў, а я любіў. Бязбацькавіч я, сірата, пэтэвушнік і гэтак далей — стэрыльна чыстая савецкая біяграфія.

— Ладна, — пацёр пад акулярамі вочы Пумін. — Ну, а ў камісіі хто?

— Вы, я ды мэр — вось і ўся камісія.

— Мэр ня можа быць у камісіі і ня быць яе старшынём, — павучальна патлумачыў Пумін. — Начальнік паўсюль павінен быць начальнікам.

— Тады вы, я і паставы, якая розьніца?.. А мэр падпіша. Вы нешта на абы-што ўвагу зьвяртаеце.

— Работа такая, Грыгорый Аляксандравіч, — сур'ёзна сказаў Пумін. — З абы-чаго ў нас усё і ўзьнікае.

Пумін падсунуў бліжэй да сябе тэлефон і набраў нумар...

— Слухаўку ня возьме.

— А вы па ўрадавым...

— Давай па ўрадавым...

Слухаўку тэлефона ўрадавай сувязі мэр узяў.

— Сяргей Цімафеевіч, вітаю вас, гэта Пумін. Прашу прабачыць, што турбую, вы яшчэ нібыта адпачываеце, але тут памёр вельмі заслужаны чалавек... Не, вы яго ня ведалі, ён болей па нашай лініі праходзіў... — І далей Пума пайшоў дурыць мэра па лініі толькі што распрацаванай праграмы.

— Пішы загад, — сказаў ён Райскаму, паклаўшы слухаўку. — На машынцы друкаваць умееш?

— Надрукую як-небудзь... А як паставога прозьвішча?

Пумін зазірнуў у паперы.

— Лукашэнка. Лукашэнка А.Г.

— А поўнасьцю?

— Поўнасьцю ў мяне няма... Не заслужыў ён пакуль поўнасьцю, скарочаным патрывае.

— Тады напішу Андрэй Гаўрылавіч, якая розьніца?

— Пішы... Толькі пасад ніякіх не выдумляй, дастаткова прозьвішчаў. Сакрэтна заслужанага чалавека хаваюць сакрэтныя людзі, бяз званьняў і пасад... А, давай прадыктую:

«Для пахаваньня Райскага Якава Абрамавіча стварыць камісію выканаўчага камітэту Менскага гарадзкога савету ў наступным складзе:

Райскі Грыгорый Аляксандравіч (старшыня камісіі);

Лукашэнка Андрэй Гаўрылавіч (намесьнік старшыні камісіі);

Пумін Пётар Усьцінавіч (член камісіі)».

Ну, і дата і подпіс...

Праз пяць хвілінаў дакумэнт быў надрукаваны, а яшчэ праз пяць хвілінаў Пумін вярнуўся зь ім ад мэра, які ня стаў затрымліваць свайго кадравіка.

— Начальнічак, — зьняважліва сказаў Пумін, аддаючы Райскаму падпісаную мэрам паперу. — Яму нават загад на тое, каб яго жывым у крэматорыі спалілі, можна падсунуць... Падпісаў, не чытаючы. — І, весела ашчэрыўшы дробныя і вострыя зубы, спытаўся:

— Слухай, Грыгорый, а чым ты разьлічышся са мной за такую нестандартную паслугу? Стандартным хабарам? Ці, можа, пляшку піва праставіш?..

— Пахаваю з музыкай, — адказаў старшыня камісіі выканаўчага камітэту Менскага гарадзкога савету па пахаваньні Якава Абрамавіча Райскага Грыгорый Аляксандравіч Райскі, хаваючы загад у кішэнь свайго чорнага, жалобнага гарнітура. І, паправіўшы чырвоны гальштук, разьвітаўся з палкоўнікам КДБ Пятром Усьцінавічам Пуміным па дарослай мянушцы Пума і дзіцячай мянушцы Пумапацук:

— Жыве Беларусь!

«Жартаўнік... — услед яму падумаў Пума. — Ну, пажартуй трохі, пажартуй...»

* Паколькі былыя літаратурныя і былыя беларускія («Крыніца») часопісы перададзеныя ўладаю ў рукі людзей, з аднымі зь якіх ня надта прыстойна, а зь іншымі зусім непрыстойна знацца, то цалкам раман надрукаваны будзе невядома дзе. (Заўвага аўтара.)

• НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ •

Дзеяслоў: Літ.-маст. часопіс. — 2003. — №3



Новы «Дзеяслоў» — бадай, наймацнейшы за час існаваньня часопісу прапануе падборкі вершаў Галіны Булыкі, Генадзя Бураўкіна, Алеся Аркуша, Ларысы Раманавай. У рубрыцы «Проза» апавяданьне Ўладзімера Няклява «Няхай жыве 1 мая!», эсэ Ўладзімера Арлова «Маленькі канцэрт для мілянскіх катоў». Рубрыка «Крытыка. Архівы. Мастацтва» зьмяшчае артыкул Сяргея Дубаўца «Купала-magic: Асноўны матыў творчасьці» пра тэму кургану ў творчасьці Купалы і разгадку мастацкай стратэгіі клясыка ўвогуле, малавядомыя ўрыўкі зь дзёньнікавых запісаў Алеся Адамовіча з пасьлямовай Міхася Тычыны. Пытайцеся на выставах у ТБМ і БНФ, у «Кнігарні пісьменьніка».

Лайкоў Я. Вогнепаклоннік. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. Наклад 1000 ас.

Паэтычная кніжка аднаго з наймацнейшых маладых традыцыяналістаў. Лайкоў вельмі тэхнічны вэрсыфікатар, адчувае мову: «твайму целу карцела», «вартавы ля брамы мар». Любімы паэт аўтара, мяркуючы па вершах, Караткевіч.

Мужыцкая праўда. — Мазыр, 2003. Наклад 299 ас.

Сымбалічна, што «Мужыцкую праўду» перавыдалі ў адным з цэнтраў паўстаньня — Мазыры. Горад дападае да сваёй гісторыі. Калі гартаеш кніжачку, выдадзеную Моладзевай суполкай ТБМ «Харугва», здаецца, што й не было тых 140 гадоў, якія мінулі з часу «Мужыцкае праўды» Каліноўскага. Якасьць друку — усё тая самая. Апроч тэкстаў газэты, у кнізе ёсьць пералік выбітных удзельнікаў паўстаньня 1863 г. зь міні-біяграфіямі, прадмова.

Прыпяць: Жывая вада Палесься = The Pripyat: Living Water of Polesie: Фотаальбом / Склад., тэкст і фота І.Бышнёва, А.Казуліна. — Менск: Беларусь, 2003

Прыпяць — эўрапейская Амазонка. Фотаальбом знаёміць з прыхаваным для чалавечага вока «ўнутраным» жыцьцём гэтае ракі і некідкім хараством некранутай прыроды. Каштуе 12 тыс. руб.

Швед В. Губэрнская Горадня: Аповеды з гісторыі гораду (канец XVIII — пач. XX ст.). — Баранавічы, 2003. — 168 с. Наклад 250 ас.

Аўтар у даступнай форме распавядае пра культурнае й эканамічнае жыцьцё Горадні ды побыт яе жыхароў. Прыдбаць выданьне можна ў «Акадэмкнізе».

Круталевич В.А. История Беларуси: Становление национальной державности (1917—1922 гг.). — 2-е выд., дап. — Менск, 2003. Наклад 500 ас.

«Усе формы дзяржаўнасьці, якія існавалі на беларускай этнічнай прасторы да студзеня 1919 году, то бок да абвяшчэньня БССР, толькі ўмоўна можна назваць беларускай дзяржаўнасьцю...» — вось галоўная выснова, зробленая ў кнізе. У адпаведным рэчышчы разглядаюцца тагачасны адраджэнскі рух, дзейнасьць генэрала Булак-Балаховіча, складаныя ўзаемадачыненьні Беларусі з Польшчай і г.д. Цана ў «Акадэмкнізе» 27 тыс. руб.

Матикевич В. Нашествие: Неизвестная история известного президента. — Масква: Яуза, 2003. — 208 с. Наклад 5000 ас.

Чарговы мастацкі твор, прысьвечаны А.Лукашэнку і лукашэнкаўцам, — досыць вульгарны. Ён грунтуецца на матэрыялах, якія, паводле словаў аўтара, рызыкуючы жыцьцём, некалькі гадоў зьбіралі сьледчыя КДБ. Усе героі аповесьці маюць рэальныя прозьвішчы. Знайсьці кнігу можна толькі ў прыватных распаўсюднікаў.

Падрыхтавалі Тацяна Вабішчэвіч, СМ

Праводзіцца падпіска

на дадатковы наклад відэакасэт «Адважнае сэрца» і «Матрыца». Даведкі: а/с 150, 220107, Менск; 211-85-85 аб.25402; belvidea@hotmail.com

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Віншую Віктара Савіцкага з Днём народзінаў і прысьвячаю яму вершык ад Адама Глёбуса:

У пакоі, над сталом,
За акном — дзе ноч над краем,
Над фіранкаю за шклом
Зорка белая міргае
Ў чорным небе: над ільдом
Нас з табою суцяшае.

ВІТАНЬНІ

Марыя... Імя тваё — найпрыгажэйшае. Ты сама — як сонейка. Сэрца тваё — для ўсіх. Віншуем. Аматары піва

My Mirror, Heaven can Wait! I am forever young. Yours, Sun

КАНТАКТЫ

Шукаю кантактаў зь беларускімі патрыётамі. А/с 714, 222120, Барысаў-1. Алег

Беларус, 39/188/85, шукаю ў жонкі беларуску, пажадана бляндынку, высокую (не ніжэй за 180 см), спартыўную, бяз шк.зв., пазашлюбных дзяцей, былых мужоў, кватэрных праблем, кепскага характару, прагі да грошай... Ці ёсьць гэткая? Адгукніцеся, калі ласка! Буду чакаць. А/с 461, 220050, Менск. Слава

Прадаю паштоўкі з краявідамі Віцебску за 3000 руб., новую Біблію за 2000 руб. Т. (у Віцебску): (0212) 36-87-06

Бясплатна вышлю праверaныя народныя рэцэпты поўнага лекаваньня імпатэнцыі, няплоднасьці, астмы, алергіі, грыпу, ангіны. Ад вас капэрта з зваротным адрасам. Вул.Цітова, 121-15, Віцебск, Беларусь

КНІГІ, МУЗЫКА

Кнігі — поштай. Замаўляйце каталёг: праз пошту — п/с 333, 220050, Менск; праз e-mail: exlibris@tut.by; праз Internet: http://exlibris.cjb.net, праз тэлефон: 8-029-643-57-33

Кнігі — поштай. Новае: «Дзеяслоў» №3-2003, Э.Суіндзвуд «Сьціслая гісторыя сацыялягічнай думкі», П.Урбан «Старажытныя ліцьвіны», С.Вальеха «Чорныя геральды», Запісы БІНіМ №26, Р.Барадулін «Лісты ў Хельсынкі»

Прадам кнігу «Краіна Беларусь» У.Арлова за 35 тыс. руб. Т.: 220-30-25

Куплю «Малы расейска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразэм» Санька, «Русско-белорусский фразеологический словарь» Кісялёва. Т.: 265-75-73 (13.00—22.00), 223-34-79 (10.00—16.00). Эдвард

Прадам кнігу-малюнак «Bitwa pod Raclawicami», прысьвечаную паўстаньню Т.Касьцюшкі (год выданьня 1894, Львоў, польская мова), 20 у.а. Т. (у Чэхіі): (8-10-4207) 28027653

Куплю энцыкляпэдычны даведнік «Беларускі Саюз мастакоў» 1998 г. Т.: 260-59-63 (раніцай і ўвечары)

Беларускія кнігі і часопісы, відэа і CD. Цяпер і ў Барысаве. Т.: (8-01777) 96-059

ПРАЦА

Гішпанская ды ангельская мовы. Рэпэтытарства, пераклады. Тэлефануйце ў любы час сутак! Т.: 8-029-758-16-95

Шаноўнае спадарства, масажыст прапануе свае паслугі. Т.: 8-029-756-81-99

КРЫЖАВАНКА



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 2. Усталяваны тарыф на аплату чаго-небудзь, а таксама парода сабак. **6.** Штаны, прыдуманыя французскім генэралам. **7.** Плянэта Сонечнай сыстэмы, названая ў гонар бога падземнага царства. **9.** «Тваіх вачэй пад ... сталі праменьне яснае люблю». **10.** Радзіма Мінатаўра. **11.** Назоўнік ад дзеяслова «гаціць». **12.** Псэўданім Кастуся Каліноўскага, які не ўратаваў яго ад арышту. **14.** Найменшая часьцінка рэчыва, што захоўвае яго хімічныя ўласьцівасьці. **16.** Таемнае месца, дзе ўкрываюць каго- ці што-небудзь. **19.** Яго яшчэ маглі называць «старцам», незалежна ад узросту. **20.** Вугорскі аўтобус. **23.** Да яе ніяк ня мог «дайсьці» Сямён Сямёнавіч Гарбункоў. **25.** Кветка сям'і кутровых, звычайная насельніца старых могілак; ва Ўкраіне гэтак завецца дзіцячы часопіс. **28.** Міністар замежных спраў Рэспублікі Беларусі ў 1996—98 г. **29.** Сатырычнае пасланьне смаленскаму ваяводу, які здаў горад расейцам, звалася «... да Абуховіча». **31.** Была Залатая, Нагайская, але беларусам найбольш бяды рабіла Крымская. **32.** Цяпер іх у Менску шэсьць — Даўгінаўскі, Ігуменскі, Лагойскі, Сморгаўскі, Старабарысаўскі і Старавіленскі. **33.** У гонар гэтай пісьменьніцы была пераназваная вуліца Мураўёўская ў Горадні. **34.** Асоба, якую пасылаюць з палітычным даручэньнем у іншую краіну. **35.** Настаўнік рыторыкі ў брацкіх школах Беларусі й Украіны ў XVI—XVII ст.

ПА ВЭРТЫКАЛІ: 1. Тур Хеердал пераплыў на ім Атлянтыку. **2.** Прадукцыя ААТ «Магатэкс». **3.** Іншая назва гарадзенскай Барысаглебскай царквы. **4.** У гутарковым маўленьні: якаясьці вопратка. **5.** Вялікая капа сена. **6.** Чалавекападобная малпа — заўзятая вэгетарыянка. **8.** Тое, чым розьняцца карáлі й каралі. **12.** Гульня ў адказы на пытаньні з розных галін ведаў. **13.** Гісторык, філёзаф і палітычны дзяяч, міністар замежных спраў і прэм'ер-міністар БНР. **14.** Першы друкаваны беларускі верш Купалы. **15.** Кампазытар, аўтар песень «Бывайце здаровы», «Не шукай». **17.** Імпэратар, актор у душы, меркаваны падпальшчык Рыму. **18.** У самалёце, караблі — «асобны пакой». **21.** Правіцель, што мае неабмежаваную ўладу. **22.** Водны шлях, бясьпечны для плаваньня суднаў. **24.** Час, калі «плачуць» ледзяшы. **26.** Горад-порт на расейскім Далёкім Усходзе, разьмешчаны на беразе аднайменнага заліву, у які ўпадае і рака з такой самай назвай. **27.** Тытул прынцаў каралеўскага дому ў Гішпаніі і Партугаліі. **30.** Дарожка на кампакт-дыску, а таксама месца для гонак. **31.** Выгук, якім адганяюць парсюка.

Склаў Сяргей Петрыкевіч

Адказы на крыжаванку, зьмешчаную ў №21

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5. «Сьвінапас». 8. Жэле. 9. Лола. 11. Нароўля. 14. Мантра. 16. Роспач. 18. Груца. 20. Вораг. 21. Нясун. 22. Аўра. 23. Далі. 24. Мэтол. 26. Балет. 27. Скіба. 28. Каратэ. 31. Асадка. 33. Мінэрал. 36. Колі. 37. Юзэр. 38. Дэмагогія.

ПА ВЭРТЫКАЛІ: 1. Зьмена. 2. Сівер. 3. Матыў. 4. Махляр. 6. Тэнт. 7. Улас. 10. Маномэтар. 12. Опус. 13. Навуменка. 15. Рэгаліт. 17. Омнібус. 18. Гарус. 19. Атава. 25. Бізэ. 29. Азон. 30. Эмінэм. 31. Алюзія. 32. Арэх. 34. Нерат. 35. Расол.

Менчукі!

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Найтаньнейшая падпіска на «НН» — у «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 1360 рублёў (2043 рублі — калі падпісвацца празь «Белпошту»). Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для Вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку». Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».

Участак падпіскі «Белсаюздруку»	
вул.Валадарскага, 16, пак.302	227-88-41
Пункты прыёму падпіскі:	
вул.Жукоўскага, 5, корп.1	224-32-03
пр.Скарыны, 113	264-22-91
вул.Раманаўская Слабада, 9	220-83-04
вул.Кашавога, 8	230-29-20
Крамы	
№1 вул.Жукоўскага, 5	224-03-76
№2 пр.Скарыны, 44	284-83-59
№3 пр.Скарыны, 76	232-46-23
№4 вул.Леніна, 15	227-11-92
№6 вул.Філімонава, 1	235-63-11
№7 вул.Коласа, 69	288-30-20
№8 вул.Сурганава, 40	232-45-10
№9 пр.Ракасоўскага, 140	247-30-15
№10 бульвар Шаўчэнкі, 7	233-74-88
№11 пр.Пушкіна, 77	255-80-71
№12 вул.Кіжаватава, 80	278-77-61
№13 вул.Каліноўскага, 82, корп.2	264-06-42
№14 вул.Валадарскага, 22	227-75-55
№15 вул.Танка, 16	223-82-39
№16 вул.Харужай, 24	234-27-25
№17 вул.Някрасава, 35	231-03-28
№18 мэтро «Плошча Перамогі»	284-31-06
№19 пр.Машэрава, 51, корп.1	223-81-66
№20 вул.Ясеніна, 16	271-87-21
№21 мэтро «Пушкінская»	255-57-20
№22 вул.Ілімская, 10, корп.2	243-16-83
№23 вул.Славінскага, 39	264-36-33
№24 вул.Жылуновіча, 31	245-05-74
№25 вул.Маркса, 21	227-08-52
Шапікі	
№2 Лінгвістычны ўнівэрсытэт, вул.Захарава, 21	
№18 Тэхналягічны ўнівэрсытэт, вул.Сьвярдлова, 13/4	
№18 Пэдагагічны ўнівэрсытэт, вул.Савецкая, 18	
№78 Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19	
№95 Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул.Мясьнікова, 39	
№136 мэтро «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня	
№187 Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15	
№18 Аўтавакзал «Маскоўскі»	
№198 Эканамічны ўнівэрсытэт, пр.Партызанскі, 26	
№209 Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2	
№228 Унівэрсытэт культуры, вул.Рабкораўская, 17	
№232 Менскі завод халадзільнікаў, пр.Машэрава	
№245 Больніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56	
№259 Менскі дзяржаўны гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183	
№260 пр.Скарыны, 169	
№262 Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31	
№298 пр.Машэрава, 75/1	
№302 9-я больніца, вул.Сямашкі, 8	
№313 Слабадзкі праезд, 24	

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

У ПЭН-Цэнтры

13 чэрвеня а 17-й у ПЭН-цэнтры (Казлова, 7-101) адбудзецца сустрэча з украінскім паэтам, празаікам і драматургам Аляксандрам Ірванцом, аўтарам раману «Роўна\Ровно» (урывак друкаваўся ў «НН» № 52—53 за 2001 г.), знакамітых постамадэрнісцкіх вершаў «Любіць Аклахому» і «Ода грыўні» («ARCHE»-ўкраінскі нумар), п'есы «Электрычка на Вялікдзень» («Дзеяслоў» №1), перакладчыкам на ўкраінскую твораў В.Быкава, У.Арлова. Удзел у су-стрэчы возьмуць Уладзімер Арлоў, Вера Бурлак, Віктар Жыбуль. А.Ірванец прадставіць свае новыя творы і пераклады. Уваход вольны.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«НН» дзякуе за падтрымку Ўладзімеру зь Менску, Адольфу Суботу зь Нью-Ёрку.

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
выпускны рэдактар	Сяргей Ёрш
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3509.

Нумар падпісаны ў друк 11.06.2003.

Замова № 3015.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а